Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

21 КРАСАВІКА 2009 г.
АЎТОРАК
№ 74
(26432)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

АТЭРАСКЛЕРОЗ САСУДАЎ РУК, НОГ І ГАЛАВЫ

Аб дыягностыцы атэрасклератычных паражэнняў артэрый, лячэнні гангрэнаў з захаваннем канечнасцяў, прафілактыцы інсультаў можна даведацца ад **загадчыка аддзялення сасудзістай хірургіі Мінскай абласной клінічнай бальніцы Паўла Паўлавіча АЎДЗЕЯ.**

«Прамая лінія» з яго ўдзелам адбудзецца **24 красавіка, у пятніцу, з 15.00 да 16.00 па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.** *Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).*

Курс беларускага рубля да кошыка замежных валют у II квартале будзе вагацца ў межах плюс/мінус 1 працэнт

Аб гэтым далажыў учора Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч.

Аляксандру Лукашэнку было даложана аб выкананні Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у студзені—сакавіку 2009 года і аб рабоце банкаўскай сістэмы па іх выкананні па выніках года. Прэзідэнт быў праінфармаваны аб тым, што ў цэлым усе асноўныя паказчыкі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2009 год выконваюцца ў поўным аб'ёме. Пры гэтым асаблівая ўвага Нацыянальным банкам удзяляецца паказчыкам, дасягненне якіх неабходна для рэальнага сектара эканомікі: крэдытаванне, работа плацежнай сістэмы і стабільны курс нацыянальнай валюты.

Так, за апошнія 12 месяцаў (з 1 красавіка 2008 года па 1 красавіка 2009 года) аб'ём выдадзеных банкамі крэдытаў павялічыўся на 60 працэнтаў. Курс беларускага рубля да кошыка замежных валют утрымліваецца ў межах 5-працэнтнага калідора ваганняў, што дапускаюцца на 2009 год. З 2009 года Нацбанк пачаў ажыццяўляць прывязку беларускага рубля да кошыка з трох валют — долара ЗША, еўра, расійскага рубля. Курс беларускага рубля да кошыка валют склаў Br960 на 1 красавіка, як і на 2 студзеня. Унутры гэтага кошыка на працягу першага квартала адбываліся ваганні валют. Так, з пачатку года долар умацоўваўся да еўра да 12 працэнтаў у асобныя перыяды часу, да расійскага рубля — да 21 працэнта.

Высокімі тэмпамі ў справаздачным перыядзе развівалася плацежная сістэма. За студзень—сакавік праведзена плацяжоў на суму больш як Br233 трлн, што ў 1,72 раза больш, чым у першым квартале 2008 года. Гэта сведчыць аб высокай актыўнасці работы беларускіх прадпрыемстваў. Старшыня праўлення Нацбанка запэўніў кіраўніка дзяржавы, што і ў другім квартале ўсе асноўныя паказчыкі грашова-крэдытнай палітыкі будуць выконвацца. Такімі ж высокімі тэмпамі будзе ісці крэдытаванне рэальнага сектара эканомікі і насельніцтва, будзе забяспечвацца стабільны курс нацыянальнай валюты. «Мы плануем, што ў другім квартале калідор вагання курсу беларускага рубля да кошыка замежных валют будзе ўтрымлівацца ў межах плюс/мінус 1 працэнт», — сказаў Пётр Пракаповіч.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Чарговае пасяджэнне Грамадска-кансультатыўнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі пройдзе 24 красавіка

Аб гэтым паведаміў сакратар савета Уладзімір Шпакоўскі.

У адпаведнасці з прынятым на першым пасяджэнні савета рашэннем, чарговае пасяджэнне будзе прысвечана тэме «Выпрацоўка новых падыходаў у рэалізацыі стратэгіі эканамічнага развіцця краіны, у тым ліку ў перыяд сусветнага фінансавага крызісу».

Грамадска-кансультатыўны савет створаны ў студзені 2009 года, яго першае пасяджэнне адбылося 6 лютага. Асноўная мэта — абмеркаванне актуальных пытанняў развіцця дзяржавы і грамадства, выпрацоўка прапаноў па больш актыўным уключэнні Беларусі ў агульнасусветныя працэсы, удасканаленні напрамкаў сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краіны. У склад савета ўвайшлі прадстаўнікі розных грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый, іншых грамадска-палітычных арганізацый Беларусі. Старшыня савета — кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Макей.

БЕЛТА.

Парламенцкі дзённік

Партнёрства ў Персідскім заліве

З візітам у Беларусі зараз знаходзіцца дэлегацыя Бахрэйна на чале са старшынёй Палаты прадстаўнікоў каралеўства Халіфой бен Ахмедам аль-Дахрані. Учора быў падпісаны пратакол аб супрацоўніцтве паміж ніжнімі палатамі парламентаў дзвюх краін. Уладзімір Андрэйчанка, кіраўнік Палаты прадстаўнікоў Беларусі, у гутарцы з журналістамі адзначыў, што рэалізацыя пратакола пасадзейнічае не толькі развіццю парламенцкіх сувязяў, але і ўмацаванню дзяржаўных кантактаў у цэлым, актывізацыі супрацоўніцтва ў сферы гандлю, турызму, адукацыі.

Падчас сустрэчы ў верхняй палаце парламента спікер Барыс Батура выразіў спадзяванне, што гэты візіт паслужыць умацаванню сувязяў паміж заканадаўцамі Беларусі і Бахрэйна. А такое трывалае супрацоўніцтва ў сваю чаргу паўплывае на развіццё эканамічных сувязяў. «У цяперашні час для нас вельмі важнае развіццё эканамічных сувязяў паміж нашымі дзяржавамі, улічваючы, што Бахрэйн з'яўляецца фінансавым цэнтрам дзяржаў Персідскага заліва», — падкрэсліў старшыня Савета Рэспублікі.

Халіфа бен Ахмед аль-Дахрані заўважыў, што Беларусь — дзяржава вельмі развітая ў прамысловым і аграрным сектарах, у той час як Бахрэйн — буйны фінансавы цэнтр. «Усё гэта можа садзейнічаць развіццю гандлёва-эканамічных адносінаў», — адзначыў госць. Кіраўнік бахрэйнскай дэлегацыі таксама запэўніў спікера, што ў самы блізкі час, літаральна на працягу тыдня, будзе прынятае прынцыповае рашэнне кіраўніцтва Бахрэйна аб прызначэнні спецыяльнага прадстаўніка краіны ў Беларусі.

Ала МАЧАЛАВА.

У Мінску плацяць больш,

паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Так, намінальная налічаная сярэдняя зарплата работнікаў Мінска ў лютым была роўная Br1 млн 231,9 тыс. — гэта 135,9 % да сярэднерэспубліканскага ўзроўню аплаты працы. А самую нізкую зарплату ў лютым атрымалі ў Магілёўскай вобласці (у сярэднім — Br786 тыс.).

У цэлым па рэспубліцы сярэдняя заработная плата ў лютым да студзеня 2009 года знізілася на 2,7 %. Толькі ў Гомельскай вобласці за люты гэтага года заробак павысіўся (на 0,7 %).

Намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў студзені—лютым гэтага года склала Br912,2 тыс., у тым ліку ў лютым Br906,2 тыс. — на 1,5 % (на Br13,5 тыс.) менш у параўнанні са студзенем 2009 года. Рэальная налічаная заработная плата (разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэнаў на тавары і паслугі) у лютым гэтага года ўзрасла на 2,7 % да лютага 2008 года, але ў параўнанні са студзенем гэтага года гэты паказчык зменшыўся на 2,7 %. На прамысловых прадпрыемствах сярэдняя заработная плата ў лютым гэтага года склала Br1 млн 6,1 тыс. — гэта на 11 % вышэй за сярэднерэспубліканскі ўзровень аплаты працы. Сярэдняя заработная плата ў галінах бюджэтнай сферы ў лютым склала Br729,8 тыс. — у параўнанні з лютым 2008 года гэты паказчык павялічыўся на 13,6 %, а рэальная налічаная заработная плата зменшылася на 1,8 %.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЛЕПЕЛЬСКІ «ІНТЭР» АТАКУЕ!

Пасля трэцяга туру чэмпіяната Беларусі па футболе лідарам стаў чэмпіён, барысаўскі БАТЭ, які дома абыграў «Смаргонь» з лікам 2:0. Вынікі астатніх матчаў: «Дынама» (Мінск)—«Дынама» (Брэст) — 2:0, «Граніт»—«Гомель» — 0:2, «Віцебск»—«Днепр» — 0:1, «Нафтан»—«Тарпеда» — 1:0, «Шахцёр»—МТЗ-РІПА — 1:0, «Нёман»—«Мінск» — 2:1.

Казімір ФАРЫНО: Аўтарытэтна

«ЛЮБЫЯ ПАДНАШЭННІ ПРЫНІЖАЮЦЬ САМОГА НАСТАЎНІКА»

Днямі ў інтэрнэце з'явілася інфармацыя, што ў Барысаве вучням выпускных класаў забаранілі збіраць грошы на кветкі і падарункі для настаўнікаў.

На бацькоўскіх сходах дырэктары школ і класныя кіраўнікі афіцыйна папярэджваюць аб тым, што кветкі, цукеркі і напоі на сталах у членаў экзаменацыйнай камісіі ў гэтым годзе адмяняюцца. Пракаментаваць гэту сітуацыю «Звязда» папрасіла **намесніка міністра адукацыі нашай краіны Казіміра ФАРЫНО.**

— Я ўжо неаднаразова казаў, што Міністэрства адукацыі лічыць недапушчальнай практыку збору грашовых сродкаў на правядзенне экзаменацыйнай кампаніі, — падкрэсліў Казімір Фарына. — На ўсе скаргі грамадзянаў на паборы і падарункі, якія, на жаль, дзе-нідзе яшчэ практыкуюцца ў нашых школах, міністэрства адукацыі заўсёды рэагавала і будзе рэагаваць вельмі жорстка. Тым больш недапушчальнае «спонсарства» бацькоў, калі размова ідзе пра арганізацыю працэсу выніковай атэстацыі. Кава, тарты, цукеркі на сталах у экзаменатараў прысутнічаць ні ў якім разе не павінны. А каб педагогі не апынуліся ў няёмкім становішчы, бацькі вучняў павінны быць папярэджаны аб гэтым загадзя. Адна справа — некалькі гваздзікоў для стварэння святочнай і ўрачыстай атмасферы ў экзаменацыйнай аўдыторыі, і зусім іншая — калі кожнаму экзаменатару ўсім класам збіраюць грошы на шыкоўны букет. Не трэба насіць экзаменатарам кветкі бярэмамі! Няхай бацькі лепш патрацяць гэтыя грошы на сваіх дзяцей. Тым больш недапушчальныя рознага кшталту падарункі. Я глыбока перакананы, што любыя паднашэнні прыніжаюць, у першую чаргу, самога настаўніка. І калі дырэктар школы закрывае вочы на падобнае становішча спраў, значыць, і яго дзейнасць, і дзейнасць педагогаў, якія лічаць гэта нормай, несумяшчальныя з маральна-этычнымі прынцыпамі людзей, якім можна даверыць выхаванне маладога пакалення. Хачу падкрэсліць, што маральна-псіхалагічная атмасфера ў педагагічным калектыве залежыць, у першую чаргу, ад яго кіраўніка. І ён нясе персанальную адказнасць за стварэнне псіхалагічнага камфорту падчас правядзення выпускной кампаніі для ўсіх: як для вучняў і іх бацькоў, так і для настаўнікаў. Калі ў гэтым ёсць неабходнасць, трэба правесці сярод бацькоў папярэднюю тлумачальную работу. А калі ўсё ж такі бацькі будуць спрабаваць аддзякаваць нейкаму настаўніку, педагогу трэба ў карэктнай форме ад падарунка адмовіцца. Гэта будзе правільна, толькі так можна адстаяць гонар свайго «мундзіра»...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Да ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

23 красавіка 2009 г. у 16.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу другая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

ОРГАНИЗАЦИЯ РЕАЛИЗУЕТ
НЕФТЕПРОДУКТЫ
Дт, Н-80, Аи-92.
Возможна доставка по РБ.
Тел.: 219 71 75,
8 029 639 69 93, 8 029 6821 821.
Лицензия № 09100/0248236
от 03.10.2006 г.УНП 190664272

РОЗГАЛАС — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ

ТЫДЗЕНЬ ХАЛОДНАГА НАДВОР'Я

На гэтым тыдні надвор'е ў краіне будзе вызначацца зонай павышанага ціску пад уплывам халодных паветраных мас арктычнага паходжання, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава.

Ападкаў не прадбачыцца, толькі ў пятніцу ў асобных раёнах чакаецца невялікі дождж. Тэмпература ўначы панізіцца да 0—6 марозу. Тэмпература паветра ўдзень 5—13 цяпла, па паўднёвым захадзе ў асобныя дні да плюс 14—15 градусаў. У апошнія дні тыдня стане крыху цяплей. Аднак уначы тэмпература будзе трымацца ў межах ад мінус 3 да плюс 5 градусаў. Удзень у суботу сонейка прагрэе паветра да 10—15, а па паўднёвым захадзе нават да 18...

Сяргей КУРКАЧ.

З ПІСТАЛЕТАМ — ПА ШАМПАНСКАЕ

Дзве бутэлькі шампанскага сталі здабычай двух студэнтаў-рабаўнікоў, якія здабылі яго пад пагрозай прымянення пнеўматычнага пісталета.

Адбылося гэтае здарэнне ў Мінску на праспекце Ракасоўскага на пачатку трэцяй ночы, дзе ахвярай невядомых стала 34-гадовая сталічная жыхарка. Пацярпелая праз тры хвіліны пасля ўчыненага злачынства звярнулася па дапамогу да нарада 2-й роты палка ППСМ ГУУС, якія па прыметах ля дома па вуліцы Пляханава затрымалі студэнтаў 23 і 18 гадоў адной з навучальных устаноў. Гора-рабаўнікі змешчаныя ў ізалятар часовага ўтрымання, пісталет у іх канфіскаваны.

Ігар ГРЫШЫН.

«ГАРАЧАЯ» ЛІНІЯ ПА ІМУНАПРАФІЛАКТЫЦЫ

Чаму прышчэпкі супраць віруснага гепатыту В робяць немаўлятам адразу пасля іх нараджэння? Ці не шкодна прышчэпліваць дзіця адразу ад двух-трох інфекцый? Дзе можна зрабіць прышчэпку супраць вірусу папіломы чалавека? Якія прышчэпкі з'яўляюцца абавязковымі і ці патрэбная згода бацькоў на правядзенне прышчэпак іх дзецям? Адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні, якія датычацца прафілактычных прышчэпак, можна будзе атрымаць на «гарачай» лініі, якую ў рамках правядзення Еўрапейскага тыдня імунізацыі арганізуе **22 красавіка** Мінскі гарадскі цэнтр гігіены і эпідэміялогіі. Кансультаваць грамадзян па пытаннях імунапрафілактыкі будуць загадчык аддзялення імунапрафілактыкі МГЦГЭ Ірына Мікалаеўна Глінская і ўрач-эпідэміёлаг аддзялення імунапрафілактыкі Людміла Альбертаўна ВАЛАСАР. **Тэлефон «гарачай» лініі (017) 292 40 25.**

Надзея НІКАЛАЕВА.

МЕТАЛ ЗАТРЫМАЛІ НА ПАМЕЖЖЫ

17 красавіка на беларуска-расійскім памежжы міліцыя затрымала «Мерседэс-Бэнц», у якім было 20 тон лому каляровых металаў.

Супрацоўнікі Клімавіцкага РАУС спынілі аўтамабіль з расійскімі нумарамі на аўтадарозе, якая вядзе да мяжы. Каштоўны груз знаходзіўся ў прычэпе. За рулём «Мерседэса» быў 35-гадовы жыхар Любані: ён не паказаў належных дакументаў на метал.

Алена КАЗЛОВА.

МАЛАДЫЯ, ХУТКІЯ, ДУРНЫЯ...

Два злачынствы за паўгадзіны ўчынілі два няпоўнагадовыя браты з Гродна. Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Першай здабычай падлеткаў стаў «Опель Кадэт»: патрыманую іншамарку хлопцам удалося адчыніць і завесці. Аднак паездка была нядоўгай, бо машына сапсавалася і яе давялося пакінуць. Тут іх і заўважылі пільныя грамадзяне, якія патэлефанавалі ў міліцыю. Тым часам браты на іншай вуліцы ўскрылі «Аўдзі-100», але завесці яе ім не ўдалося. Выкраўшы з салона акустычныя дынамікі, падлеткі пайшлі, але ў хуткім часе іх затрымалі супрацоўнікі «Аховы». У дачыненні да братоў узбуджаны дзве крымінальныя справы па артыкулах «Крадзеж» і «Выкраданне аўтамабіля».

СТРАВИТА
РЕСПУБЛИКАНСКОЕ ДОЧЕРНЕЕ УНИТАРНОЕ СТРАХОВОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ

ГОДОВОЙ БАЛАНС за 2008 год
республиканского дочернего унитарного страхового предприятия «СТРАВИТА»

220037, г. Минск, пер. Козлова, 7. Тел./факс: (8 017) 245 16 99. УНП 806000046

тыс. руб.

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	7 891 095,7	**Источники собственных средств – всего,** в том числе:	5 733 968,8
Нематериальные активы	132 813,6	уставный фонд	3 156 740,8
Финансовые вложения – всего, в том числе:	26 851 910,5	резервный фонд	56 859,8
инвестиции в дочерние общества	—	добавочный фонд	2 312 602,7
инвестиции в другие организации	7 308,0	фонд накопления	—
облигации и другие долговые обязательства	26 844 602,5	фонд потребления	—
прочие финансовые вложения	—	целевое финансирование	—
Доля перестраховщиков в страховых резервах	—	нераспределенная прибыль прошлых лет	—
Дебиторы – всего, в том числе:	185 196,4	нераспределенная прибыль отчетного года	207 765,5
дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	5 285,4	**Страховые резервы и фонды – всего,** в том числе:	77 681 637,0
депо премий по рискам, принятым в перестрахование	—	страховые резервы	77 640 580,4
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	179 911,0	фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	4 733,0
Прочие активы – всего, в том числе:	54 448 976,3	гарантийные фонды	36 323,6
незавершенное строительство	—	**Кредиторы – всего,** в том числе:	5 809 191,9
материальные ценности и затраты	572 085,1	кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	4 182,2
денежные средства	53 876 891,2	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	—
собственные акции (доли)	—	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	—
Прочие активы	60 000,0	заемные средства	—
Непокрытые убытки прошлых лет	—	кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	5 805 009,7
Непокрытые убытки отчетного года	—	**Прочие пассивы**	345 194,8
БАЛАНС	**89 569 992,5**	**БАЛАНС**	89 569 992,5

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ
республиканского дочернего унитарного страхового предприятия «СТРАВИТА» за 2008 год

тыс. руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
1. Страхование жизни.		
Страховые взносы (премии)	010	32 286 620,7
Страховые выплаты	020	3 811 047,1
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	- 28 755 160,3
Отчисления в фонд предупредительных мероприятий и гарантийный фонд	040	356 112,7
Расходы на ведение дела	041	3 859 172,4
Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)	050	- 4 494 871,8
II. Страхование иное, чем страхование жизни.		
Страховые взносы (премии) – нетто перестрахование	064	—
Изменение резерва незаработанной премии – нетто перестрахование (+ или-)	067	—
Оплаченные убытки (страховые выплаты) – нетто перестрахование	082	—
Изменение резервов убытков – нетто перестрахование (+ или -)	092	—
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	—
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	—
Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	—
Расходы на ведение дела	120	—
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	—
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	—
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	—
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II		
Операционные доходы	140	7 306 780,1
Операционные расходы	145	18 481,2
Внереализационные доходы	150	79 670,5
Внереализационные расходы	155	637 693,7
Финансовый результат	157	2 235 403,9
Использовано прибыли	158	2 027 638,4
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	207 765,5

Директор О.А. Корота

Главный бухгалтер В.И. Довнар

Достоверность годового баланса и отчета о финансовых результатах РДУСП «Стравита» за 2008 год подтверждена заключением аудиторской организации ОДО «Промаудит» (специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0495307 от 19.12.2008 г. выдана Министерством финансов Республики Беларусь со сроком действия по 02.02.2014 г.).

Заключение аудиторской организации ОДО «Промаудит»:

«...По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность РДУСП «Стравита», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно отражает во всех существенных аспектах финансовое положение РДУСП «Стравита» на 1 января 2009 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2008 год. При этом финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству».

23.02.2009 г.

Директор ОДО «Промаудит» А.В. Анисович

Аудитор, возглавлявший аудит И.А. Бич

36,6°

З'ЕЎ — ПАМАЛАДЗЕЎ!

Чаму спецыялісты настойваюць на абавязковай разнастайнасці рацыёну? Таму што розныя прадукты ўтрымліваюць розныя патрэбныя нам, карысныя рэчывы. Аднастайнае меню — крок да праблем са здароўем.

Акрамя таго, паводле кітайскай традыцыйнай медыцыны, для розных людзей карыснымі і бясшкоднымі для фігуры з'яўляюцца розныя прадукты. Скажам, для некага лішак макароны нават у невялікай колькасці можа істотна «падарваць форму», а некаму... чым болей, тым лепш. Разам з тым, **пастаянныя даследаванні харчовых прадуктаў вымушаюць спецыялістаў прыходзіць да высновы аб існаванні сярод іх самых-самых карысных, спрыяльных для «вечнай маладосці». На сёння залаты спіс выглядае прыкладна так:**

- **ЯБЛЫКІ, АПЕЛЬСІНЫ, ВІНАГРАД**
- **УСЕ ВІДЫ КАПУСТЫ, ПАМІДОРЫ, ЦЫБУЛЯ, ЧАСНОК**
- **ЯГАДЫ**
- **ХЛЕБ З ВОТРУБ'ЕМ**
- **ЧАЙ (ЧОРНЫ, ЗЯЛЁНЫ, МАТЭ)**
- **ЧОРНЫ ШАКАЛАД**
- **РЫБА І МОРАПРАДУКТЫ**
- **АЛЕІ**

Па вялікім рахунку, большасць з пералічанага ў першую чаргу з'яўляецца цудоўным антыаксідантам, іншымі словамі, дапамагае арганізму супрацьстаяць асноўным ворагам доўгага, здаровага жыцця — сардэчна-сасудзістым і анкалагічным захворванням.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЛІТОЎСКІХ ВАЙСКОЎЦАЎ ПАПРАСІЛІ СЫСЦІ Ў АДПАЧЫНАК ЗА СВОЙ КОШТ

Міністэрства абароны Літвы звярнулася да вайскоўцаў-кантрактнікаў і да іншых працаўнікоў абароннай сферы з просьбай на тыдзень сысці ў адпачынак за свой кошт. Сыход у такі водпуск будзе добраахвотным. Такім чынам літоўскае міністэрства абароны збіраецца эканоміць сродкі. Прапанова ведамства будзе дзейнічаць да канца года. Па меркаванні чыноўнікаў, гэтая ініцыятыва дазволіць пазбегнуць звальненняў вайскоўцаў.

У сувязі з сусветным фінансавым крызісам урад Літвы вырашыў у 2009 годзе скараціць выдаткі бюджэту на 3,4 мільярда літаў (прыкладна 979 мільёнаў еўра). У прыватнасці, на 43,5 мільёна еўра зрэзаныя выдаткі Мінабароны. Выдаткі на зарплаты міністэрства павінна скараціць на 25 мільёнаў літаў (больш за 7 мільёнаў еўра). Выдаткі Літвы на абарону складаюць прыкладна 1,2 % ад валавога ўнутранага прадукта. Гэта адзін з самых нізкіх паказчыкаў сярод краін НАТО.

КОЛЬКАСЦЬ БЕСПРАЦОЎНЫХ У РАСІІ ПЕРАВЫСІЛА 7 МІЛЬЁНАЎ ЧАЛАВЕК

Агульная колькасць жыхароў Расіі, якія засталіся без працы, па выніках першага квартала 2009 года склала 7,107 мільёна чалавек. Аб гэтым гаворыцца ў афіцыйных матэрыялах Федэральнай службы дзяржаўнай статыстыкі. Узровень беспрацоўя ў першым квартале 2009 года дасягнуў 9,5 працэнта.

У ЖЭНЕВЕ СА СКАНДАЛАМ АДКРЫЛАСЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ААН ПА БАРАЦЬБЕ З РАСІЗМАМ

Міжнародная канферэнцыя ААН па супрацьдзеянні расізму, расавай дыскрымінацыі, ксенафобіі і звязанай з імі нецярпімасці адкрылася ў панядзелак у жэнеўскім Палацы Нацый на фоне палітычнага скандалу.

Абурэнне грамадскасці выклікаў прыезд на канферэнцыю прэзідэнта Ірана Махмуда Ахмадзі Нежада, вядомага сваімі рэзкімі антыізраільскімі выказваннямі.

Шэраг еўрапейскіх краін адмовіліся ад прысутнасці на канферэнцыі альбо знізілі ўзровень свайго ўдзелу ў ёй. У прыватнасці, літаральна напярэдадні адкрыцця форуму аб нежаданні ўдзельнічаць у ім заявілі Германія і Нідэрланды, а Францыя папярэдзіла, што яе прадстаўнік, а таксама прадстаўнікі іншых дзяржаў Еўрасаюза пакінуць залу пасяджэнняў, калі прэзідэнт Ірана дазволіць сабе якія-небудзь выпады ў адрас Ізраіля (урэшце, так і было). Раней канферэнцыю афіцыйна байкатавалі ЗША, Аўстралія, Італія і Канада, якія таксама асцерагаюцца, што яна «можа стаць пляцоўкай для антысеміцкіх выступаў і спробаў аказаць ціск на рашэнне міжканфесійных і рэгіянальных канфліктаў».

Вялікабрытанія вырашыла не байкатаваць канферэнцыю, аднак Лондан будзе прадстаўлены на форуме толькі паслом пры еўрапейскай штаб-кватэры арганізацыі сусветнай супольнасці.

Варта адзначыць, што сам Ізраіль таксама байкатаваў канферэнцыю. Яшчэ падчас папярэдняга форуму, які адбыўся ў 2001 годзе ў Дурбане, прадстаўнікі Тэль-Авіва і Вашынгтона пакінулі пасяджэнні з-за таго, што некаторыя ўдзельнікі прапаноўвалі ахарактарызаваць дзеянні Ізраіля на акупаваных ім палесцінскіх тэрыторыях як праяву расісцкай палітыкі.

Распіццё піва ў грамадскіх месцах у Беларусі плануецца забараніць

Аб гэтым паведаміў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве і судова-прававых пытаннях Мікалай САМАСЕЙКА.

Такая норма змяшчаецца ў папраўках у некаторыя кодэксы Беларусі па пытаннях крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці, якія былі ўнесены ў парламент Прэзідэнтам краіны. Паводле слоў Мікалая Самасейкі, гэты законапраект дэпутаты маюць намер прыняць у першым чытанні на бягучай вясенняй сесіі.

Згодна з папраўкамі, у Кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэннях будзе прапісана адказнасць за продаж алкагольных, слабаалкагольных напіткаў або піва няпоўнагадовым, гандаль названымі напіткамі ў неўстаноўлены час або неўстаноўленых месцах.

БЕЛТА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.04.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 843,00
▼ 1 еўра	3 698,46
1 латвійскі лат	5 206,48
1 літоўскі літ	1 069,34
1 чэшская крона	136,80
1 польскі злоты	847,46
▲ 1 расійскі рубель	84,77
1 украінская грыўня	349,69

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	33,5371
10 UAH	41,5063
1000 BYR	11,8338
EUR	43,5613

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

РОСТ ЗАПАСАЎ НА СКЛАДАХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ — НЕДАПУШЧАЛЬНЫ

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 18 красавіка.)

Беларускія прадпрыемствы павінны максімальна выкарыстаць усе магчымасці па прасоўванні сваёй прадукцыі на заходнія рынкі, у тым ліку займаць нішы, адкуль пад ціскам крызісу сышлі іншыя вытворцы. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў у час справаздачы ўрада і Нацыянальнага банка аб сацыяльна-эканамічным развіцці краіны ў першым квартале 2009 года.

Прэзідэнт парушыў план справаздачы і нечакана для яе ўдзельнікаў (усяго ў зале сабралася каля 120 чыноўнікаў, кіраўнікоў буйных арганізацый, банкіраў) прапанаваў спачатку выступіць дырэктарам прамысловых прадпрыемстваў і губернатарам. Кіраўнік дзяржавы заслухаў выступленні кіраўнікоў Мінскага маторнага завода, МАЗа, БелАЗа, «Гомсельмаша», «Атланта». Прэзідэнту было даложана аб тым, як гэтыя арганізацыі працуюць у існуючых умовах сусветнага фінансавага крызісу, якія меры прымаюць для таго, каб забяспечыць рэнтабельную работу. Было адзначана, што шэраг прадпрыемстваў некалькі скараціў аб'ёмы вытворчасці ў параўнанні з мінулым годам, што звязана з падзеннем спажывецкага попыту на прадукцыю за мяжой, зменшылася рэнтабельнасць арганізацый, скараціўся экспарт.

«Нядобра, што сёння ў нас «правалілася» прамысловасць. Вёска расце, а прамысловасць «правалілася». Гэта недапушчальна», — сказаў Прэзідэнт. Нагадаем, тэмп росту ВУП у Беларусі ў першым квартале 2009 года склаў 101,1 працэнта да ўзроўню першага квартала 2008 года.

«У красавіку працаваць стратна — гэта злачынства. З 1 красавіка работу на страту ніхто цярпець не будзе. Час на тое, каб выйсці на бясстратную работу, быў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка і даручыў Камітэту дзяржкантролю праверыць работу кожнага стратнага прадпрыемства.

Неабходна імкнуцца да таго, каб выйсці на дадатную рэнтабельнасць продажаў тавараў на экспарт. Сёння нярэдкія выпадкі, калі прадпрыемствы імкнуцца ўтрымаць прысутнасць на рынках іншых краін любой цаной, у тым ліку і прадаючы прадукцыю па цэнах, ніжэйшых за сабекошт. Гэта можа быць апраўдана толькі ў адным выпадку: калі прадпрыемства ў цэлым працуе з дадатнай рэнтабельнасцю, а на гэтым таварным рынку ёсць абсалютна зразумелая перспектыва хуткага росту цэнаў.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што ў мэтах нарошчвання экспартных паставак ва ўмовах крызісу прадпрыемствы павінны ўмець хутка пераарыентавацца на гібкія ўмовы продажаў, напрыклад, прадаваць тавар больш дробнымі партыямі. Тут ключавую ролю павінны адыграць кіраўнікі прадпрыемстваў.

Прэзідэнт рашуча запатрабаваў выключыць выпадкі «перасаджвання» чыноўнікаў, якія не справіліся з заданнямі, з адной кіруючай пасады на аналагічную другую. Звяртаючыся да чыноўнікаў, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Яшчэ раз будзе прапанова аб перасаджванні з месца на месца кіраўнікоў, якія правалілі работу, пойдзеце разам з імі месці вуліцу. Гэта прынцыпова. Ніякіх перамяшчэнняў. Гэта галоўны прынцып кадравай палітыкі».

Было адзначана, што ўрад у першую чаргу павінен прыняць меры па забеспячэнні больш эфектыўнай работы арганізацый рэспубліканскай формы ўласнасці, таму што ў перыяд крызісу яны аказаліся ў больш цяжкім становішчы, чым арганізацыі камунальнай формы ўласнасці. Сёння паказчыкі апошніх прыкмета адрозніваюцца ў лепшы бок.

У цэлым, паводле слоў прэм'-ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага, першы квартал 2009 года аказаўся складаным для краіны. «Мы паставілі задачу звярнуць увагу на прамысловасць. Прамысловасць паступова, але ўпэўнена прыбаўляе з месяца ў месяц, хоць мы разлічвалі на лепшыя вынікі. Мы чакалі ажыўлення знешніх рынкаў, але, на жаль, гэтага пакуль не адбываецца і даводзіцца працаваць у тых умовах, у якіх мы цяпер знаходзімся», — адзначыў ён. У якасці станоўчай работы прамыслоўца сектара краіны прэм'ер-міністр назваў тое, што ўся прамысловая прадукцыя, выраблёная ў сакавіку, была прададзена. Пры гэтым урад лічыць неабходным аказаць крэдытную падтрымку МАЗу і БелАЗу ў аб'ёме Br550 млрд.

У другім квартале ўрад прагназуе нарошчванне тэмпу росту ВУП.

Гаворачы аб цэнавай палітыцы, Сяргей Сідорскі адзначыў, што ўрад па выніках года плануе выйсці на верхнюю прагнозную мяжу па інфляцыі — 11 працэнтаў. «У сакавіку яна склала 0,6 працэнта. У нас ёсць падставы чакаць, што ў далейшым штомесячны ўзровень інфляцыі будзе знаходзіцца ў межах 0,5 працэнта», — сказаў ён.

На нарадзе таксама была закранута тэма будаўніцтва жылля ў рэспубліцы. У першым квартале гэтага года ў Беларусі было пабудавана 1,3 млн кв.м жылля. На думку старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пятра Пракаповіча, у Беларусі неабходна павялічыць устаноўленае на 2009 год заданне па ўводзе жылля ў эксплуатацыю (6 млн кв.м па плану). Бо жыллёвае будаўніцтва можа «пацягнуць» за сабой і іншыя галіны гаспадаркі. Прэзідэнт даручыў кіраўніку Нацбанка з зацікаўленымі на працягу красавіка прапрацаваць гэта пытанне і далажыць. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што да канца 2009 года будаўніцтва жылля павінна ажыццяўляцца па еўрапейскіх стандартах.

У заключным слове Прэзідэнт адзначыў, што не зусім задаволены вынікамі нарады. «Для мяне было важным зразумець, што адбываецца ў эканоміцы, адчуць існуючыя тэндэнцыі. Шчыра кажучы, я не адчуў гэтага ў поўнай меры, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Склалася ўражанне, што кожны спрабуе неяк апраўдацца, штосьці прыхарашыць, сапхнуць адказнасць на іншага і гэтак далей». «Я ў гэтай сітуацыі больш схільны арыентавацца на меркаванне кіраўнікоў прадпрыемстваў».

Пры гэтым Прэзідэнт папярэдзіў, што «калі па выніках першага паўгоддзя не будзе выканана тое, што абяцае ўрад, — наракайце самі на сябе, разборкі будуць жалезныя».

Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што Беларусь цалкам можа мець нармальныя экспартныя паказчыкі, нягледзячы на сусветны крызіс. «Няпраўда, што нельга прадаць нашу прадукцыю. Можна — але яе трэба прадаваць не мільярдамі або сотнямі мільёнаў долараў, а, можа, дзесьці па чайнай лыжцы. Гэта асабліва датычыцца сённяшняга перапрацоўкі і прамысловасці ў цэлым... Што датычыцца будаўніцтва, аховы здароўя і сельскай гаспадаркі — там трэба абавязкова канцэнтраваць сродкі і дзейнічаць».

«Будаўніцтва — лакаматыў любой эканомікі. Давайце будзем будаваць. Таму што памяшканне, якое вы пабудуеце, мае патрэбу ва ўсім тым, што вырабляе наша эканоміка. І гэта карысць для нашай краіны, нашых людзей. Гэтак жа добра, што сельская гаспадарка ў нас не проста трымаецца на плаву, але і дэманструе аптымізм».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што расходы на ахову здароўя не будуць скарачацца. Наадварот, мэтазгодным было б накіраваць дадатковыя сродкі на развіццё анкалагічнай і транспланталагічнай медыцыны Беларусі, каб не толькі абнаўляць абсталяванне ў гэтых сферах, але і прыўнесці новыя тэхналогіі. Беларусы дабіліся значных поспехаў у транспланталогіі, і цяпер не трэба баяцца паставіць не менш амбіцыйныя задачы і ў анкалагічнай практыцы.

Гаворачы аб кадравым пытанні, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Ніякіх карных мераў адносна міністраў я не збіраюся прымаць. Замест гэтага будзе спакойная планавая замена тых людзей, якія выбіліся з каляіны і проста не могуць далей працаваць». Разам з тым Прэзідэнт дадаў, што па выніках першага паўгоддзя 2009 года «ўсе рашэнні будуць прыняты вельмі радыкальна, калі мы не выйдзем на тое, што самі запланавалі». «А мы запланавалі спакойную дынаміку і рост ВУП прыкладна да 6 працэнтаў».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гадавыя параметры па асноўных паказчыках сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны таксама не зменены. «Гэта тая высокая планка, да якой мы ўсе павінны імкнуцца. І мы будзем прынцыпова разбірацца з кожным, хто не выйдзе на гэтыя параметры... І яшчэ падкрэслю: нельга забываць аб эканоміі. Кожны рубель трэба дзесяць разоў у руках пракруціць, перш чым аддаць каму-небудзь».

Падводзячы вынікі, кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Сітуацыя ў эканоміцы складаная, вельмі складаная — таму што яна і ў свеце такая. Сёння ніхто, акрамя Барака Абамы, не сказаў, што ў яго ёсць нейкі аптымізм наконт выхаду з крызісу. Аднак сітуацыя не крытычная. Калі ўсе будзем працаваць свядома і згуртавана, мы выратуем краіну, захаваўшы яе эканоміку на вельмі высокім узроўні».

«І пасля гэтага крызісу — а ўсё ж такі ў эканоміку ў свеце ўкінута нямала грошай, і ад гэтага будзе эфект — мы будзем выглядаць вельмі прыстойна, таму што не толькі не пайшлі з рынкаў, але і занялі нішы там, дзе ўсё абвалілася і спынілася з-за таго, што эканоміка прыватнага сектара не змагла спрацаваць эфектыўна».

«Давайце думаць аб тым, як нам па працэнту, па паўпрацэнта, па рублю, па долару, па мільярду — але прыбаўляць у эканамічным росце», — сказаў на заканчэнне Прэзідэнт.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Абзац

■ Малады вадзіцель у Магілёве збіў на ўзбочыне дзвюх дзяўчынак, паведамілі БЕЛТА ў УДАІ МУС. 20-гадовы вадзіцель, які атрымаў пасведчанне на права кіравання транспартам у жніўні мінулага года, не справіўся з кіраваннем і наехаў на дзяўчынак 9 і 12 гадоў. Дзеці шпіталізаваныя. Толькі за мінулыя выхадныя на дарогах краіны пацярпелі 8 дзяцей.

■ **Узброены напад на вадзіцеля маршрутнага таксі адбыўся ў Віцебску. У Чыгуначны РАУС горада з заявай звярнуўся вадзіцель аднаго з транспартных прадпрыемстваў і паведаміў, якое два невядомыя праніклі ў яго маршрутнае таксі «Газэль», што стаяла на ўзбочыне. Пагражаючы абрэзам паляўнічай стрэльбы, яны забралі Br250 тыс. выручкі і зніклі. Выяўлена, што злачынства здзейснілі вучань 12-га класа вячэрняй школы і яго знаёмы, рабочы, якія затрыманы. Узбуджана крымінальная справа.**

■ Пракуратура Савецкага раёна Мінска праводзіць праверку па факце самазабойства супрацоўніка РУУС Савецкага раёна. Як мяркуецца, старшы ўчастковы інспектар маёр міліцыі застрэліўся з табельнага пісталета на тэрыторыі дзіцячага садка, што размешчаны непадалёк ад будынка РУУС. Падрабязнасці пакуль невядомыя.

■ **Брэсцкія памежнікі сумесна з падраздзяленнямі міліцыі, ваеннай контрразведкі і супрацоўнікамі мытні затрымалі мікрааўтобус з кантрабандным трыкатажам. Усяго ў мікрааўтобусе перавозілася 32 цюкі з адзеннем агульным коштам Br400 млн. Тавар перададзены ў падатковую інспекцыю, праводзіцца разбор.**

■ 250 галоў буйной рагатай жывёлы і 65 цялят ва ўзросце да 3 месяцаў эвакуявалі выратавальнікі з фермы «Уселюб» Навагрудскага раёна. Узгаранне адбылося ў пакоі адпачынку цаглянай малочна-таварнай фермы. На месцы пажару знойдзены труп беспрацоўнага мужчыны. Паводле папярэдняй версіі, трагедыя адбылася з-за неасцярожнасці пры курэнні.

■ **Музыкант групы «Любэ» Анатоль Куляшоў загінуў у нядзелю ўвечары ў выніку ДТЗ. Яго аўтамабіль Mercedes урэзаўся ў фуру, што стаяла на ўзбочыне. Музыкант памёр на месцы, а вадзіцель аўтамабіля шпіталізаваны з цяжкімі траўмамі. Куляшоў — заслужаны артыст Расіі, ён кіраваў таксама праектам «Традыцыі праваслаўных спеваў».**

Поўны абзац

■ **Ахвярай незвычайнага рабавання стала 69-гадовая жыхарка аўстрыйскага Ціроля — у яе выхапіў сумку белагаловы арлан, перадаюць інфармагенцтвы. Трохгадовая прыручаная птушка паляцела ад свайго гаспадара і пачала паляваць самастойна. Скрадзеную сумку арол абшукаў метрах у дзесяці ад пенсіянеркі, якая была ў шоку, і, відаць, не знайшоўшы нічога цікавага, кінуў здабычу. Паліцыя з дапамогай арнітолага злавіла птушку і вярнула гаспадару.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Прэзідэнт павіншаваў Патрыярха Кірыла са святам Вялікадня

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла са светлым святам Вялікадня.

«Вялікоднае свята нясе ў сабе магутны імпульс маральнага ператварэння і абнаўлення, якія так неабходны ў сучасным свеце», — гаворыцца ў віншаванні.

Як лічыць Прэзідэнт, вялікая роля ў такім важным працэсе духоўнага адраджэння належыць Рускай праваслаўнай царкве, чый высокі аўтарытэт і шматгранная праца на духоўнай ніве дапамагаюць падтрыманню згоды і стабільнасці ў грамадстве, умацаванню яго маральных асноў.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Патрыярху Кірылу здароўя, радасці, аптымізму і «дапамогі Божай у першасвяціцельскім служэнні».

Аляксандр Лукашэнка спадзяецца, што сустрэча з Папам Рымскім паслужыць пашырэнню сувязяў Беларусі са Святым Прастолам

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 19 красавіка павіншаваў Папу Рымскага Бенедзікта XVI з нагоды чацвёртай гадавіны ўрачыстага Пачатку Пантыфікату. Аляксандр Лукашэнка пажадаў Папе Рымскаму здароўя і далейшых поспехаў у выкананні адказнай апостальскай місіі, накіраванай на распаўсюджанне дабра і міласэрнасці ў свеце, шчырую дапамогу людзям Зямлі. Прэзідэнт таксама выказаў надзею на хуткую сустрэчу, якая будзе садзейнічаць дынамічнаму пашырэнню ўсебаковых сувязяў паміж Беларуссю і Святым Прастолам.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Каманда Гомельскай вобласці стала пераможцам Другіх аматарскіх спаборніцтваў па хакеі

У мінскім Палацы спорту 19 красавіка завяршыўся фінальны раунд Другіх рэспубліканскіх спаборніцтваў па хакеі сярод аматарскіх камандаў на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. У вырашальным паядынку каманда Гомельскай вобласці абыграла мінулагоднюю пераможцу — дружыну Прэзідэнта Беларусі — 9:8 (4:3, 2:2, 3:3) і стала ўладальнікам галоўнага прыза. Лепшыя снайперы фінальнага матчу — форварды Міхаіл Клімін з Гомельскай вобласці і Андрэй Асташэвіч з каманды Прэзідэнта, якія закінулі па тры шайбы. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка закінуў адну шайбу і стаў аўтарам дзвюх рэзультатыўных перадач.

БЕЛТА.

Трастбанк

ЗАО «Трастбанк»

г. Минск, ул. Игнатенко, 11

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2009 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	7 178,8	3 919,2
3	Средства в Национальном банке	1102	2	120 157,0	2 289,3
4	Ценные бумаги:	1103		—	16 263,1
	для торговли	11031	3	—	—
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	—	—
	в наличии для продажи	11033	3.2	—	16 263,1
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	59 720,8	20 337,6
6	Кредиты клиентам	1106	5	154 003,7	50 497,8
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	98,0	98,0
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	33 196,5	24 141,6
9	Прочие активы	1109	8	7 260,4	5 382,0
10	ИТОГО активы	110		381 615,2	122 928,6
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	—	—
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	8 686,4	31 487,9
14	Средства клиентов	1206	11	262 286,8	47 517,4
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		48 482,7	—
16	Прочие обязательства	1209	12	8 343,7	3 406,3
17	ВСЕГО обязательства	120		327 799,6	82 411,6
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	22 944,7	16 051,0
20	Эмиссионный доход	1212		—	—
21	Резервный фонд	1213		4 405,1	2 474,2
22	Накопленная прибыль	1214	14	1 359,7	2 010,8
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	25 106,1	19 981,0
24	ВСЕГО капитал	121		53 815,6	40 517,0
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		381 615,2	122 928,6
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	243 709,0	69 416,6
28	Обязательства	1302	17	301 721,6	35 170,6

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за январь - март 2009 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		8 141,9	3 378,3
2	Процентные расходы	2012		7 515,9	2 898,2
3	Чистые процентные доходы	201	18	626,0	480,1
4	Комиссионные доходы	2021		7 474,5	2 919,8
5	Комиссионные расходы	2022		366,4	172,4
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	7 108,1	2 747,4
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	(-2832,5)	462,6
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	—	—
9	Доход в форме дивидендов	205		—	—
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	5 633,2	621,0
11	Прочие доходы	207	23	14 051,2	225,5
12	Операционные расходы	208	24	4 874,4	2 541,1
13	Прочие расходы	209	25	8 261,8	232,8
14	Налог на прибыль	210		—	116,2
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ОТЧЕТНОГО ГОДА	2		183,4	404,5

Председатель Правления ЗАО «Трастбанк» **А.Д. Осмоловский**

Главный бухгалтер **Н.В. Бродик**

6 апреля 2009 г.

Лицензия № 14 от 13.11.2008 г., выдана Нацбанком РБ. УНП 100789114.

Антыкрызісная эканоміка

ГРОШЫ ІНВЕСТАРА — НЕ ЗА ПРЫГОЖЫЯ ВОЧЫ

Сёння інвестыцыі побач з экспартам прадукцыі і развіццём малога бізнэсу адыгрываюць ключавую ролю ў развіцці прадпрыемстваў рэгіёнаў і пераадоленні негатыўнага ўплыву сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу. Менавіта гэтай тэме была прысвечана прэс-канферэнцыя намесніка старшыні Гомельскага аблвыканкама Баляслава ПІРШТУКА.

— Мінулы год для нас склаўся дастаткова ўдала. У эканоміку вобласці было прыцягнута 5,4 трыльёна рублёў інвестыцый, у тым ліку па арганізацыях, якія падпарадкаваныя мясцовым Саветам і якія не маюць ведамаснай падпарадкаванасці — 2,4 трыльёна. А гэта — 133 % да ўзроўню 2007 года. Удалося ўвесці ў эксплуатацыю шэраг буйных аб'ектаў, сярод якіх цагельны завод у Лоеве, два шклатарныя заводы. Адбылася мадэрнізацыя многіх прадпрыемстваў... Да нас прыйшоў бізнэс са сваімі фінансамі і тэхналогіямі з 26 краін свету. Інвестуюць у Гомельшчыну такія краіны, як Аўстрыя, Расія, Нідэрланды, Францыя, Вялікабрытанія, Швейцарыя, Германія і іншыя. Трэба адзначыць станоўчую дынаміку росту долі ўласных і прыцягнутых інвестыцый. Але ж праблемы, якія пачаліся напрыканцы мінулага года ва ўсім свеце, не абышлі і нас. З імі сутыкнуўся наш рэальны сектар эканомікі, і ў першую чаргу буйныя валаўтваральныя прадпрыемствы.

— Тым не менш, крызіс мае як адмоўныя, так і станоўчыя бакі.

— Так, гэта сігнал для тых прадпрыемстваў, якія забавіліся на старых пазіцыях. Цяпер у іх няма іншага выйсця, як мадэрнізавацца, абнаўляцца і з новым прадуктам уваходзіць у новы рынак. Гэта датычыцца ў першую чаргу прадпрыемстваў камунальнай маёмасці, перапрацоўчай прамысловасці. Фінансава-эканамічны крызіс затармазіў працэс з выкананнем пагаднення з адной з іранскіх кампаній па будаўніцтве ў Светлагорску жыллёвага, гандлёвага і грамадска-культурнага цэнтра. На гэты праект шукаем іншага інвестара. Быў падпісаны праект і на выпуск у Гомелі звышлёгкіх самалётаў, які пакуль не ажыццёўлены. Гэту задуму прапрацоўваем з дэпартаментам па авіяцыі краіны — інвестар ужо знойдзены. Быў цікавы праект па распрацоўцы сапрапеляў возера Чырвонае, што ў Жыткавіцкім раёне, ды, на жаль, нямецкі інвестар адмовіўся ад яго, але мы будзем шукаць новага партнёра ўжо на эканамічным форуме, які ў маі адбудзецца ў Гомелі.

Сёлета недастатковы аб'ём інвестыцый давядзецца перакрываць за кошт іншых, небюджэтных крыніц. Мы будзем прырастаць за кошт асабістых і пазыковых сродкаў, хаця не такімі тэмпамі, як хацелася б. На гэта ёсць шэраг прычын. Асабістыя сродкі арганізацый з улікам сённяшніх рэалій будуць накіроўвацца на пагашэнне раней узятых крэдытаў. Крэдытныя рэсурсы прыцягваць стала больш складана — гэта звязана з іх падаражаннем, ускладненнем працэдуры афармлення. І паколькі ўнутраныя крыніцы для інвестыцый абмежаваныя, прыцягненне замежнага капіталу з'яўляецца адным з найважнейшых напрамкаў інвестыцыйнай палітыкі вобласці. Сваёй задачай мы бачым прыцягненне да супрацоўніцтва партнёраў, якім цікавы вектар Усходняй Еўропы, а галоўнае, каб яны прыйшлі да нас, а не ў суседнія краіны. Заданне Урада на гэты год — прыцягнуць 150 мільёнаў долараў, што на чвэрць больш за леташнія аб'ёмы. Прычым 105 мільёнаў долараў — гэта прамыя замежныя інвестыцыі.

— Якім чынам можна стварыць максімальна камфортныя ўмовы для паспяховай рэалізацыі праектаў?

— Не трэба чакаць, пакуль да нас прыйдзе інвестар, трэба шукаць яго самім. Сёння ў нас ёсць так званыя задзельныя праекты. Гэта завод па гарачым ацынкаванні, асваенне радовішчаў крэйды ў Веткаўскім раёне, будаўніцтва цэментнага завода і шэраг праектаў у свабоднай эканамічнай зоне «Гомель-Ратон». Між іншым, яна прыцягнула інвестыцый больш як на 190 мільёнаў долараў, 47 працэнтаў якіх — замежныя. Летась паступіла сюды 36 мільёнаў долараў. Былі арганізаваны вытворчасці металічнага профілю для шклопакетаў, фурнітуры для вадасцёкавых сістэм, пачаў працаваць завод кампазітных матэрыялаў і г.д. Працуем над пашырэннем межаў СЭЗ. Таксама ажыццяўляецца мадэрнізацыя вытворчасці паліраванага шкла ў ААТ «Гомельшкло». Увод у строй буйных аб'ектаў плануецца ў 2010 і наступных гадах. Яшчэ летась мы склалі пералік найбольш значных інвестыцыйных і інавацыйных праектаў, устанавілі пастаянны і жорсткі кантроль за яго выкананнем. За кожным праектам замацаваны адказныя (ад намесніка старшыні аблвыканкама да кіраўніка арганізацыі). Акцэнт зроблены на тое, каб суправаджаць пачатыя праекты да таго часу, пакуль там не стабілізуецца працэс вытворчасці.

— Наколькі вядома, сёлета прайшлі перамовы з асобнымі замежнымі інвестарамі і намячаюцца новыя...

— Нядаўна мы сустракаліся з прадстаўнікамі расійскай фірмы AMAKS і дамовіліся працаваць па рэканструкцыі гасцініцы ў абласным цэнтры і яшчэ двух аб'ектаў у Гомелі і Мазыры. Пройдуць перамовы са шведскай кампаніяй, якая праявіла цікавасць на форуме ў Лондане да прадукцыі Глушкавіцкага друзавага завода, што ў Лельчыцкім раёне. Адбудзецца сустрэча з нямецкай кампаніяй «Лінпак» па арганізацыі вытворчасці ўпаковачнай тары з успененага палістыролу на пляцоўцы станкабудаўнічага завода імя Кірава. Вядуцца таксама перамовы з фінскай кампаніяй аб набыцці акцый і наступнай мадэрнізацыі Гомельскай фабрыкі марожанага...

— Летась было падпісана пагадненне з замежным прадпрыемствам па перапрацоўцы фосфагіпсу — адыходаў Гомельскага хімічнага завода. Ці ёсць у гэтым напрамку нейкія зрухі?

— Сёння наш хімічны завод прапрацоўвае варыянты стварэння сумеснага прадпрыемства. Нашай доляй будуць сыравіна і тэрыторыя, замежныя партнёры павінны прывезці абсталяванне, устанавіць яго на тэрыторыі і пачаць вытворчасць. На постсавецкай прасторы аналагаў такіх вытворчасцяў няма, а сыравіны шмат. Тым больш, яна стварае пэўную экалагічную праблему. Да сярэдзіны года мы павінны вызначыцца з канкрэтнай структурай гэтага прадпрыемства. Я спадзяюся, усё атрымаецца.

— Наколькі далёкая для Гомельскай вобласці перспектыва — стварэнне лагістычнага цэнтра?

— Гэта вельмі дарагі праект. Па розных ацэнках, ён можа каштаваць каля 200 мільёнаў долараў. Калі б у нас быў ужо інвестар з такімі грашыма, мы пачалі б штосьці падлічваць. Засталося пераканаць інвестара, каб ён прыйшоў. А інвестар прыходзіць, калі ідуць патокі, калі ён бачыць свой інтэрэс, калі створана пэўная інфраструктура. Мы знаходзімся на ўдалым перасячэнні гандлёвых патокаў. Мы маем дзве пляцоўкі і лічым, што яны вельмі ўдалыя для размяшчэння такой вытворчасці: аэрапорт і Зябраўка.

— Вялікія надзеі на прыцягненне інвестараў ускладаюцца на эканамічны форум, які пройдзе ў Гомелі ў маі.

— Пачата работа па яго арганізацыі ў Гомелі. З улікам сітуацыі ў свеце мы вырашылі яго зрабіць не толькі інвестыцыйным. Мы яго назвалі эканамічным — крыху больш шырока, чым раней. Фармат правядзення форуму прадугледжвае правядзенне трох секцый: інвестыцыйнай, знешнегандлёвай і развіцця малога бізнэсу. Гэта тыя напрамкі, якія павінны стаць вызначальнымі ў найбліжэйшай будучыні.

Упершыню мы прыцягнулі да гэтага рэспубліканскія органы кіравання з прапановай падаць на форум праекты па сваіх падведамасных прадпрыемствах, якія знаходзяцца на тэрыторыі вобласці — тым, якія не вельмі эфектыўна выкарыстоўваюць свае магчымасці і ў тым ліку маёмасць, якая не залучана ў гаспадарчы абарот.

Мы не абмяжоўваемся пры запрашэнні расійскімі ці ўкраінскімі партнёрамі, нам хацелася б, каб прыйшлі інвестары ў тым ліку з краін, з якімі мы раней працавалі менш эфектыўна, напрыклад, са скандынаўскіх. Вельмі нядрэнна працуе фінскі, шведскі капітал, і ён усё больш актыўна прасоўваецца на тэрыторыю Усходняй Еўропы. Нам вельмі б хацелася, каб сярод партнёраў з'явіліся і азіяцкія краіны. Інвестар грошы за прыгожыя вочы ўкладваць не будзе. Ён усё добра пралічвае. Яго цікавяць, па-першае, рынкі рэалізацыі будучага прадукта. Мы вельмі зручна размяшчаемся, тут добрыя транспартныя патокі, межы празрыстыя, — яны гэта ўсё ўлічваюць.

Сёлета ўпор робім на запрашэнне канкрэтных дзелавых людзей, у тым ліку і былых нашых суайчыннікаў. У адрозненне ад мінулага года, цяпер мы абавязалі органы кіравання і рэгіёны загадзя падаць праекты і прапановы, каб размясціць іх на спецыялізаваным сайце gomel-forum.by для таго, каб патэнцыйныя інвестары змаглі азнаёміцца з імі і ехаць на форум з канкрэтнымі намерамі.

Падрыхтавалі Ірына АСТАШКЕВІЧ і Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

РАЗМЕРКАВАННЕ: ЯК ЗАДАВОЛІЦЬ І СВАЕ, І ДЗЯРЖАЎНЫЯ ІНТАРЭСЫ?

На пытанні, якія датычацца парадку размеркавання і ўладкавання на першым працоўным месцы, адказваюць старшыня прафсаюзных камітэтаў навучэнскай моладзі пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА і галоўны прававы інспектар працы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК.

(Працяг. Пачатак у нумарах за 15 —18 красавіка.)

☎ У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў на папярэднім размеркаванні выпускнікам бібліятэчнага факультэта паведамілі, што ў Мінску яны будуць размяркоўвацца толькі ў публічныя бібліятэкі. Калісьці гэты курс набіраўся спецыяльна пад кадравае камплектаванне Нацыянальнай бібліятэкі. У некаторых студэнтаў ёсць заяўкі на іх ад бібліятэк ВНУ, але гэтыя бібліятэкі не адносяцца да Міністэрства культуры, хоць таксама адчуваюць кадравы дэфіцыт. Ці павінна камісія па размеркаванні разглядаць і задавальняць персанальныя заяўкі на накіраванне да іх маладых спецыялістаў ад бібліятэк вышэйшых навучальных устаноў?

Гэты выпадак з'яўляецца прыкладам рэалізацыі кадравай палітыкі канкрэтнага органа дзяржаўнага кіравання. Відаць па ўсім, заказчыкам падрыхтоўкі адпаведных кадраў было Міністэрства культуры, таму і прыярытэт пры разглядзе заявак будзе аддавацца цэнтралізаванай заяўцы на падрыхтоўку спецыялістаў гэтага ведамства. Тым не менш заяўкі дзяржаўных арганізацый аб размеркаванні на працу да іх канкрэтных выпускнікоў таксама павінны разглядацца ў першую чаргу, і іх не павінны пакідаць без увагі пры наяўнасці магчымасці іх задавальнення. Хутчэй за ўсё, пры размеркаванні маладых спецыялістаў у Мінск будуць браць пад увагу спачатку заяўкі Міністэрства культуры і арганізацый яго сістэмы, а затым іншых дзяржаўных арганізацый. У выпадку, калі выпускнікам, якія пастаянна пражываюць у Мінску, будуць прапаноўвацца вакансіі ў іншых рэгіёнах, яны могуць настойваць на разглядзе заявак ад бібліятэк сталічных дзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў у якасці найбольш мэтазгоднага іх накіравання.

☎ Вайсковец служыць па кантракце ў Лепельскім раёне. Яго жонка заканчвае шосты курс Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, лячэбны факультэт, спецыялізацыя — рэаніматолаг-анестэзіёлаг. У абодвух мінская рэгістрацыя, маецца сваё жылле ў сталіцы. На папярэднім размеркаванні, на якім прысутнічалі заказчыкі кадраў з Мінска, жонку гатовы былі забраць у 9-ю сталічную клінічную бальніцу, дзе востра не хапае рэаніматолагаў-анестэзіёлагаў. А на канчатковым размеркаванні выпускніцу размяркоўваюць урачом-педыятрам у Лепельскую райбальніцу, бліжэй да месца цяперашняй службы мужа. Але, па-першае, муж усё адно служыць не ў Лепелі, а за 15 кіламетраў ад яго, і жыць разам яны не змогуць, да таго ж яго кантракт завяршаецца праз 1,5 года. А па-другое, і гэта самае галоўнае, выпускніцу размеркавалі не па яе спецыяльнасці. Педыятрыя — зусім іншая вобласць медыцыны, і дзіцячыя хваробы маюць сваю спецыфіку. Да таго ж рэаніматолагі-анестэзіёлагі — даволі рэдкія спецыялісты. Дык навошта было спецыялізавацца колькі гадоў, каб у выніку працаваць дзіцячым урачом. І педыятра добрага бальніца можа не атрымаць, і раней атрыманая кваліфікацыя будзе страчана. Ці можна пераразмеркавацца па непасрэднай спецыяльнасці ў Мінск?

У гэтым выпадку проста неабходна настойваць на мэтазгоднасці размеркавання ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю (прафесіяй) і прысвоенай кваліфікацыяй (пункт 9

САЦЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА: КАМУ І НА ЯКІХ УМОВАХ?

Паслугі дома і льготы, догляд і кватэрныя праблемы — усё гэта стала тэмамі нашай «прамой лініі» з удзелам спецыялістаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны: начальніка аддзела па справах інвалідаў Рыты Валянцінаўны СУШКО, начальніка аддзела развіцця і каардынацыі сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання Таццяны Іванаўны КАСЦЮКОВІЧ і начальніка аддзела па справах ветэранаў і пажылых людзей Івана Пятровіча НАГІБІНА.

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 17, 18 красавіка.)

☎ — Мне 83 гады, я ўдава інваліда II групы Вялікай Айчыннай вайны, прычым пазалетась памёр і мой адзіны сын. А пытанне такое: ці можа афарміць нада мной апякунства ўнук, якому 30 гадоў?

І па-другое. Я жыву ў старым доме, яго трэба рамантаваць. Зразумела, што справа гэта не бясплатная, і пэўную суму назбіраць удалося. Адно бяда: ніяк не магу знайсці арганізацыю, якая возьмецца за работу. Што рабіць?

Валянціна Рыгораўна Крупенія, *Мінскі раён*

— Хутчэй за ўсё, вы ставіце пытанне не аб апякунстве, а аб афармленні догляду. Такім чынам, афарміць догляд унук можа. Але пры ўмове, што ўнук не працуе, не атрымлівае пенсіі, не вучыцца, не займаецца прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Што да пошуку арганізацыі, якая ўзялася б за рамонт, то першнаперш паспрабуйце зрабіць гэта праз звычайныя рэкламныя аб'явы — у Мінску і Мінскім раёне такімі работамі займаюцца многія фірмы і індывідуальныя прадпрымальнікі. А калі самастойныя пошукі выніку не дадуць, можаце звярнуцца па дапамогу ў райвыканкам або сельскі Савет.

☎ — У нашай сям'і я і сын з'яўляемся інвалідамі II групы, муж знаходзіцца на аперацыі, пасля якой, хутчэй за ўсё, яму дадуць тую ж II групу. Ці можа афарміць догляд нас мой унук, якому 26 гадоў і які не працуе?

Надзея Андрэеўна Вараб'ёва, *Вілейскі раён*

— Афармiць догляд тут не атрымаецца — догляд афармляецца або за інвалідам I групы, або асобы ва ўзросце больш за 80 гадоў. Не атрымаецца ў гэтым выпадку і афармленне ў якасці сацыяльнага работніка, паколькі ўнук жыве з вамі, з'яўляецца блізкім сваяком і абавязаны клапаціцца аб вас па законе.

☎ — Ці можа наведваць сацыяльны работнік маю маці, якая жыве адна ў суседнім раёне горада? І колькі будзе каштаваць такое наведванне?

Аляксандр Міхайлавіч, *г. Гомель*

— Паводле заканадаўства, сацыяльныя паслугі непрацаздольным грамадзянам могуць прадастаўляцца бясплатна, на ўмовах частковай або поўнай аплаты — у залежнасці ад іх матэрыяльнага і сямейнага становішча. Пры гэтым асобам, што пражываюць з працаздольнымі членамі сям'і, якія абавязаныя ўтрымліваць іх па законе, у адным населеным пункце, сацыяльныя паслугі аказваюцца на ўмовах поўнай, 100-працэнтнай аплаты. Апошняе датычыцца і вас.

Дарэчы, цяпер кошт поўнай аплаты за абслугоўванне дома ў Гомелі ў месяц складае 16 160 рублёў у выпадку наведвання сацыяльным работнікам двойчы, і 18 180 рублёў — пры наведванні тройчы ў тыдзень.

☎ — Я інвалід III групы, маю толькі адну нагу. Чаму мяне ніколі не наведваюць сацыяльныя работнікі?

Ніна Аляксееўна Аносік, *Мінскі раён*

— Увогуле, трэба мець на ўвазе, што сацыяльныя паслугі прадастаўляюцца па заяўным прынцыпе. Такім чынам, калі ёсць жаданне карыстацца дапамогай сацыяльнага работніка дома, то вам, Ніна Аляксееўна, неабходна звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Мінскага раёна.

☎ — Разам з мужам-ветэранам жывём на 4-м паверсе. Аднак цяпер муж фактычна не можа хадзіць. У сувязі з гэтым, ці можам мы абмяняць сваю кватэру — скажам, на першы паверх?

Марыя Ульянаўна, *г. Мінск*

— Такі варыянт магчымы. Але для гэтага вам неабходна звярнуцца ў Адміністрацыю свайго раёна — усе жыллёвыя пытанні вырашаюцца менавіта праз яе.

☎ — Разам з маці-інвалідам вайны стаім у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў у Адміністрацыі Кастрычніцкага раёна сталіцы. Нумар нашай чаргі 32, але маці — ужо 86 гадоў. Парайце, як паскорыць гэту чаргу? Ці магчыма зрабіць гэта, скажам, дзякуючы хадайніцтву з Саюза ветэранаў ці якой-небудзь іншай арганізацыі?

Зоя Пятроўна Рагавая, *г. Мінск*

— Скажам шчыра, што неяк паскорыць чаргу наўрад ці атрымаецца, тут не дапамогуць хадайніцтвы ні Саюза ветэранаў, ні нашага міністэрства. Бо зразумейце правільна: «прасунуць» аднаго ветэрана — значыць, «адсунуць» іншага. А гэта было б несправядліва, тым больш, што ўсе ветэраны вайны людзі заслужаныя і ўжо немаладыя, самым малодшым з іх цяпер недзе па 85 гадоў.

— У нашай сям'і сямёра дзяцей, муж мае інваліднасць — у сувязі з гэтым даход на кожнага чалавека атрымліваецца невысокім. Аднак, калі звярнуліся па адрасную сацыяльную дапамогу, то пачулі адмову. Справа ў тым, што, як шматдзетная сям'я, мы пабудавалі новы дом. І ў той жа час за намі засталася ранейшая старая хата. Ці з'яўляецца падобная акалічнасць насамрэч перашкодай для атрымання адраснай дапамогі?

Валянціна Туркевіч, *Лунінецкі раён*

— Калі вы падыходзіце па даходах, то магчымасць атрымаць аднаразовую адрасную сацыяльную дапамогу застаецца незалежна ад колькасці дамоў. Аднак крыху іншы выпадак — дапамога штомесячная. Так, паводле цяперашняга заканадаўства, права на штомесячную адрасную сацыяльную дапамогу пазбаўляюцца сем'і, дзе на аднаго чалавека зарэгістравана больш чым адно жылое памяшканне. Калі ж сям'я мае два або больш жылыя памяшканні, але яны зарэгістраваныя на розных людзей, то права на штомесячныя адрасныя выплаты будзе. Зрэшты, Валянціна, калі тут узнікаюць пытанні або вы не згодныя з адмовай у раёне, то можаце абскардзіць яе ў камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Брэсцкага аблвыканкама.

☎ — Мы шматдзетная сям'я, жывём у палове дома, а другая яго палова аформленая на свякроў. Летась вырашылі звярнуцца па адрасную сацыяльную дапамогу, але нам адмовілі — бо ў сукупны даход уключылі даход свекрыві. Ці правільна гэта?

Людміла, *Стаўбцоўскі раён*

— Уключэнне або не ўключэнне свекрыві ў сукупны даход залежыць ад таго, ці вядзе ваша сям'я з ёй агульную гаспадарку. Прычым сам факт вядзення або невядзення агульнай гаспадаркі вызначаецца раённай камісіяй па прызначэнні дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі. Калі меркаваць па вашым званку, сумесную гаспадарку вы не ведзяце і, адпаведна, даход свекрыві ў сукупным даходзе сям'і ўлічвацца не павінен. Аднак калі камісія лічыць інакш і вы з яе меркаваннем не згодныя, можна зноў-такі звярнуцца ў камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама.

☎ — Ці ўключаюцца ў сукупны даход пры прызначэнні адраснай сацыяльнай дапамогі грошы, што атрымлівае сям'я ад продажу сельгаспрадукцыі з уласнага падворка, ад здачы грыбоў і ягад?

Антаніна Міхайлаўна, *Лепельскі раён*

— Паступленні ад продажу сельгаспрадукцыі, ад здачы дзікарослых раслін, ягад і грыбоў у сукупны даход уключаюцца — за выключэннем паступленняў ад здачы малака.

☎ — У нашай сям'і шасцёра дзяцей, таму летась нам двойчы прызначалі адрасную сацыяльную дапамогу. Аднак ёсць пытанне: ці павінны ўключаць памер гэтай дапамогі ў наш сукупны даход цяпер?

Марына Іванаўна, *Жлобінскі раён*

— Калі ваша сям'я атрымлівала штомесячную сацыяльную дапамогу, то яе памер сапраўды ўключаецца ў сукупны даход — пры ўмове, што штомесячныя адрасныя выплаты рабіліся на працягу трох папярэдніх месяцаў перад новым зваротам. Разам з тым трэба адзначыць: калі вы атрымлівалі адрасную сацыяльную дапамогу аднаразовую, то пры наступным звароце яе памер у сукупным даходзе не ўлічваецца.

☎ — Для атрымання адраснай сацыяльнай дапамогі неабходна, каб даход на кожнага члена сям'і быў крыху большым за 200 тысяч. Адкуль такая маленькая «планка» і ці плануецца яе павялічваць?

Аксана Уладзіміраўна, *Столінскі раён*

— Сапраўды, крытэрый патрэбы для аказання штомесячнай адраснай дапамогі складае сёння 234 370 рублёў, што адпавядае 100 % бюджэту пражытковага мінімуму. І гэта не выпадкова. Сама ідэя адраснай падтрымкі — забяспечыць кожнаму чалавеку пэўную мінімальную гарантыю. Прычым завышэнне падобнай гарантыі можа прывесці да не самых лепшых наступстваў — знікнення стымулаў працаваць, клапаціцца аб паляпшэнні ўласнага дабрабыту самастойна. Таму ніякіх змяненняў тут не плануецца, тым больш, што першапачаткова меркавалася выйсці на адзнаку БПМ толькі ў 2010 годзе.

Аднак іншая тэма — аднаразовая адрасная сацыяльная дапамога. Сёння крытэрый для яе атрымання — даход менш за 120 % бюджэту пражытковага мінімуму (цяпер гэта 281 240 рублёў). І якраз тут пытанні ёсць, магчыма, для чалавека, які апынуўся ў цяжкай сітуацыі, гэтага насамрэч недастаткова. Таму наша міністэрства ўжо падрыхтавала свае прапановы аб павелічэнні «планкі» пры прызначэнні аднаразовай адраснай сацыяльнай дапамогі са 120 да 150 % БПМ. І будзем спадзявацца, што нашы прапановы знойдуць падтрымку.

Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

УНП 100367422

ERGO

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ЗАО «СК «ЭРГО» за 2008 год

млн. руб.

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	2601,6	Источники собственных средств — всего	4846,8
Нематериальные активы	6,9	В том числе:	
Финансовые вложения — всего	—	уставный фонд	1957,0
В том числе:		резервный фонд	46,5
инвестиции в дочерние общества	—	добавочный фонд	2382,7
инвестиции в другие организации	—	фонд накопления	60,0
облигации и другие долговые обязательства	—	фонд потребления	14,9
прочие финансовые вложения	—	целевое финансирование	—
Доля перестраховщиков в страховых резервах	498,5	нераспределенная прибыль прошлых лет	—
Дебиторы — всего	172,6	нераспределенная прибыль отчетного года	385,7
В том числе:		Страховые резервы и фонды — всего	2477,6
дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	27,7	В том числе: страховые резервы	2446,3
депо премий по рискам, принятым в перестрахование	—	фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	31,3
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	144,9	гарантийные фонды	—
Прочие активы — всего	5005,6	Кредиторы — всего	219,0
В том числе:		В том числе:	
незавершенное строительство	5,4	кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	0,3
материальные ценности и затраты	52,9	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	68,3
денежные средства	4946,0	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	—
собственные акции (доли)	—	заемные средства	22,0
прочие активы	1,3	кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	128,4
Непокрытые убытки прошлых лет	—	Прочие пассивы	741,8
Непокрытые убытки отчетного года	—		
БАЛАНС	**8285,2**	**БАЛАНС**	**8285,2**

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ ЗАО «СК «ЭРГО» за 2008 год

млн. руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
I. Страхование жизни		
Страховые взносы (премии)	010	—
Страховые выплаты	020	—
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	—
Отчисления в гарантийный фонд	040	—
Расходы на ведение дела	041	—
Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)	050	—
II. Страхование иное, чем страхование жизни		
Страховые взносы (премии) нетто-перестрахование	064	3781,4
Изменение резерва незаработанной премии — нетто-перестрахование (+ или -)	067	-173,1
Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто-перестрахование	082	1629,3
Изменение резервов убытков — нетто-перестрахование (+ или -)	092	395,6
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	—
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	—
Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	81,6
Расходы на ведение дела	120	1132,5
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	142,2
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	359,0
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	943,7
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II		
Операционные доходы	140	493,7
Операционные расходы	145	819,2
Внереализационные доходы	150	494,1
Внереализационные расходы	155	418,4
Использовано прибыли	156	308,2
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	385,7

Аудитор ИП Волчкова А.К., свидетельство № 0067877 от 04.03.2002 г.

По данной отчетности выражено безусловно положительное аудиторское мнение.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗАО «СК «ЭРГО» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2009 г. и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2008 г.

Рэзананс

«МЫ ЗГУБІЛІ. І ЦІ ТОЛЬКІ СЛОВА?»

«Спадарыня... Дазвольце ёй застацца!»
(8 красавіка 2009 года)

...Тэма, узнятая ў артыкуле, настолькі надзённая, настолькі балючая!.. Кожны радок здаецца выпакутаваным, прапушчаным праз сэрца. Напэўна таму і гучыць так пераканальна.

Што яшчэ «зачапіла» — павага да апанентаў, якія маюць амаль супрацьлеглыя погляды. І веданне жыцця.

Я таксама не ўчора нарадзілася, маю ўнукаў. Мае сяброўкі, аднагодкі — таксама. Але ж бабулі мы і сапраўды толькі для іх. А для іншых? Кожны раз, калі чую такі зварот, міжволі сціскаюся, прыгінаюся, адчуваю сябе старэйшай, чым ёсць, нейкай нямоглай, непатрэбнай, амаль выкінутай з жыцця.

Але ж чаму душа так пратэстуе супраць гэтага звароту, не разумела доўга. Не разумела, пакуль аднойчы, едучы з Камароўкі (вядома ж, з нейкімі торбамі) не пачула: «Дама, вам уступили место. Садитесь, пожалуйста». Я ад гэтых слоў неяк адразу «параўнела», пераможна паглядзела вакол сябе і з годнасцю села. Я адчула сябе іншым, вартым павагі, чалавекам! Дарэчы, у былой Заходняй Беларусі, зноў жа на рынках, ад людзей сталага веку даводзілася чуць словы пан, пані. І гэта было так нязмушана, так прыгожа!

Вось тут, мне здаецца, і адказ на многія нашы пытанні: зніклі паважлівыя словы звароту і чалавек нешта страціў. Ды што там — усё нашы людзі страцілі, бо панізіўся іх прававы статус.

З ім, вось такім, мы і існуём. Прычым амаль цэлае стагоддзе. Шукаем...

Я пастаянна карыстаюся грамадскім транспартам. Спадарства, чаго толькі ні прыдумляюць нашы бедныя кантралёркі! У дачыненні да пасажыраў гучыць і строгае «уважаемый» і, лічы, хатняе «солнышко». Адна з кантралёрак прамаўляла «госпожа», «господин». Цяпер нешта не чутно яе. Можа звольнілася, а можа хто з пасажыраў параіў ёй шукаць «господ» у іншым месцы?

Смешна было чуць і слова «парень» у дачыненні да прыстойна апранутых, відаць адукаваных маладых людзей, студэнтаў.

Не адстаюць ад жыцця і гандляры на той жа Камароўцы. Гэта ўперад я была там «бабулька», Цяпер — я ўжо і «гаспадынька», і «хозяюшка», і нават «мадам»...

Для міліцыянтаў, праўда, «бабулькай» засталася, але ж гэта не віна іх, а бяда. Мы згубілі свае паважлівыя звароты...

Але ж мова жывая! Яна развіваецца па сваіх законах. Ніякімі загадамі, ну напэўна ж, не ўвядзеш тое ці іншае слова, той ці іншы зварот. Паважлівыя «спадар», «спадарыня» можа вярнуцца да нас, да ўсіх людзей Беларусі, калі мы не будзем цурацца яго.

Вядома ж у кантэксце роднай мовы, фантастычна блізкай, дарэчы, не толькі да рускай, але і да польскай, украінскай, балгарскай, славацкай... Мы ўсюды свае, разумелыя. Дык чаму б ёй, нашай мове, яшчэ і лексічным складам не быць на ўзроўні іншых славянскіх? Не трэба толькі «палоць», выкідваць словы, якія не падабаюцца. І тады...

Дзякуй газеце за такія шчырыя развагі. Вельмі хацелася б, каб ваша такое важкае, такое прачулае слова хоць на крок наблізіла нас да Беларусі.

А. Балошка, *г. Мінск*

У канцы 80-х я працаваў (не маню — сапраўды працаваў) старшынёй сельскага Савета. У нас ужо тады і школы-крамы капітальна рамантаваліся, і могілкі ў парадак прыводзіліся, і ўсім удовам дровы вазіліся, і дарогі будаваліся, і платы ў пяць розных колераў (каб прыгажэй было), фарбаваліся... Карацей, жыццё кіпела.

Але ж я не пра тое. Добра помню, як да нас у школу накіравалі сям'ю маладых настаўнікаў (муж, жонка, дачушцы гадкі з чатыры). Трэба было выдзяляць жыллё. Я прапаноўваў ім дом. Гаспадар жа — выбраў старэнькую хацінку. Там, маўляў, і цяплей будзе, і да школы бліжэй.

Што ж — тваё права. Выбраў — жыві.

А трэба сказаць, што настаўніка гэтага ведаў ці не ўвесь раён — хто за вершы, хто за тое, што ён заўсёды і ўсюды гаварыў па-беларуску. У тым ліку і з трыбун. Аднойчы, успамінаю, у зале чалавек пад 700 было. А ён лёгенька, хораша... Кабецце, што сядзела са мною побач аж дух заняло. Кажа мне: «Нич-чего не поняла... Но заслушалась. Так красиво звучит!»...

Гэта я ў знак згоды з аўтаркай, што мова наша і насамрэч вельмі прыгожая, мілагучная.

Але ж пішу цяпер не толькі для гэтага. Неяк той настаўнік да мяне ў сельскі Савет прыйшоў. Не ведаю, што там у яго здарылася, але ж настрой нечым сапсаваны быў. Павітаўся, грозна так пытаецца:

— Ведаеце, чаго я да вас прыйшоў?

Паціскаю плячыма:

— Ды адкуль жа мне ведаць? Сядай вось, кажы.

На крэсла яму паказваю. А ён маўчыць, азіраецца, быццам шукае некага. Потым удакладняе:

— Ну вы ж тут начальнік?

— Я, — кажу. — І рады, што зайшоў... Сюды, а не ў райвыканкам. Так мы тваю праблему хутчэй зможам вырашыць...

А наведвальнік мой усё адно маўчыць.

— Не верыш, — пытаю, — ці што?

Адказвае:

— Ну, не веру... Вушам сваім: за ўсё жыццё маё гэта першы выпадак, калі нехта з начальства са мной па-беларуску гаворыць.

...Я гэта да таго, што не я адзін такі. Сярод кіраўнікоў (рознага ўзроўню), без сумневу, ёсць тыя, хто любіць родную мову, хто добра ведае яе. Дык навошта гэта хаваць, спадарства? Чаму не паказваць прыкладу іншым? І людзям, і кіраўнікам. Калі мы беларусы.

Л.Р. Кароткін,
в. Вярэнькі, Пастаўскі раён.

«ШТО Ў ВАС ДОБРАГА?»

Наталля НАВУМАВА, намеснік начальніка аддзела маркетынгу Кобрынскага мясакамбіната:

— Напэўна, нараджэнне пляменніка... Калі гаварыць адносна працы, дык, вядома ж, выпуск нашай навінкі — каўбасы «Міланская» з шакаладам. Мы ёй усю краіну ўзрушылі (*смяецца*). Многія тэлефануюць, цікавяцца, так што давялося павялічваць аб'ёмы вытворчасці. Гэта вельмі радуе. Акрамя таго ў найбліжэйшы час на прадпрыемстве запланаваны выпуск чарговай навінкі — вітамінных сасісак. Што яшчэ добрага? Сёлета я атрымліваю дыплом (*смяецца*). Цяпер заканчваю юрфак Гродзенскага ўніверсітэта, да выпускнога засталося не так шмат часу. Працу мяняць не збіраюся, застануся на мясакамбінаце.

Васіль КАЗЛОЎ, начальнік упраўлення эканомікі Міністэрства лясной гаспадаркі:

— Добрае ў жыцці тое, што нічога ў ім не змянілася. Так, шмат працы, але яна, як кажуць, не ў цяжар, а ў радасць. Любыя праблемы, па вялікім рахунку, можна вырашыць. Гэта прыносіць задавальненне. А больш канкрэтна... Добра, што атрымалася на дачы выканаць вялікі аб'ём работы (*смяецца*). Гэта звязана з будаўніцтвам. Так што жыццё не спыняецца!

Валерый СЯРГЕЙ, намеснік старшыні Мядзельскага райвыканкама па жыллёва-камунальнай гаспадарцы і будаўніцтве:

— Прыйшла вясна, а з ёй уліваецца свежая «кроў» і ў прыроду, і ў чалавека... Ёсць такі выраз: шчасце — гэта калі раніцай хочацца на працу, а ўвечары — дадому. Гэта якраз асабіста пра мяне, можаце так і напісаць. Дзе мы па большасці адпачываем? У сям'і! Калі яна моцная — гэта тая аддушына, якая дае табе сілы. Эпахальных падзей у нас няма: мы гадуем сад, вырошчваем кветкі... Дзіця вучыцца ва ўніверсітэце, сёлета паспяхова заканчвае чацвёрты курс! Што да працы, дык будаўніцтва не спыняецца, нягледзячы ні на што — усе будаўнічыя арганізацыі цяпер занятыя. Поўным ходам вядзецца добраўпарадкаванне, у нас цяпер не горад, а «цукерка»!

Таісія БУРДЗЕЙКА, пенсіянерка, вёска Баравое Дзяржынскага раёна:

— Радуе, што Бог дае здароўе, мы можам працаваць. У прыватнасці, асабіста для мяне радаснай падзеяй была аперацыя ў лютым у анкалогіі: на шчасце, нічога злаякаснага не знайшлі. Прыйшла вясна, прынесла клопаты, але яны прыемныя: мы ўвесь час праводзім на вуліцы, займаемся агародам, вось зараз я саджаю кветкі. Гэта ж для сябе, для сваёй сям'і. Дарэчы, у найбліжэйшы час чакаем прыбаўлення нашчадкаў. Дзве ўнучкі ў мяне ўжо ёсць, хто народзіцца — унучка ці ўнук — пакуль не ведаем. Але скажу вам шчыра, хацелася б падаўжальніка роду — унука!

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Прырода кліча!

Ці можна карыстацца мангалам у гарадской паркавай зоне?

Сёлета, як і ў папярэднія гады, самыя нецярплівыя суседзі па шматпавярховіку ўжо паспелі распачаць «шашлычны» сезон: дымкі ад іх мангалаў, на зайздрасць іншым, луналі прама на пустцы пад вокнамі дома — побач з дастаткова ажыўленай сталічнай вуліцай. А выхадным днём у бліжэйшы лесапарк не зайсці: ці не на кожным кроку тыя ж мангалы, але часцей — проста вогнішчы. Зразумела, што ў апошнім выпадку такія кампаніі рызыкуюць выклікаць пажар. Але, цікава, ці можна ў паркавай зоне горада карыстацца ўласным мангалам, як кажуць, на законных падставах?

Як патлумачыў «Звяздзе» начальнік службы аховы дзяржлясфонду УП «Мінская лесапаркавая гаспадарка» Канстанцін Пузына, у дзеючых Правілах пажарнай бяспекі ў лясах СССР, зацверджаных пастановай Савета Міністраў СССР № 395 ад 18.06.1971 г., не агавораны патрабаванні да грамадзян па выкарыстанні мангалаў і іншых падобных прыстасаванняў у гарадскіх лясах. Таму цяпер УП «Мінская лесапаркавая гаспадарка» падрыхтавала праекты рашэнняў Мінскага абласнага выканаўчага камітэта і Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта «Аб забеспячэнні пажарнай бяспекі ў лясах УП «Мінская лесапаркавая гаспадарка» (гарадскіх лясах), у якіх агаворваюцца месцы, дзе дазваляецца выкарыстоўваць мангалы і іншыя прыстасаванні для развядзення адкрытага агню, што не сутыкаюцца з лясной падсцілкай.

Мы азнаёміліся з гэтымі праектамі. Згодна з імі, апроч іншых мераў па забеспячэнні пажарнай бяспекі ў лясах, тэрыторыі лясніча фонду УП «Мінская лесапаркавая гаспадарка» і на непасрэдна прылеглых да лесу тэрыторыях, за выключэннем спецыяльна абсталяваных дзяржаўнай лясной аховай месцаў для распальвання вогнішчаў. Плануецца дазволіць развядзенне агню ў спецыяльна абсталяваных прыстасаваннях для прыгатавання ежы (мангалах, жароўнях і інш.), што не сутыкаюцца з жывым наглебавым покрывам і лясной падсцілкай і выключаюць магчымасць іх узгарання па-за спецыяльна абсталяваных дзяржлесаахоўвай месцаў для распальвання вогнішчаў. У выпадку прыняцця дакументаў грамадзянам будзе забаронена распальваць вогнішчы, у тым ліку разводзіць агонь у названых мангалах і жароўнях, у хвойных маладняках, засмечаных гарэльніках, на ўчастках лесу, пашкоджанага стыхійнымі з'явамі ці тэхнагеннай дзейнасцю, тарфяніках, лесасеках з непрыбранымі рэшткамі ад высечкі і нарыхтаванай драўнінай, участках з сухой расліннасцю, пад кронамі дрэў.

Плануецца вызначыць, што пляжы, зоны масавага адпачынку насельніцтва, акрамя месцаў, спецыяльна абсталяваных дзяржаўнай лясной аховай для распальвання вогнішчаў, будуць з'яўляцца забароненымі месцамі для распальвання вогнішчаў грамадзянамі ўвесь год.

Дарэчы, паводле слоў спецыялістаў, суседзі, што смажылі шашлыкі ў мангале на пустцы перад домам, нічога не парушылі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Жывая зямля

Па мядзведжым следзе

Вестка, што мядзведзі выйшлі са спячкі, хутка абляцела Бярэзінскі біясферны запаведнік. След самага буйнога драпежніка беларускага лесу бачылі то ў адным месцы, то за дзясяткі кіламетраў у супрацьлеглым. Часам адбіткі на дарозе і талым снезе сведчылі, што мядзведзіцы пакінулі бярлогі з нованароджанымі медзведзянятамі. Вырашана было прывабіць мішку на адну з палян у месцы яго сталага пражывання. Для назірання за ім служыла вышка-хатка на высокіх слупах з маленькімі акенцамі. Але амаль за месяц пошукаў і чакання касалапага яшчэ ніхто ўвачавідкі не ўбачыў. Давялося і мне разам з навукоўцамі запаведніка паспрабаваць злавіць удачу. Прачынаўся а палове на чацвёртую раніцы, ехаў за дзясятак кіламетраў, болей за кіламетр ішоў па лесе, каб зацёмна схавацца ў засідцы, падрыхтаваць фотаапаратуру і чакаць. Але галодны пасля зімы мядзведзь на паляне ні разу не паказаўся, хоць сляды на дарожным пяску сведчылі пра яго блізкае знаходжанне. Давялося задаволіцца здымкам адбітка мядзведзевай лапы. Тыднем раней у запаведнік прыязджалі чэшскія фатографы-аніматысты таксама з мэтаю фотапалявання на мядзведзя, але і ім фартуна таксама не ўсміхнулася.

Усё ж паездку ў святыню беларускай прыроды — гэтак можна назваць Бярэзінскі біясферны запаведнік — нельга лічыць дарэмнай. Па-першае, удалося падгледзець вялікі цецяруковы ток. Там, дзе чакалі касалапага, пашанцавала сфатаграфаваць арлана-белахвоста — птушку рэдкую і надзвычай асцярожную. Навукоўцы сцвярджаюць, што на тэрыторыі запаведніка гняздуюцца толькі дзве пары гэтага віду арліных. Перад вамі на фотаздымках той самы арлан, той самы адбітак мядзведзевай лапы і адзін з удзельнікаў вялікага цецеруковага току.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Прэзідэнт Беларусі накіраваў у парламент законапраект па гуманізацыі крымінальнага і адміністрацыйнага права

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў для разгляду ў парламент законапраект «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці».

Мэта законапраекта — удасканаленне крымінальнага і адміністрацыйнага заканадаўства з улікам яго далейшай гуманізацыі, практыкі прымянення Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, Працэсуальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Праектам закона, у прыватнасці, прадугледжваецца дэкрыміналізацыя асобных злачынстваў. Так, крымінальная адказнасць за ўхіленне ад выплаты сум падаткаў, збораў надыходзіць у выпадку, калі памер прычыненага ўрону перасягне 1 тыс. базавых велічынь. Цяпер гэты парог складае 250 базавых велічынь. Адпаведна асабліва буйным будзе лічыцца ўрон у памеры 2,5 тыс. базавых велічынь (цяпер 1 тыс. базавых велічынь). Аналагічны падыход прапануецца замацаваць і адносна незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці.

Ухіленне ад выплаты падаткаў і незаконная прадпрымальніцкая дзейнасць, якія нанеслі ўрон у меншым памеры, прывядуць да адміністрацыйнай адказнасці (напрыклад, да штрафу на індывідуальнага прадпрымальніка ў памеры 20 працэнтаў ад нявыплачанай сумы падатку, а за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць — да 200 базавых велічынь з канфіскацыяй даходу, атрыманага ў выніку такой дзейнасці, або без канфіскацыі ці да пазбаўлення права займацца пэўнай дзейнасцю).

Пры гэтым законапраектам прадугледжваецца ўстанаўленне крымінальнай адказнасці за паўторнае злачынства ў выглядзе кіравання транспартным сродкам у стане ап'янення. Такое злачынства караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам у памеры ад 300 да 1 тыс. базавых велічынь або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю. Цяпер за гэта дзеянне прадугледжана толькі адміністрацыйная адказнасць у выглядзе штрафу ад 15 да 45 базавых велічынь або адміністрацыйнага арышту да 15 сутак. Такія меры адказнасці не адыгрываюць ролю належнага стрымальнага фактару, які папярэджвае правапарушальніка ад паўторнага ўчынення названага віду злачынства.

У адрозненне ад дзеючых палажэнняў прадугледжваецца магчымасць у выпадку прызнання фізічнай асобай сябе вінаватай і выказванні ёю згоды на прымяненне да яе адміністрацыйнага спагнання не складаць пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні, а адразу накласці адміністрацыйнае спагнанне і тады, калі ў санкцыі адпаведнага артыкула Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях змяшчаюцца таксама такія віды адміністрацыйных спагнанняў, як адміністрацыйны арышт, дэпартацыя або спагнанне кошту прадмета адміністрацыйнага правапарушэння.

Таксама прапануецца спрасціць працэдуру правядзення пасяджэння калегіяльнага органа і судовага пасяджэння і ажыццяўляць іх без вядзення пратакола такога пасяджэння пры разглядзе справы аб адміністрацыйным правапарушэнні, калі асоба, у адносінах да якой вядзецца адміністрацыйны працэс, прызнае сваю віну і не заяўляе аб неабходнасці даследаваць доказы.

У мэтах выключэння лішняга адміністрацыйнага рэгулявання прадпрымальніцтва і іншай гаспадарчай дзейнасці, стымулявання дзелавой актыўнасці, прывабнасці для ўнутраных і знешніх інвестыцый законапраектам прадугледжваецца выключэнне з Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях шэрагу такіх нормаў аб адміністрацыйнай адказнасці, як ажыццяўленне здзелак з каштоўнымі папярамі пры адсутнасці кваліфікацыйнага атэстата, незабеспячэнне знаходжання праспекта эмісіі ў месцах продажу каштоўных папер, выступленне паручыцелем або гарантам за кошт страхавых узносаў або страхавых рэзерваў, перавышэнне тэрмінаў правядзення знешнегандлёвых аперацый, прадастаўленне імпарцёрам у абслуговы банк недакладнай інфармацыі і інш.

Пры гэтым выкананне адпаведных забаронаў можа быць забяспечана мерамі дысцыплінарнага і грамадзянска-прававога ўздзеяння.

Разам з тым праектам закона прапануецца ўстанавіць адміністрацыйную адказнасць за шэраг правапарушэнняў, якія могуць нанесці шкоду здароўю або маёмасным інтарэсам насельніцтва, а менавіта за:

вытворчасць і гандлёвы абарот у рэспубліцы дзіцячага харчавання, вырабленага з выкарыстаннем генетычна мадыфікаваных складальнікаў (кампанентаў). Гэта дасць магчымасць не дапусціць паставак у краіну названай прадукцыі і прадухіліць выкарыстанне ў яе вытворчасці сыравіны з генетычна мадыфікаванымі складальнікамі (кампанентамі);

неінфармаванне спажыўцоў або прадастаўленне ім недакладнай інфармацыі аб харчовай сыравіне і харчовых прадуктах, атрыманых з выкарыстаннем генетычна мадыфікаваных складальнікаў (кампанентаў) і харчовых дабавак;

продаж алкагольных, слабаалкагольных напіткаў або піва няпоўнагадовым, гандаль названымі напіткамі ў неўстаноўлены час ці ў неўстаноўленых месцах;

нямэтавае выкарыстанне або выкарыстанне з парушэннем заканадаўства адлічэнняў на капітальны рамонт;

нямэтавае выкарыстанне юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія ажыццяўляюць будаўніцтва (рэканструкцыю) жылых дамоў, кватэр, аб'ектаў жыллёвай інфраструктуры і гаражоў, акумуляваных грашовых сродкаў юрыдычных і фізічных асобаў, а таксама акумуляванне грашовых сродкаў юрыдычных і фізічных асобаў без адкрыцця спецыяльнага рахунку і інш.

Форменнае адзенне і знакі адрознення пракурорскіх работнікаў заснаваны ў Беларусі

У Беларусі заснаваны форменнае адзенне і знакі адрознення пракурорскіх работнікаў. Указ аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 16 красавіка.

Дакументам таксама зацверджаны пералік прадметаў форменнага адзення пракурорскіх работнікаў, нормы забеспячэння гэтымі прадметамі і апісанне знакаў адрознення пракурорскіх работнікаў.

Форменнае адзенне і знакі адрознення адлюстроўваюць гістарычныя традыцыі органаў пракуратуры як праваахоўнай структуры.

Прэс-службa Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АБРЫНУЛАСЯ АГАРОДЖА БАЛКОНА. УПАЛІ ДВОЕ...

У нядзелю ў Мінску ў бальніцу трапілі двое сталічных жыхароў, якія пацярпелі ў выніку частковага абрушэння агароджы балкона ў жылым доме.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, бяда здарылася каля паловы на восьмую вечара. 39-гадовая мінчанка і 49-гадовы сталічны жыхар знаходзіліся ў гасцях у 43-гадовай жанчыны, што пражывае на вуліцы Гікала, і былі на балконе яе кватэры, калі часткова абрушылася яго агароджа. У выніку падзення з балкона пацярпелыя з чэрапна-мазгавой траўмай сярэдняй ступені, закрытым пераломам правага пляча, пераломамі 5-7 рэбраў і ЧМТ лёгкай ступені, мноствам пераломаў рэбраў, унутраным крывацёкам былі дастаўлены ў бальніцу. Між іншым, пяціпавярховы дом, дзе ўсё здарылася, быў пабудаваны ў 1963 годзе, а меркаваная прычына абрушэння — старэнне металічнай канструкцыі агароджы балкона. Праверку па гэтым факце праводзіць Савецкае РУУС.

Ігар ГРЫШЫН.

У ВІЦЕБСКУ ЖЫЛЛЁ ЗНОЎ ПАЧАЛО ДАРАЖЭЦЬ?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сёння на другасным рынку жыллёвай нерухомасці сталіцы захоўваецца стабільная тэндэнцыя да патаннення ўсіх відаў кватэр і нават загарадных жыллёвых аб'ектаў. Прапанова жылых памяшканняў у Мінску дасягнула свайго абсалютнага максімуму: складае цяпер каля 9 тысяч кватэр. А вось у Віцебску ў другой дэкадзе красавіка кватэры нават пачалі даражэць.

У САКАВІКУ НАЗІРАЎСЯ АЖЫЯТАЖНЫ АБВАЛ ЦЭНАЎ

Паводле інфармацыі **дырэктара Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Дзяржаўнае агенцтва нерухомасці г. Віцебска» Уладзіміра КАБАНАВА**, за два месяцы пасля новага года попыт з боку насельніцтва на віцебскія кватэры знізіўся амаль да нулявой адзнакі. У сакавіку кватэры патаннелі вельмі моцна і амаль імгненна. Пасля гэтага патэнцыйныя пакупнікі пачалі вяртацца на рынак і набываць жыллё. Сёння самыя танныя аднапакаёўкі-маласямейкі з агульнай плошчай да 30 квадратных метраў і кухняй каля 6 «квадратаў» прапануюцца пакупнікам за 17—22 тысячы долараў. У дзевяціпавярховых дамах аднапакаёвыя кватэры з новай планіроўкай агульнай плошчай да 37 квадратных метраў і кухняй, большай за 9 кв.м, каштуюць ужо 30 тысяч долараў. Яшчэ ў сакавіку такія стандартныя кватэры з палепшанай планіроўкай каштавалі ў межах 25—26 тысяч долараў. Менавіта тады такое жыллё пакупнікі пачалі актыўна набываць. Пасля павелічэння попыту на нерухомасць, гаспадары жылля хуценька за 3 тыдні пераарыентаваліся і пачалі штучна ўзнімаць цэны на свае кватэры. Спецыялісты дзяржаўнага агенцтва гэтага абласнога цэнтра канстатуюць, што парадаксальнае падаражэнне такіх кватэр сыграла зараз з прадаўцамі злы жарт, бо попыт на жыллё па такім кошце зноў знік.

Самыя слабенькія, а таму і танныя двухпакаёвыя кватэры ў пяціпавярховых дамах агульнай плошчай 43—45 квадратных метраў і маленькай кухняй каштуюць сёння каля 26 тысяч долараў. Яшчэ тры тыдні таму такую «хрушчоўку» можна было набыць за 22 тысячы долараў. Двухпакаёвыя кватэры новай планіроўкі з агульнай плошчай каля 50—52 квадратных метраў выстаўляюцца на продаж за 38 тысяч долараў і даражэй. У сакавіку такія кватэры амаль ва ўсіх мікрараёнах Віцебска каштавалі каля 32—35 тысяч долараў. На новым цэнніку жыхары Віцебска не спяшаюцца набываць і двухпакаёвыя кватэры, якія падаражэлі. У агенцтвах цяпер існуюць заказы ад кліентаў, якія згодны набываць стандартныя двухпакаёвыя кватэры, не даражэйшыя за 33—34 тысячы долараў, або і за 38 тысяч долараў, калі агульная плошча такога жылля складае больш як 60 «квадратаў».

На другасным рынку жыллёвай нерухомасці Віцебска захаваліся сёння зусім маленькія трохпакаёвыя кватэры з агульнай плошчай каля 47 квадратных метраў. Такія старыя «хрушчоўкі» каштуюць каля 30 тысяч долараў. Трохпакаёўкі старой планіроўкі, але з агульнай плошчай каля 60 квадратных метраў каштуюць ужо ад 36 тысяч долараў і даражэй. Трохпакаёвыя кватэры новай планіроўкі ад 64 да 80 «квадратаў» прапануюцца ўжо за 40—50 тысяч долараў.

ПРАМАЯ ЗАЛЕЖНАСЦЬ АД КОШТУ НОВАГА ЖЫЛЛЯ

Абвал цэнаў на другасным рынку нерухомасці Віцебска ў сакавіку назіраўся не толькі пад уплывам эмацыянальнай ажыятажнай хвалі, але і ў сувязі з кропкавым павелічэннем прапановы кватэр па мінімальным кошце. Так адбылося, што пасля новага года адна мясцовая будаўнічая арганізацыя своечасова не разлічылася з банкам па крэдытах, пасля чаго фінансавая ўстанова пачала самастойна рэалізоўваць заклад будтрэста. Тады пэўная колькасць кватэр прапаноўвалася пакупнікам за 830—870 долараў за квадратны метр. Крыху пазней, зноў-такі для пагашэння крэдытаў, яшчэ адзін будаўнічы трэст быў вымушаны даволі хутка прадаваць некалькі дзясяткаў кватэр у новых дамах. Тады квадратны метр агульнай плошчы кватэр у панэльным доме ў свабодным продажы каштаваў прыкладна 1 млн 800 тысяч рублёў, або 650—700 долараў.

Паводле меркаванняў кіраўніка дзяржаўнага агенцтва г. Віцебска, калі і надалей на другасны рынак будзе «выкідвацца» такое таннае жыллё, то цэны могуць зноў абваліцца. Разам з тым, кошт жылля на другасным рынку Віцебска за апошнія два тыдні павялічыўся яшчэ і таму, што ў мясцовых газетах пачала з'яўляцца інфармацыя аб тым, што на першасным рынку жыллё таннець не будзе. Пасля гэтага прадаўцы пачалі самастойна прагназаваць сітуацыю і ўзнімаць кошт кватэр. Сёння цэны на жыллё ў горадзе стабілізаваліся, але ніхто не ведае, як доўга працягнецца такая хісткая раўнавага, бо пакупнікі з рынку зноў амаль зніклі.

САМЫ ТАННЫ КАТЭДЖ КАШТУЕ $80 ТЫС.

Агенцтвы цяпер прапануюць на продаж даволі вялікую колькасць сучасных катэджаў ва ўсіх мікрараёнах горада. Сёння самыя дарагія катэджы з агульнай плошчай жылля каля 500 квадратных метраў прапануюцца за 250 тысяч долараў. Да крызісу кошт такіх шыкоўных домікаў дасягаў нават 320—350 тысяч долараў. Сапраўды, элітныя катэджы гаспадары пакуль знялі з продажу, але і за 200 тысяч долараў жыллё ў Віцебску ніхто не купляе. Крэдытныя грошы ў банках сталі вельмі дарагімі, а ўласных зберажэнняў на гэта яўна не хопіць.

Сярэдні кошт стандартных катэджаў складае 120—140 тысяч долараў, але і на іх попыт мінімальны. Невялікія катэджы з плошчай жылых памяшканняў, як у трохпакаёвай кватэры, выстаўляюцца на продаж за 80—85 тысяч. Пасля істотнага патаннення катэджаў у студзені—лютым, сёння працягваецца павольнае зніжэнне цэнаў. Пры рэальных здзелках прадаўцы звычайна згаджаюцца са зніжэннем стартавага кошту на 3—5 тысяч долараў. Калі катэдж быў пабудаваны за крэдытныя сродкі, якія цяпер трэба вяртаць, або ён прадаецца ў сувязі з раз'ездам сям'і, тады канчатковыя зніжкі могуць складаць і 10—15 тысяч долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

ЦІ АДКЛЮЧАЦЬ «ШЭРЫЯ» ТЭЛЕФОНЫ?

Апошнім часам у грамадстве актыўна абмяркоўваецца ініцыятыва МУС і Генпракуратуры аб тым, каб айчынныя сотавыя аператары не абслугоўвалі мабільныя тэлефоны, увезеныя ў краіну па шэрых схемах. Ужо нават распрацаваны праект указа, які ўтрымлівае гэту норму — але канчаткова законапраект пакуль не прыняты. Як і не зразумела, ці гагодзяцца беларускія аператары страціць адначасова вялікую частку абанентаў, якія ўжо колькі гадоў карыстаюцца «шэрымі» апаратамі.

Чакаецца, што ў выпадку прыняцця законапраекта будзе створана рэспубліканская база асабістых ідэнтыфікацыйных нумароў сотавых тэлефонаў (IMEI-кодаў). Доступ да базы будуць мець усе беларускія мабільныя аператары. Калі тэлефона не будзе ў базе, SIM-карты беларускіх аператараў проста не будуць у ім працаваць. «Кампанія Velcom паспрабуе — і, думаем, гэта будзе зроблена — не закрануць усіх ужо наяўных абанентаў — мы мяркуем, што іх тэлефоны будуць легалізаваныя аўтаматычна і апаратамі можна будзе працягваць карыстацца», — гэту пазіцыю на прэс-канферэнцыі, прысвечанай 10-годдзю аднаго з вядучых айчынных аператараў, агучыў намеснік генеральнага дырэктара па продажы і абаненцкім абслугоўванні Роберт Дашан. Ён адзначыў, што аператары часткова ўплываюць на працэс распрацоўкі законапраекта, але ўсе папярэднія высновы можна рабіць толькі тэарэтычна — нарматыўнага акта пакуль няма, і нельга выключыць магчымасці, што ён увогуле не будзе прыняты.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Незалежная экспертыза Леаніда Заікі

СУСВЕТНЫ БАНК АБ СУСВЕТНЫХ ПЕРСПЕКТЫВАХ

Нядаўна, а дакладней напрыканцы сакавіка, Сусветны банк распаўсюдзіў удакладнены прагноз пад банальнай, але сёння з-за крызісу інтрыгуючай назвай: «Перспектывы развіцця сусветнай эканомікі - 2009 год». Яго асобныя палажэнні і высновы наш карэспандэнт абмяркоўвае з вядомым беларускім эканамістам, кіраўніком аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Л.Ф. Заікам.

— Чаму ўзнікла нагода перагледзець ужо зроблены летась глабальны прагноз? Што гэта за дакументы і хто іх рыхтуе?

— Рабіць прагнозы — шматгадовая і руцінная практыка ў дзейнасці Сусветнага банка. Амаль тысяча, калі не памыляюся, яго супрацоўнікаў — інтэрнацыянальная каманда класных эканамістаў з усіх кантынентаў шляхам вывучэння эканамічнай справаздачнасці больш чым 170 краін спрабуе больш-менш дакладна зазірнуць у эканамічную будучыню планеты. Часта гэта атрымоўваецца, а часам не зусім. Вось і з першым асноўным прагнозам на 2009 год выйшла недарэчнасць: на фоне пашырэння глабальнай рэцэсіі ён аказаўся, мяркуючы, не вельмі рэалістычным, не адпавядаў ходу развіцця падзей. Таму і давялося тэрмінова ўносіць карэктывы. А як інакш, калі ў нашай роднай Еўропе індэкс спажывецкіх чаканняў (ёсць такі паказчык) стаў на ўзроўні 1985 года.

Дарэчы, у 50-х гадах мінулага стагоддзя многія слынныя эканамісты, у тым ліку і з Сусветнага банка, аўтарытэтна прагназавалі бурны рост і небывалы дабрабыт краінам Лацінскай Амерыкі, нават прадказвалі ім ролю лакаматыва сусветнай эканомікі. Азіі, наадварот, адводзілі месца аўтсайдара эканамічнага развіцця, якая з-за велізарнага насельніцтва, іншых аб'ектыўных прычын будзе паступова стагнірааць і паглыбляцца ў балота застою. А на практыцы выйшла ўсё наадварот.

— І з чым быў звязаны гэты глабальны «пракол»?

— З тым, што чалавеку ўласціва памыляцца. Нават з выдатнай эканамічнай адукацыяй, багатым вопытам і зайздроснымі аналітычнымі здольнасцямі. З іншага боку, цяжка не пагадзіцца з аўтарамі новай рэдакцыі прагнозу, якія справядліва пішуць: тое, што паўгода таму пачалося ўсяго як маштабны адток пазыковых сродкаў з фінансавых рынкаў, даволі хутка абярнулася адным з найвастрэйшых глабальных эканамічных спадаў у гісторыі чалавецтва. Па меры вяртання буйнымі інвестарамі дамоў сваіх замежных актываў і ўзмацнення жорсткасці ўмоў крэдытавання паўсюдна ў свеце давялося згортваць вытворчасць і адкладаць рэалізацыю інвестыцыйных планаў. У выніку мы сталі сведкамі беспрэцэдэнтнай страты сродкаў і хуткіх негатыўных перамен на рынках працы. Таму многія спажыўцы, у тым ліку і ў нашай краіне, пачалі абмяжоўваць выдаткі, асабліва на тавары доўгага карыстання. Адчуваюце планетарны маштаб гэтай новай з'явы? І не дзіўна, што яе спачатку недаацанілі.

— Якімі бачацца сёлетнія далягляды сусветнай эканомікі карыфеям (кажу без іроніі) Сусветнага банка?

— Даволі змрочны тэкст падрыхтавалі яго эксперты. 2009 год будзе годам рэцэсіі. Вось некаторыя вытрымкі. Чакаецца, што сёлета сусветны валавы ўнутраны прадукт (ВУП) скароцціцца на 1,7 %, а аб'ёмы сусветнага гандлю таварамі і паслугамі знізяцца на 6,1 %. Пры гэтым адбудзецца рэзкае скарачэнне аб'ёмаў гандлю гатовай прадукцыяй. Цэны на нафту на працягу года складуць у сярэднім $47 за барэль, таксама прагназуецца падзенне прыкладна на 30 % цэнаў на тавары не нафтавай групы.

Усе краіны — багатыя і небагатыя, у той ці іншай ступені сутыкнуцца з істотным пагаршэннем свайго падаткова-бюджэтнага балансу, асабліва ў Еўропе і Цэнтральнай Азіі, дзе ўжо назіраецца значнае скарачэнне міжнароднага гандлю і вытворчасці. Гэтыя краіны больш за іншых пацярпелі ад крызісу: чакаецца, што сёлета іх ВУП скароціцца на 2 %, тады як у 2008 годзе рост склаў 4,2 %. Там больш усяго адчуюць і недахоп фінансавых сродкаў, асабліва гэта датычыцца краін, якія актыўна карысталіся замежным капіталам для ўнутранага крэдытавання. Таксама ва ўмовах ціску на расійскі рубель узрасце фінансавая напружанасць у экспарцэраў нафты. Трэба памятаць, што многія краіны ўвайшлі ў глабальны фінансавы крызіс з вялікім дэфіцытам бягучых балансаў, якія перавышаюць 10 % ВУП. А гэта робіць іх асабліва адкрытымі і неабароненымі. Без буйнамаштабнай міжнароднай дапамогі некаторыя краіны рэгіёна могуць сутыкнуцца з яшчэ больш рэзкім спадам, чым той, які адзначаецца ў новым прагнозе.

> **«наспеў час адмовіцца ад долара як сусветнай валюты, ад паслуг амерыканскіх эканамістаў і амерыканцаў як кіраўнікоў міжнародных фінансавых арганізацый.**

— Што сёлета чакае багатыя краіны?

— Краіны з высокім узроўнем даходаў, згодна з гэтым прагнозам, паступова ўвойдуць у глыбокую рэцэсію. Там яшчэ да сярэдзіны 2008 года падзенне ўнутранага попыту часткова кампенсавалася ўстойлівым ростам экспарту капіталу і высокатэхналагічнай прадукцыі. Цяпер сітуацыя змянілася на супрацьлеглую — падзенне гандлю высокапрыбытковымі экспартнымі таварамі справакавала скарачэнне ўнутранага попыту. Краіны, якія спецыялізуюцца на вытворчасці сродкаў вытворчасці, у тым ліку Японія, Германія, Кітай і Злучаныя Штаты, пацярпелі ў найбольшай ступені. Асабліва рэзкі спад адзначаецца ў Азіі. Напрыклад, аб'ём экспарту тавараў з Японіі скараціўся ў студзені на 40 % у параўнанні з папярэднім годам. Экспарт Кітая ўпаў на 30 %, Сінгапура — 25 %.

— Але бедныя і сярэднія па ўзроўні жыцця краіны, як заўсёды, апынуцца ў яшчэ горшым становішчы. Ці так?

— Так. Фінансавы крызіс з усёй сілай ударыў па краінах, якія развіваюцца. І ў асноўным з-за падзення, а ў некаторых выпадках абвалу цэнаў на сыравінныя тавары. І гэта зразумела, бо цэны на сыравіну за апошнія 20 гадоў часта і неапраўдана ўзніваліся. Бо калі нафта раптам патаннела ў тры разы, то гэта аб нечым гаворыць. Але згодна з новым прагнозам, запаволенне эканамічнага росту ў краінах з нізкім і сярэднім узроўнем даходаў у цэлым будзе супастаўным з наступствамі ў багатых краінах. Такое вельмі сінхроннае зніжэнне сведчыць пра тое, што фінансавы крызіс робіць негатыўны ўплыў на эканоміку ўсіх без выключэння краін.

Рэгіёнамі з найбольшым дэфіцытам фінансавання будуць краіны Лацінскай Амерыкі і Афрыкі да поўдня ад Сахары. Паводле перспектыўных ацэнак, 84 з 109 краін, якія развіваюцца, сёлета сутыкнуцца з дэфіцытам фінансавання, у большасці выпадкаў занадта вялікім, каб яго можна было закрыць за лік аднаго толькі выкарыстання рэзерваў. Гэта дазваляе выказаць меркаванне, што пры адсутнасці дастатковай міжнароднай падтрымкі гэтыя краіны будуць вымушаны звярнуцца да сур'ёзнага перагляду сваіх бягучых плацежных балансаў, што азначае наступнае зніжэнне ўнутранага попыту і імпарту.

— Леанід Фёдаравіч, сёння часта можна пачуць крытычныя заўвагі наконт таго, што ў Сусветным банку і ў Міжнародным валютным фондзе на першых ролях зашмат прадстаўнікоў Злучаных Штатаў — краіны, якая «падарыла» ўсім нам цяперашні глабальны крызіс. А вас асабіста не засмучае гэты факт?

— Дарэчы, у Сусветным банку некаторыя эканамісты загадзя прадказвалі крызіс, называлі яго прычыны, але ў гэтых сумленных і кваліфікаваных спецыялістаў, як, між іншым, і ў самога банка, няма эфектыўных інструментаў уздзеяння на амерыканцаў. На жаль, у Сусветным банку вельмі мала працуе еўрапейцаў. Затое амерыканцы там не толькі пакідаюць апошняе слова за сабой, але і не забываюць заахвочваць сябе, напрыклад, вылучаюць сваіх суайчыннікаў на Нобелеўскія прэміі. Увогуле наспеў час адмовіцца ад долара як сусветнай валюты, ад паслуг амерыканскіх эканамістаў і амерыканцаў як кіраўнікоў міжнародных фінансавых арганізацый.

— Кажуць, што ўвогуле прагнозы — справа няўдзячная, што ім не вельмі трэба давяраць. І тым не менш амаль усе мы прагна ловім прагнозы наконт верагодных ваганняў валютных курсаў, росту цэнаў на жыллё, спажывецкія тавары, паслугі г. д. Карацей, людзі хочуць ведаць...

— Я сказаў бы больш: людзі маюць права і абавязаны ведаць пра тое, што думаюць і прагназуюць эканамісты-прафесіяналы як у сваёй краіне, так і ў міжнародных арганізацыях. Бо гэта напрамую закранае іх жыццё. Безумоўна, прагнозы маюць уласцівасць не заўсёды збывацца, але, на мой погляд, яны ўсё ж карысныя і ва ўмовах глабалізацыі эканомікі ўвогуле неабходныя. І важна навучыцца рабіць іх своечасова і дакладна. Што датычыцца Сусветнага банка, то мы можам і павінны разлічваць не толькі на яго кваліфікаваныя прагнозы, але і на большую практычную дапамогу эканомікам канкрэтных краін. Уплыў і аўтарытэт гэтай міжнароднай фінансавай структуры, і тыя дадатковыя трыльёны долараў, якія будуць неўзабаве накіраваны ў яе авуары згодна з рашэннем антыкрызіснага саміту Вялікай дваццаткі ў Лондане, робяць гэта рэальнай справай.

— І калі ж Сусветны банк прадказвае хоць бы пачатак выхаду з крызісу?

— Сёння працягваюцца вострыя спрэчкі аб верагоднай даце ажыўлення дзелавой актыўнасці ў свеце. Аднак мала хто можа дакладна яе назваць. Таму, паводле вельмі асцярожных прагнозаў экспертаў банка, умеранае аднаўленне эканомікі магчыма ў лепшым выпадку ў 2010 годзе — эканамічны рост можа скласці прыкладна 2 %. Але эксперты робяць важную агаворку: захаванне вялікіх праблем у банкаўскім сектары і новая хваля напружанасці на фінансавых рынках могуць прывесці да стагнацыі сусветнага ВУП і нават яшчэ да аднаго года эканамічнага спаду.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Парламенцкі дзённік

ПРАБУКСОЎКА ПА-ЗАКАНАДАЎЧАМУ

Народныя абраннікі азнаёміліся з работай транспартнага сектара

Лёс не надзяліў Беларусь багаццем прыродных рэсурсаў, затое даў ёй адзін вельмі важны бонус — удалае геаграфічнае становішча. А роля «пераправы» паміж усходам і захадам, пагадзіцеся, дарагога каштуе. Пры ўмове развітой транспартнай інфраструктуры і належнага заканадаўчага афармлення, зразумела. Транспартнае пытанне для транзітнай краіны ўсё ж адно з ключавых. І адшукаць, у чым мы прабуксоўваем у гэтым напрамку, спрабавалі заканадаўцы падчас нядаўняга выязнога пасяджэння ў Мінску і сталічнай вобласці. Журналісты, як водзіцца, селі ім на хвост...

Пакуль адна група наведвала аўтавакзал і аэрапорт, другая — на чале са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Уладзімірам Андрэйчанкам — выправілася па маршруце «Мінск — Фаніпаль — Калядзічы — Мінск». Заканадаўцы часу не гублялі — паглыбіліся ў дарожныя праблемы яшчэ ў дарозе: своеасаблівы экскурс для іх зрабіў Рыгор Шульга, намеснік дырэктара дэпартамента «Белаўтадар». Ён звярнуў увагу дэпутатаў на тое, што сёння стаіць задача не палепшыць, а захаваць існуючую сетку дарог. «Мы змушаныя скарачаць тыя выдаткі на ўтрыманне дарог, што не ўплываюць на бяспеку руху». Спадар Шульга таксама нагадаў пра заторы на Мінскай кальцавой аўтадарозе: «Пытанне пра другое кальцо, я думаю, хутка наспее. Наш праектны інстытут пэўныя напрацоўкі вядзе». Не засталася без увагі і галоўная дарога краіны, якую называюць алімпійскай: будавалася яна якраз да маскоўскай Алімпіяды. Дарога М1/Е30 (Брэст — Мінск — мяжа РФ) яшчэ і адзіная платная ў краіне. Аднак паводле слоў спадара Шульгі, аплата пакрывае толькі 30 працэнтаў сумы, патрэбнай на яе ўтрыманне.

На выездзе дэпутаты даведваліся не толькі пра гісторыю ўтварэння, вытворчыя магчымасці прадпрыемстваў, але і іх вопыт работы ў адпаведным прававым полі. Як выказаўся спадар Андрэйчанка, семінар скіраваны на тое, каб атрымаць «падказкі» ад гаспадарнікаў — якія існуюць прабелы ў дзейным заканадаўстве, што варта падкарэктаваць: «Ад нас патрабуецца зацікаўленасць, дапытлівасць, ад іх — падказка». Інфармацыі дэпутаты атрымалі і сапраўды многа.

У Фаніпалі народныя абраннікі азнаёміліся з работай двух філіялаў прадпрыемства «Дарбудіндустрыя» — Завода жалезабетонных маставых канструкцый і Доследна-механічнага завода. Парламентарыям прадэманстравалі таксама ўзоры дарожнай тэхнікі, пазнаёміліся з імі вопытам у вытворчасці і выпрабаванні тросавых агароджаў, якія перасцерагаюць ад лабавога сутыкнення аўто — ледзь не самага небяспечнага віду ДТЗ. Такія прылады перашкаджаюць выезду машыны на сустрэчную паласу, амартызуюць удар.

Пра работу транспартна-лагістычнага цэнтра парламентарыі атрымалі ўяўленне ў Калядзічах. Гендырэктар «Белмагістральаўтатранс» расказаў пра спецыфіку работы кампаніі. Апроч грузаперавозак, транспартнай экспедыцыі, тэрмінальна-лагістычных паслуг тут прапануецца таксама тэхнічны сэрвіс для аўтаперавозчыкаў. Гэта стала магчымым у выніку заключанага пагаднення з Volvo і адкрыцця спецыялізаванай станцыі.

Кампанія выконвае аўтаперавозкі грузаў у любы рэгіён ад Партугаліі да аддаленых абласцей Расіі і Казахстана. Вядуцца перавозкі зборных грузавых адправак на кірунку Літва — Беларусь і ўнутры краіны. Пад экспедыцыйным кантролем прадпрыемства працуе каля 200 аўтамабіляў, ва ўласным парку — 70 машын, аснашчаных мабільнай сувяззю, іх месцазнаходжанне кантралюецца спадарожнікавай сістэмай. Ёсць тут і складскія памяшканні, пункт узважвання, зала мытнага афармлення (дарэчы, тут можна размытняць легкавыя аўто). «Наша задача — зацягнуць на сябе грузы з ЕС», — падкрэсліў, звяртаючыся да дэпутатаў, гендырэктар кампаніі Мікалай Горбель. Аднак Беларусь пакуль не можа пахваліцца такімі ж выгаднымі ўмовамі, як у суседак. Айчынныя цэны неканкурэнтаздольныя ў параўнанні з польскімі, а прававы механізм не дае тых пераваг, што можа прапанаваць літоўскі бок.

«Наша задача — забяспечыць развіццё лагістычнай сістэмы на заканадаўчым узроўні», — падкрэсліў у гутарцы з журналістамі Сяргей Сямашка, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве. Аднак адсутнасць законаў не павінна ўплываць на бізнэс — упэўнены палітык. «Калі нехта хоча і сёння, ва ўмовах крызісу, атрымліваць прыбытак, утрымліваць калектыў, то ён знаходзіць спосабы». На думку Сяргея Аляксандравіча, патрэба ў лагістычных цэнтрах павінна выходзіць з таго, колькі будзе вазіцца грузаў — «проста ствараць лагістычныя цэнтры і не забяспечваць іх грузамі, перавозчыкамі нельга: кожны лагістычны цэнтр павінен зарабляць нешта».

Пастановай Урада летась была зацверджана Праграма развіцця лагістычнай сістэмы да 2015 года. Яна прадугледжвае стварэнне транспартна-лагістычных цэнтраў у Мінску, Брэсце, Віцебску, Гомелі, Гродне, Магілёве, Баранавічах, Бабруйску, Барысаве, Жлобіне, Мазыры, Оршы, Пінску. У нашай краіне і сёння дзейнічаюць асобныя льготы і прэферэнцыі, якія могуць быць выкарыстаныя для развіцця гэтага сектара. Да таго ж, праграмай прадугледжана распрацоўка ўказа аб лагістычнай дзейнасці, паводле якога ўмовы гаспадарання для тых, хто ўкладвае інвестыцыі ў транспартна-лагістычныя цэнтры, будуць набліжаныя да ўмоў, у якіх працуюць рэзідэнты СЭЗ.

На Цэнтральным чыгуначным вакзале народныя абраннікі асабіста «праінспектавалі» новенькія і самыя сучасныя пасажырскія вагоны, даведаліся пра тое, якім чынам забяспечваецца захаванасць змесціва грузавых вагонаў. Пабывалі дэпутаты і ў vip-зале, прызначанай для арганізаваных дэлегацый, — салідныя прадпрыемствы могуць дазволіць сабе сустракаць тут сваіх дзелавых партнёраў, праводзіць перамовы.

Дэпутаты ставілі перад кампетэнтнымі асобамі ў транспартнай сферы і актуальныя побытавыя пытанні — пра адсутнасць безбар'ернага асяроддзя, адвечныя беды з маршруткамі, абуладкаванне пунктаў прыпынку. Сапраўды, іх задача ў тым, каб разгледзець у прыватным агульнае, у выпадку — тэндэнцыю, і змяніць нейкія правілы гульні на прававым полі.

А як, дарэчы, выглядае заканадаўчая база ў транспартным сектары, што трэба адрэгуляваць у першую чаргу? У гутаркі з журналістамі Уладзімір Андрэйчанка ахарактарызаваў яе як мноства раз'яднаных нарматыўных прававых актаў. «Іх, вядома, трэба звесці ў адзін кодэкс». На думку спікера, дакумент можа быць падрыхтаваны на працягу наступных некалькіх гадоў. «У нас на сёння не ўрэгуляваныя прававаносіны ў сферы гарадскога пасажырскага транспарту. Мы лічым, што вельмі вялікая ніша для развіцця эканомікі нашай краіны — гэта стварэнне транспартна-лагістычных цэнтраў. На гэты конт

Нефармат

СМЕШНЫ ШАКАЛАД

Ёсць шакалад горкі, дэсертны, малочны, ванільны, класічны, нават «Генеральскі» прадаваўся да і пасля Дня абаронцаў Айчыны, летась у гэты час быў «Гвардзейскі». «Смешнага» на прылаўках не сустракала, гэта я сама прыдумала. Чаму? Зразумееш пазней, шаноўны чытач.

Падобна на тое, што ў эпоху развітога крызісу многім хочацца як-небудзь падсаладзіць сваё жыццё. Хоць рэальна, хоць віртуальна. Першымі гэта адчулі, як і належыць, вытворцы харчовых тавараў. Вось і брэсцкія прадпрыемствы вызначыліся. Кандытары хлебазавода пастараліся здзівіць пакупніка шакаладнымі яйкамі да Вялікадня.

А Кобрынскі мясакамбінат пайшоў нашмат далей — выпусціў каўбасу з шакаладам. Трэба аддаць належнае спецыялістам мясаперапрацоўчага завода: ідэя, хоць і падгледжаная на Захадзе, у новым увасабленні сталася проста цудоўнай. Бо, вядомая справа, не столькі тут тае каўбасы, колькі рэкламы. І задумка спрацавала на ўсе сто. Пра гэты незвычайны прадукт не пратрубілі хіба толькі зусім лянівыя сродкі інфармацыі. А для прадпрыемства рэкламная акцыя абышлася фактычна бясплатна, за сенсацыю ж ніхто грошай не пытае.

Справа зроблена, каўбаса сышла з канвеера. Хоць спалучэнне прадуктаў для нашага чалавека больш чым спецыфічнае, але ж з цікаўнасці, відавочна, многія пакаштуюць.

Калі аўтар гэтых радкоў першы раз пачула пра кобрынскае ноу-хау, што называецца, з першых вуснаў, то сказала, што адважылася б з'есці такі далікатэс хіба толькі пасля сёмай чаркі віскі. Але гэты абарот быў ужыты, так бы мовіць, для ўзмацнення экспрэсіі. Бо, па-першае, я столькі не п'ю, а па-другое, калі ў краме сустрэну тую каўбасу, то куплю кавалак, бо, вядома ж, цікава. А за ўмелае абуджэнне дапытлівасці спажыўца вытворцы заслугоўваюць «пяцёрку» па пяцібальнай сістэме. Відавочна, што за апошні час на парадак вырас узровень рэкламна-маркетынгавай службы камбіната. І па мясцовым радыё больш не выходзіць іх гукавы кліп: «Перадаём сігналы дакладнага часу, бо не можам перадаць смак нашай каўбасы». Гэты пасаж нічога, акрамя смеху, не выклікаў. Тут жа маем самы дзейсны від рэкламы: рэклама таварам амаль як разведка боем.

Ды ўсё апісанае — кветачкі ў параўнанні з тым, да чаго дадумаліся замежныя вытворцы. Правільней сказаць, вытворцы падхапілі тое, што выдумаў гарвардскі прафесар. А выдумаў ён віртуальны шакалад, гэткую фальшыўку з водарам самага любімага многімі ласунку. Зроблены інгалятар памерам з губную памаду. Пырснеш на язык — і ў роце з'явіцца смак шакаладкі. На паток пастаўлены выпуск інгалятараў з водарам мяты, арэха, маліны і смакам шакаладу. Аўтар распрацоўкі ў шматлікіх інтэрв'ю замежным калегам расказаў, што ў Старым і Новым свеце прыкметныя тэндэнцыі да скарачэння колькасці ўжыванай ежы. Усе імкнуцца худзець, кантраляваць вагу, таму ядуць маленькімі порцыямі і часта. А тут як знаходка: «пшыкнуў» у рот і падмануў арганізм. У віртуальнай шакаладцы зусім няма калорый, але яна здольная ствараць ілюзію прадукта. Прафесар мае намер ісці далей і вырабіць падобныя інгалятары з «супам», «смажанай курыцай» — поўным абедам, каб як у той казцы: па вусах цякло, а ў рот не трапіла. Толькі ў рот тут трапляе, а вось у страўнік — нуль. Для тых, хто не супраць захварэць на анарэксію, яшчэ тое харчаванне.

Каштуе шакаладны інгалятар, як паведамляецца, каля двух еўра. Пакупнікоў колькі хочаш, навінку замовілі гандлёвыя фірмы Амерыкі, Еўропы, Японіі. Не ведаю, як хто, а па мне за гэтыя грошы можна набыць дзве стограмовыя айчынныя горкія шакаладкі — яшчэ і дзве маленькія выйдуць — і атрымаць сапраўдную асалоду. Мой участковы тэрапеўт кажа, што ад горкага шакаладу не патаўсцееш, калі есці ў меру, а арганізму ад яго толькі карысць. Чаму ж не паслухацца добрай парады, калі яна падмацавана медыцынскімі даследаваннямі і не пярэчыць тваім уяўленням пра радасці жыцця? А віртуальны шакалад — нешта з разраду камп'ютарнага сэксу альбо пралесак ранняй вясной на старой паштоўцы. На малюнак першацветаў добра глядзець зімой у завею. А растане снег, пацяплее, і пакуль не ўбачыш жывую прыгажосць кветак, не ўдыхнеш іх свежы водар, то і вясну не адчуеш.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Здароўе на талерцы

ВЕСНАВЫ СТОЛ

Чым адолець агульную слабасць, нізкую працаздольнасць, вяласць і санлівасць? Як змагацца з лішнімі кілаграмамі, набранымі за зіму? Толькі не дарагімі медыкаментознымі прэпаратамі і завознымі экзатычнымі пладамі! Дыетолагі раяць у гэтых выпадках налягаць на свежую агародніну, характэрную для нашых шыротаў. Бо менавіта яна прывычная нашаму арганізму і здольная забяспечыць яго большасцю пажыўных рэчываў, неабходных для нармальнай жыццядзейнасці. Тым больш што агародніннымі прылаўкі ўжо «зелянеюць» пахкай пятрушкай і кропам, «ружавеюць» сакавітай радыскай...

Давайце бліжэй пазнаёмімся з кожным прадстаўніком веснавой вітаміннай браці. Пачнём з зяленіва — **салаты**. Яна — лёгкая, нізкакаларыйная і карысная. Салатнае лісце багатае на вітаміны групы В, РР, Е, каратін, а па колькасці аскарбінавай кіслаты яно амаль не саступае яблыкам. Дзякуючы наяўнасці ёду, жалеза, марганцу, медзі, малібдэну, салата садзейнічае паляпшэнню складу крыві і ўмацаванню сценак крывяносных сасудаў. Менавіта ў гэтай расліне ўпершыню была выяўлена фоліевая кіслата, якая таксама ўдзельнічае ў крывятварэнні, папярэджвае адкладанне тлушчу ў печані, служыць для прафілактыкі атэрасклерозу. Таму чым больш вы парэжаце гэтага ўнікальнага зяленіва ў салату, тым лепш.

Цяпер некалькі слоў пра **пятрушку**. Згодна з народнай мудрасцю, пучок зяленіва пятрушкі роўны жменьцы золата. У яе лісці ўтрымліваецца да 1—3% цукру і да 4,5% сырога бялку. Акрамя таго, пятрушка — вітамінаносная расліна. У ёй канцэнтруецца вялікая колькасць аскарбінавай кіслаты і караціну. Яна карысная людзям, якія пакутуюць ад мочакаменнай хваробы, запаленчых захворванняў дзяснаў і слізістай рота. Пятрушка таксама змяшчае інсулін, які рэгулюе абмен глюкозы ў крыві.

Яе сусед **кроп** не адстае ад сваёй сяброўкі. Акрамя ўсё тых жа аскарбінкі і караціну, кроп багаты на фоліевую, нікацінавую кіслоты, солі калію, кальцыю, фосфару, жалеза. Такі цудоўны хімічны склад дапамагае кропу эфектыўна рэгуляваць работу страўнікава-кішачнага тракта, паніжаць ціск і дабратворна ўплываць на сардэчную дзейнасць, палягчаць сімптомы цыстыту і нырачных захворванняў. А яшчэ зяленіва кропу валодае жаўцягонным эфектам, здымае галаўны боль і лёгка спраўляецца з бяссонніцай.

Радыска — самая папулярная сярод першых караняплодаў. Яна паспявае раней за ўсіх і ўпрыгожвае стол бела-ружовымі галоўкамі. Гарчычныя эфірныя алеі, якія ўтрымліваюцца ў караняплодах і лісці, з'яўляюцца антысептыкамі і падаўляюць рост хваробатворных бактэрый. Акрамя таго, гэтыя алеі надаюць радыскі пікантны, крыху гаркаваты смак і вастрыню, што садзейнічае ўзбуджэнню апетыту, стымулюе выдзяленне страўнікавага соку і актывізуе стрававanne. Таму радыска абавязкова павінна прысутнічаць на вашым стале хоць бы ў выглядзе вось такой салаты: 100 г тварагу разатрыце са смятанай (кефірам, ёгуртам без цукру) да аднароднага стану. Радыску, пятрушку, салату дробна пасячыце, змяшайце з тварагом і пасаліце. Такую салату можна есці асобна, а можна намазваць на тонкія лустачкі падсушанага чорнага хлеба.

Бясспрэчна, каралевай сярод веснавых «пастаўшчыкоў» вітамінаў з'яўляецца **зялёная цыбуля**. Вучоныя падлічылі, што аптымальнай дозай спажывання цыбулі для чалавека будзе 7—10 кілаграмаў у год. Яшчэ старажытныя ўрачы сцвярджалі, што няма ніводнай хваробы, пры якой цыбуля не прынесла б хвораму палёгкі. Цыбуля ўмацоўвае страўнік, узбуджае апетыт, дапамагае ад ангіны і бранхіту, садзейнічае зніжэнню ўзроўню цукру і халестэрыну ў крыві. Але пры вострых захворваннях нырак, печані, страўніка яе трэба ўжываць з асцярожнасцю.

Ну, а «каралём зяленіва» называюць **шпінат**. Акрамя звычайных для кожнай расліны бялкоў, тлушчаў, клятчаткі, арганічных кіслот, ён утрымлівае флаваноіды і багаты, збалансаваны самой прыродай, вітамінна-мінеральны комплекс, у які ўваходзяць правітамін А, вітаміны Е, B_1, B_2, Р, К, D_2, злучэнні ёду, жалеза, магнію, фосфару, фтору, цынку. Шпінат карысны пры вялым кішэчніку, метэарызме, нервовым знясіленні, цукровым дыябеце і гіпертаніі, для прафілактыкі рахіту ў дзяцей, аднак ён не рэкамендуецца для тых, хто пакутуе ад моча-, жоўцекамянёвай хваробаў і падагры.

Каляровае пюрэ (спецыяльна для дзяцей)

Прыгатуйце звычайнае бульбяное пюрэ. Падзяліце яго на тры часткі. Адну афарбуйце, змешваючы з сокам шпінату, у зялёны колер, другую — з сокам буракоў — у чырвоны колер. На талеркі выкладвайце пюрэ, чаргуючы колеры так, як вам падабаецца. Зверху страву паліце растопленым сметанковым маслам і падайце на стол.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Велікодныя святы працягваюцца! Тыдзень так і называецца — Велікодны, таму гатуем не зусім звычныя стравы. Радуйцеся, святкуйце і любіце бліжняга свайго. І ў гэтым сапраўднае шчасце. Хрыстос уваскрэс!

ВЕЛІКОДНЫ КОМ ПА-СЛАВАЦКУ

Нам спатрэбіцца: 1 л малака, 15 яек, молаты чорны і духмяны перац, соль.

Да размешаных у малацэ яек дадаць крыху молатага перцу і солі. Давесці да кіпення і варыць, памешваючы, пакуль яйкі ў малацэ не звернуцца. Зняць з агню, працадзіць праз палатняную сурвэтку. Звязаць вуглы сурвэткі і пакінуць у падвешаным стане, каб сцякла вадкасць. Гатовы сыр, які астыў, нарэзаць лустачкамі і падаць з цёртым хрэнам і хлебам.

ЗАЛІЎНОЕ «ЯЙКІ ФАБЕРЖЭ»

Вазьміце: 10 яечных шкарлупін, 20 г жалаціну, 1,5—2 шклянкі булёну, 150—200 г вяндліны, паўшклянкі кансерваванай кукурузы або зялёнага гарошку, 1—2 балгарскія перцы, зелень пятрушкі.

Зварыць курыны булён (булён пасаліць). Жэлацін замачыць у ахаладжаным булёне і пакінуць для набухання на 1—2 гадзіны. Калі жэлацін набухне, паставіць яго на пліту і награваць, пакуль ён поўнасцю не растворыцца (не даводзіць да кіпення). Цяпер падрыхтуем яечныя шкарлупіны. Для гэтага яйкі трэба вымыць і выцерці насуха. З тупога канца яйка зрабіць невялікую адтуліну пры дапамозе нажа і расшырыць адтуліну да 1,5—2 см. Бялок і жаўток выліць, іх можна выкарыстоўваць для прыгатавання іншых страў. Пустую яечную шкарлупіну добра прамыць у мыльна-содавым растворы і старанна прапаласкаць праточнай вадой. Падрыхтаваную вымытую і прасушаную яечную шкарлупіну для зручнасці можна паставіць у форму для яек.

Вяндліну парэзаць кубікамі. З зялёнага гарошку або кукурузы зліць вадкасць. Балгарскі перац парэзаць кубікамі (атрымаецца прыгажэй, калі ўзяць перцы розных колераў). На дно пустой яечнай шкарлупіны пакласці кавалачкі балгарскага перцу і лісцікі зяленіва. Зверху пакласці, чаргуючы, вяндліну, кукурузу, перац і лісцікі зяленіва — такім чынам запоўніць усю свабодную прастору яечнай шкарлупіны да верху і заліць булёнам з разведзеным у ім жэлацінам. Паставіць яйкі ў прахалоднае месца і трымаць, пакуль не загусне. Перад падачай на стол яйкі ачысціць ад шкарлупін (як звычайнае варанае яйка) і выкласці заліўное на вялікую талерку.

Безумоўна, з гэтай стравай давядзецца павазіцца, але атрымаецца вельмі прыгожа і смачна. Так можна рабіць і жэле з садавіны.

МЯСА ПА-КУПЕЦКУ

Нам спатрэбіцца: 500 г ялавічыны, 4—5 сталовых лыжак смятаны, 100—150 г сыру, соль, перац на смак.

Ялавічыну нарэзаць кавалкамі, добра адбіць, пасаліць, папярчыць. Сыр нацерці на буйной тарцы. Выкласці адбітыя кавалкі мяса на змазаную маслам бляху або ў форму для запякання і абмазаць смятанай. Зверху пасыпаць мяса цёртым сырам. Запякаць у духоўцы пры тэмпературы 180 °С каля 25 хвілін.

СВІНІНА Ў ЦЕСЦЕ З КУРАГОЙ

Вазьміце: 3 сталовыя лыжкі аліўкавага алею, 200 г рэпчатай цыбулі, 1 сталовую лыжку белага віннага воцату, 150 мл белага сухога віна, 250 г курагі, соль, перац на смак, 1 сталовую лыжку зяленіва, 1,5 кг філе свініны, муку, 350 г гатовага слоенага цеста, 1 яйка, 300 мл курынага булёну.

На алеі абсмажце цыбулю на працягу 10 хвілін да мяккасці. Дадайце воцат і дайце яму закіпець, уліце ў патэльню віно, 150 мл вады і пакладзіце дробна нарэзаную курагу. Давядзіце да кіпення і тушыце 20 хвілін, пакуль вадкасць не выпарыцца. Пасаліце і папярчыце, дадайце зяленіва і адстаўце ўбок. Палову сумесі з курагой пакіньце для соусу. Разрэжце філе на 6 частак, пасыпце перцам. На алеі абсмажце мяса з усіх бакоў, каб яно зарумянілася, адстаўце ўбок. На прысыпаным мукой стале раскачайце пласт цеста таўшчынёй 3 мм, нарэжце квадратамі так, каб у іх можна было загарнуць кавалкі свініны. На цеста пакладзіце крыху сумесі з курагой і пачынайце заварочваць мяса, дадаючы курагу. Змачыце краі цеста і зляпіце ў выглядзе трубачкі, пакідаючы па баках краі адкрытымі. Змажце трубачкі ўзбітым яйкам, пасаліце. Ахаладзіце. Выкладзіце трубачкі на бляху і запякайце на працягу паўгадзіны пры высокай тэмпературы. Для соусу нам трэба астатнюю сумесь з курагой змяшаць з булёнам, давесці да кіпення і кіпяціць 5—10 хвілін. Соус падаць з запечанай свінінай.

ОАО «Минскоблхлебопродукт» извещает,

что внеочередное совместное общее собрание акционеров ОАО «Минскоблхлебопродукт» и членов СПК «Большие Новоселки» состоится **30 апреля 2009 года** по адресу: г. Борисов, ул. Труда, 41. Начало собрания в 14.00. Регистрация акционеров с 13.00. При себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О реорганизации ОАО «Минскоблхлебопродукт» путем присоединения к нему СПК «Большие Новоселки» и утверждении передаточного акта.
2. Об увеличении уставного фонда ОАО «Минскоблхлебопродукт», утверждении решения о дополнительном выпуске акций ОАО «Минскоблхлебопродукт» и их размещении в связи с присоединением к нему СПК «Большие Новоселки».
3. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Минскоблхлебопродукт».
4. О передаче имущества присоединенного СПК «Большие Новоселки» унитарному предприятию «Борисовский комбинат хлебопродуктов» ОАО «Минскоблхлебопродукт» и утверждении передаточного акта.

Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт»
Тел. 224 19 17.

В извещение о проведении открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды зданий, расположенных в д. Б. Тростенец Минского района, опубликованном в газете «Звязда» от 18.04.2009 г. **вносится изменение:**

Начальная цена права аренды с НДС – 22 319 097 бел. руб.

Тел: (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

г. ВИТЕБСК 29.04.2009

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже объектов государственной собственности с установлением начальной цены продажи каждого объекта равной одной базовой величине с одновременной продажей права заключения договоров аренды земельных участков

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи, рублей	Сумма задатка, рублей
		Месторасположение объектов: д. Зубревичи Оршанского района Витебской области		
4.	Сооружение № 1 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное, полуподземное, бетонное, кровля совмещенная, обвалованное землей, состояние неудовлетворительное, общей площадью 1010 кв. м. Земельный участок: площадью 0,8278 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000168, срок аренды земельного участка — 25 лет	239313	23931
5.	Сооружение (здание) № 2 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, с рулонным покрытием, состояние аварийное, общей площадью 1044,71 кв. м. Земельный участок: площадью 0,5989 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000172, срок аренды земельного участка — 25 лет	182759	18275
6.	Сооружение № 3 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное, полуподземное бетонное, кровля совмещенная, обвалованное землей, состояние неудовлетворительное, общей площадью 1506,07 кв. м. Земельный участок: площадью 0,7337 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000169, срок аренды земельного участка — 25 лет	215892	21589
7.	Здание казармы и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное, кирпичное, перекрытие деревянное, крыша совмещенная, шиферная, 2-скатная, состояние аварийное, общей площадью 420 кв. м. Земельный участок: площадью 0,2600 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000170, срок аренды земельного участка — 25 лет	99210	9921
8.	Здание казармы-столовой и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание 2-этажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, покрытие рулонное, состояние неудовлетворительное, общей площадью 666 кв. м. Земельный участок: площадью 0,1521 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000176, срок аренды земельного участка — 25 лет	72693	7269
9.	Здание спортзала и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное и г/с блоки, перекрытие деревянное, кровля шиферная, 2-скатная, состояние аварийное, общей площадью 270 кв. м. Земельный участок: земельный участок площадью 0,1958 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000175, срок аренды земельного участка — 25 лет	83418	8341
10.	Здание гаража-лаборатории и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, покрытие рулонное, кровля совмещенная, состояние неудовлетворительное, общей площадью 297 кв. м. Земельный участок: земельный участок площадью 0,1156 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000163, срок аренды земельного участка — 25 лет	63544	6354
11.	Здание гаража и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие деревянное, кровля деревянная, обрушена, состояние аварийное, общей площадью 676,18 кв. м. Земельный участок: площадью 0,1157 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000174, срок аренды земельного участка — 25 лет	63544	6354
12.	Здание котельной и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание 4-этажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, покрытие рулонное, состояние аварийное, общей площадью 228 кв. м. Земельный участок: площадью 0,1680 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000165, срок аренды земельного участка — 25 лет	76268	7626
13.	Здание овощехранилища и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, с рулонным покрытием, состояние неудовлетворительное, общей площадью 147 кв. м. Земельный участок: земельный участок площадью 0,2342 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000173, срок аренды земельного участка — 25 лет	92567	9256
14.	Здание-гараж 1 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, покрытие рулонное, состояние неудовлетворительное, общей площадью 504 кв. м. Земельный участок: площадью 0,2451 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000171, срок аренды земельного участка — 25 лет	95635	9563
15.	Здание-гараж 2 и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, покрытие рулонное, состояние неудовлетворительное, общей площадью 518 кв. м. Земельный участок: площадью 0,2128 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000164, срок аренды земельного участка — 25 лет	87472	8747
16.	Здание дизельной и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, перекрытие ж/б, кровля совмещенная, покрытие рулонное, состояние аварийное, общей площадью 158,49 кв. м. Земельный участок: площадью 0,1517 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000166, срок аренды земельного участка — 25 лет	72186	7218
17.	Здание боксов под автотехнику и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: здание одноэтажное, кирпичное, ж/б перекрытие, кровля совмещенная, рулонное покрытие, состояние неудовлетворительное, общей площадью 318 кв. м. Земельный участок: площадью 0,2648 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000167, срок аренды земельного участка — 25 лет	100224	10022
18.	Здание овощехранилища и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: одноэтажное, кирпичное заглубленное, обвалованное, перекрытие ж/б, полы бетонные, состояние аварийное, общей площадью 27,4 кв. м. Земельный участок: площадью 0,0433 га для обслуживания здания производственно-складского назначения, кадастровый номер 223681403601000162, срок аренды земельного участка — 25 лет	45697	4569

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон-факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА – Учреждение «База хранилище государственного страхового фонда документации Республики Беларусь», контактный телефон: (0216) 29-72-10.

АРЕНДОДАТЕЛЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА – Витебский областной исполнительный комитет.

1. Аукцион состоится 29 апреля 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.

2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 25.04.2009 до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 29.04.2009 с 14.00 до 14.45. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

3. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

4. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 дней со дня принятия Витебским облисполкомом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка; не позднее 12 дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить с Учреждением «База хранилище государственного страхового фонда документации Республики Беларусь» договор купли-продажи недвижимости, а с Оршанским райисполкомом – договор аренды земельного участка.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

6. Подробная информация об условиях участия в торгах и условиях продажи предметов аукциона опубликована ранее в газете «Рэспубліка» от 27.05.2008 № 95 (4518).

г. ВИТЕБСК 26.05.2009

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже объектов государственной собственности с одновременной продажей права заключения договора аренды земельного участка

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1.	Здания, сооружения, сети, расположенные по адресу: г. Витебск, ул. 1-я Заречная, 9, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объекта недвижимости: - капитальное строение инвентарный № 200/С-45423 (производственное здание) одноэтажное кирпичное, общая площадь 572,4 кв.м, объем 3233 куб.м, 1974 г. постройки, фундамент – бутобетонный, перекрытия – ж/б плиты, крыша – совмещенная, отопление – от собственной котельной, электроосвещение – скрытая проводка, водопровод – стальные трубы, канализация – чугунные трубы; котельная – 2003 г. постройки, фундамент – бутобетонный, перекрытия – ж/б плиты, кровля – совмещенная; два навеса; дымовая труба; асфальтобетонное покрытие – площадь 155 кв.м; площадка бетонная – площадь 73 кв.м; покрытие ж/б плиты – площадь 27 кв.м; - капитальное строение инвентарный № 200/С-45421 (бытовой корпус) одноэтажное кирпичное, общая площадь 108,9 кв.м, объем 474 куб.м 1990 г. постройки, фундамент – бутобетонный, перекрытия – ж/б плиты, крыша – совмещенная, отопление – от групповой котельной, электроосвещение – скрытая проводка, водопровод – стальные трубы, канализация – центральная; навес; уборная бетонная на 1 очко с бетонным выгребом; забор ж/б; забор сборный из ж/б плит; - капитальное строение инвентарный № 200/С-45422 (административно-хозяйственное здание) одноэтажное кирпичное, общая площадь 58,3 кв.м, объем 243 куб.м 1974 г. постройки, фундамент – бетонный, перекрытия – ж/б плиты, крыша – совмещенная, отопление, скрытая проводка; забор кирпичный на кирпичных столбах; ворота двустворные металлические; площадка бетонная – площадь 396 кв.м; асфальтное покрытие – площадь 83 кв.м; - капитальное строение инвентарный № 200/С-57450 (сооружение специализированное энергетики – наружная сеть теплоснабжения), стальная, протяженность – 75 м; - капитальное строение инвентарный № 200/С-57452 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения – канализационная сеть), протяженность выпуска – 6,15 м; - капитальное строение инвентарный № 200/С-57451 (сооружение специализированное энергетики – электрическая сеть), протяженность – 317 м; - капитальное строение инвентарный № 200/С-59928 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения – водопроводные сети (сталь), протяженность – 31,10 м; - капитальное строение инвентарный № 200/С-57454 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения – водопроводные сети (чугун), протяженность – 354,8 м. Земельный участок с кадастровым номером 240100000003000083, площадью 0,8958 га для содержания и обслуживания административно-производственных зданий, сроком аренды 99 лет. Использование – для содержания и обслуживания недвижимого имущества.	**514 370 072**	**51 437 007**

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон-факс в Витебске: (0212) 47-60-96, сайт www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ: – Строительное республиканское унитарное предприятие «Витебский домостроительный комбинат», контактные телефоны: (0212) 48-77-19, 48-77-22.

АРЕНДОДАТЕЛЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА: – Витебский городской исполнительный комитет.

Условие пользования земельным участком:

- заключение победителем аукциона с Витебским горисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения Витебского горисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;
- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

1. Аукцион состоится 26 мая 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами (резиденты РБ) – доверенность, выданная представителю юридического лица, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, заверенные нотариально; индивидуальными предпринимателями – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации; юридическими лицами (нерезиденты РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 25.05.2009 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 26.05.2009 с 14.00 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

5. **Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 дней со дня принятия решения горисполкомом о предоставлении земельного участка, внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; не позднее 12 дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

САКОВЩИНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ВОЛОЖИНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

Лот-1 — земельный участок в д. Саковщина, ул. Юбилейная, площадь участка 0,25 га, кадастровый номер участка 622086011101000279, начальная цена 2 500 000 белорусских рублей.

Лот-2 — земельный участок в д. Саковщина, ул. Набережная, площадь участка 0,25 га, кадастровый номер 622086011101000280, начальная цена 2 500 000 белорусских рублей.

Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание жилого дома. Имеется центральное водоснабжение, имеется в непосредственной близости природный газ. На расстоянии 300 м — река Западная Березина, на расстоянии 5 км — Налибокская пуща. Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к ним постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется в Главное управление МФ РБ по Минской области РБ, р/с 3604000000482 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600037249, назначение платежа 04901.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится 22 мая 2009 года в 11.00 по адресу: д. Саковщина, ул. Первомайская, дом 18, здание сельисполкома.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 19 мая (включительно) 2009 года до 17.00 по адресу: д. Саковщина, ул. Первомайская, 18, кабинет секретаря.

Контактный телефон (8 01772) 39 1 58
Минская область,
Воложинский район,
д. Саковщина, ул. Первомайская, 18.

Антыкрызісная эканоміка

У ВЯСКОВУЮ КРАМУ ЗАВЕЗЛІ ЯБЛЫКІ З ЭКВАДОРА. А ДЗЕ СВАЕ?

Зайшоў у краму, і маю ўвагу прыцягнула радыска… амерыканская. А на рынку прадаюць імпартную садавіну. Зразумела, калі спажыўцам прапаноўваюцца цытрусавыя, бананы, вінаград, але і яблыкі часта не свае.

У Брэсце на пасяджэнні аблвыканкама і апаратнай нарадзе кіраўніцкіх работнікаў вобласці якраз і было ўзнята пытанне забеспячэння насельніцтва Брэстчыны і гароднінай, і садавіной.

Успомнім, што за савецкім часам у гарадах былі спецыялізаваныя крамы, у якіх можна было круглы год купіць бульбу, буракі, квашаную капусту... І ўся прадукцыя была свая. Улічваючы, што гэтую нішу сёння актыўна займае прыватнік, вялікай патрэбы ў такіх крамах ужо няма — аддзелы крамаў і рынак павінны людзей забяспечыць гароднінай з фермерскіх і сельгаскааператыўных палёў.

А тут аказалася, што ва «Універсаме» ААТ «Кобрын-Сэрвіс» гандлююць польскімі салёнымі агуркамі і квашанай капустай. І нават у вясковых крамах прапаноўваюць імпартныя плады. Напрыклад, у в. Тэўлі Кобрынскага раёна завезлі яблыкі з Эквадора, а што датычыцца польскіх яблыкаў, то яны паўсюдна, як і садавіна з Малдовы, Галандыі, Бельгіі... Ды і бульбу можна ўбачыць з Егіпта і Ізраіля, як і радыску з той жа Галандыі.

На гэтыя факты і была звернута ўвага на пасяджэнні аблвыканкама. Завозяцца імпартныя яблыкі, і гэта пры тым, што побач з абласным цэнтрам знаходзяцца гаспадаркі «Астрамечава» і «Рассвет», якія таксама займаюцца і вытворчасцю садавіны — там закладзены вялікія сады. А чаму цяплічны камбінат «Бярэсце» не можа забяспечыць насельніцтва ўсім патрэбным і, галоўнае, па невысокай цане? Кошт тут адыгрывае важную ролю, бо калі на вітрыне ляжыць зялёная цыбуля па 12 тысяч за кг, то спажыўца яна асабліва не прыцягвае.

У прынцыпе, праблему садавіны і гародніны маглі б вырашыць і свае фермеры, але час паказаў, што ім пастаянна даводзіцца сутыкацца з праблемамі, якія нясправасто вырашыць. Многія фермеры наракаюць, што збыць вырашчанае даволі складана. А фермер з Ляхавічаў У. Радзюк паскардзіўся на тое, як цяжка пабудаваць сховішча для яблыкаў, бо толькі на праект трэба аддаць дзясяткі мільёнаў рублёў (колькі можна пра гэта гаварыць). А затым затрачаныя грошы неабходна будзе закласці ў сабекошт прадукцыі, а інакш які сэнс вырошчваць тыя яблыкі? Вязуць імпартную садавіну, бо яна больш танная, а значыць і канкурэнтаздольная. Умець прадаць — гэта не меншае майстэрства, чым вырасціць.

І ўсё ж дзе нашы яблыкі, бо сады ўжо колькі гадоў закладваюцца ды і ў краіне існуе Праграма па садаводстве?

На чалавека, па навуковых выкладках, павінна прыпадаць прыкладна 40 кг яблыкаў у год. Калі ўлічваць толькі прадукцыю грамадскіх садоў (90 тыс. тон), то кожнаму жыхару дастаецца 9 кг. Але ж ёсць яшчэ прыватныя сады? А там сітуацыя такая. Не магу сказаць, як у іншых абласцях, а на Брэстчыне масава абтрасаюць яблыкі яшчэ зялёнымі ды здаюць нарыхтоўшчыкам па 80-120 рублёў — на віно. Пэўная частка садавіны ідзе на корм жывёле, а нейкая скрынка захоўваецца, хоць без спецыяльнага абсталявання і ўмоў доўга захоўваць плады не ўдаецца. Вось і даводзіцца купляць яблыкі польскія.

Не дрэмлюць і расіяне, калі восенню оптам закупляюць нашы яблыкі — грузяць у фуры і вывозяць. Гэта быццам бы і добра, але ж для сябе не застаецца.

Крыху іншая сітуацыя з агароднінай. У прынцыпе, яе хапіла б, каб накарміць усё насельніцтва краіны, але ж існуе планка, ніжэй за якую цана не можа апусціцца. Для пакупніка — гэта добра, але не для вытворцы.

Некалькі гадоў таму многія фермеры кінуліся вырошчваць капусту, а затым не ведалі, што з ёю рабіць. Адзін гаспадар наквасіў той капусты сем тон, але не знайшоў каму збыць і давялося выкінуць.

Вось і фермер І. Арловец з-пад Ліды кажа, што самае важнае — своечасова прадаць прадукцыю. Зялёную цыбулю ён пастаўляе ў санаторый «Радон», прадае ў Гродне, Лідзе і Баранавічах, але здаралася, што цыбуля сотнямі кілаграмаў гніла — не было попыту.

Неяк пры сустрэчы з фермерамі-братамі Аўдзеямі з-пад Клецка даведаўся: ім спрыяе тое, што сваю гародніну яны пастаўляюць у бальніцу, школы, крамы... Фермеры занялі сваю нішу, але ж для ўсіх вытворцаў дзяржаўных устаноў не хопіць, а свабодны рынак іншага палохае.

І ўсё ж праблема не ў імпартнай прадукцыі. Зазірнуў у дзве буйныя прадуктовыя крамы свайго мікрараёна. У адной прадаецца гародніна ад мясцовых сельгасвытворцаў і яе купляюць, а ў другой — амерыканская радыска і беларускія яблыкі па 3170 руб/кг. А побач з крамай садавіной гандлююць прадпрымальнікі, і кошт яблыкаў у іх 2-2,5 тысячы, такая ж цана і на рынку. Яблыкі выглядаюць хораша, і людзі найперш купляюць іх. Чалавека цікавіць тавар і цана, а не тое, дзе ён вырас.

Калі гандлююць маладой імпартнай бульбай, то гэта павінна радаваць — свая калі яшчэ вырасце.

І ў тым, што на прылаўках ляжыць замежная садавіна і гародніна, вялікай трагедыі няма, а вось чаму наша сельгаспрадукцыя часта не можа канкурыраваць з ёю — тут ёсць над чым падумаць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ГАСПАДАР БЕЗ ГАСПАДАРКІ

Ці толькі ў ляноце прычына?

Мая бабуля Соня жыве ў вёсцы Парадні, што на Міёршчыне. Колькі сябе памятаю, яна трымала вялікую гаспадарку: дзвюх кароў, каня Буланчыка, свіней, курэй, ката. Побач з домам быў дагледжаны яблыневы сад і два вялікія агароды. Зараз бабуля часта скардзіцца на боль у нагах, раз, а то і два разы на год падлечваецца ў бальніцы. Агароды раздала суседзям, яблыні летась далі небагаты ўраджай, а з гаспадаркі застаўся толькі кот Дымок.

Бабуля адарвалася ад зямлі не па сваёй волі. Пераканана, што калі б былі сілы, яна і зараз бы гадавала кароўку, садзіла бульбу і сеяла ячмень.

Хвалюе іншае. **З кожным годам усё больш беларускіх вяскоўцаў працаздольнага ўзросту самавольна адмаўляецца ад гаспадарак.**

— Былі часы, калі жыхары вёскі Цэнтральная (Іўеўскі раён) выганялі на пашу 100 кароў, — расказвае прадавец мясцовай крамы Яніна Саўсян. — Цяпер добра, калі 20 налічыце.

У халадзільніку разгледзела рэшткі смятаны, малака, масла.

— Хутка разбіраюць малочныя прадукты, — злавіла мой погляд Яніна Саўсян. — Толькі паспявай заказваць. Аднаго малака за тыдзень выносяць з крамы амаль 100 літраў.

«Не жадаюць маладыя працаваць», — уздыхнула, пачуўшы нашу размову, мясцовая бабулька. **Але ці толькі ў ляноце прычына?**

З Таццянай Красніцкай, маладой і дагледжанай жанчынай, я пазнаёмілася ў вёсцы Алесіна Смалявіцкага раёна. Яна працуе стаматолагам у мясцовым фельчарска-акушэрскім пункце ўжо 10-ты год.

— Пераехалі сюды з мужам са Смалявічаў, — расказвае Таццяна. — Нам адразу ж выдзелілі дамок з зямельным надзелам і хлеўчуком. Хлеў муж адразу ж перарабіў у гараж. А на зямлі першы год пасадзілі бульбу. Наняць трактар, каб апрацаваць зямлю, — не таннае задавальненне. Вось і вырашылі на сямейнай нарадзе, што выгадней пяць мяхоў бульбы купіць на рынку, а на зямлі пасеялі траву, пасадзілі сад.

— Вы прыязджайце сюды летам, — запрашае **старшыня Курганскага сельскага Савета дэпутатаў** (гэты сельвыканкам летась у раёне стаў лідарам па закупцы малака ў насельніцтва) **Антаніна ЦЯГЛІК**, — такіх лілей і ружаў, як у Тані, няма ва ўсім сельсавеце.

— Гаспадарку таксама ніколі не трымалі, — працягвае Таццяна. — Па-першае, гаспадарка — што малое дзіця: не пакінеш без дагляду. А прывязваць сябе да дому так, каб нікуды ад'ехацца нельга было, не хочацца. Па-другое, падлічыла, што грошы, укладзеныя ў гаспадарку, не акупляюцца. Вось я і набываю мяса і яйкі ў краме. Дзякуй Богу, гэтага дабра там хапае. А малако бяру ў суседкі па 4 тысячы за трохлітровы слоік.

— Сапраўды, нявыгадна трымаць гаспадарку, — падтрымалі Таццяну работніцы ФАПа. — І гэта не толькі наша перакананне, гэтак лічыць амаль уся вёска. 10 гадоў таму ў Алесіна было 50 кароў. Зараз засталося толькі 6. Свіней і курэй трымаюць, у асноўным, пажылыя людзі. Не на продаж, а для сябе.

— Ну самі падумайце, адзін кілаграм жывой вагі каштуе 6 тысяч рублёў, — разважае Наталля Міхайлаўна, калега Таццяны. — Калі прадаць кабанчыка за бясцэнак, а пасля ў краме каўбасу набываць па 20 тысяч за кілаграм, то навошта тады было «гарбаціцца» столькі часу?

— А я большую частку мяса аддаю дзецям, — кажа Антаніна Цяглік. — А сала важу на рынак і прадаю. Добра, як ёсць свая гаспадарка. Аднойчы (гэта было чатыры гады таму) мне вельмі захацелася набыць пральную машыну. А патрэбнай сумы на той час не было. Вось і вырашыла прадаць двух кабанчыкаў, а выручаныя грошы патраціць на ажыццяўленне сваёй мары. І да сёння пакупкай нацешыцца не магу.

Пенсіянерку **Яўгенію Мікалаеўну Дзяркач**, пераможцу раённага конкурсу на лепшую сядзібу з вёскі Кленік Ніз, засталі з анучай у руках: руплівая гаспадыня мыла вокны.

— Пакуль сілы ёсць, буду гадаваць і кароўку, і свіней, і трусоў, і курэй, буду саджаць агарод, — упэўнена гаворыць Яўгенія Мікалаеўна. — Я тут наводшыбе вёскі адна засталася. Вунь, бачыце, хаты стаяць — але ўсе пустыя. Нават пагаварыць няма з кім. Але я не бяду: выйду, з кароўкай паразмаўляю, з сабакамі. Усё ж весялей. І заўсёды пры справе.

— А ці выгадна трымаць гаспадарку?

— Выгадна, чаму ж не, — кажа галоўны бухгалтар у мінулым. — Ну няхай я за апрацоўку надзела вясной аддам 150 тысяч (наймаю трактар). Дык затое круглы год не трэба будзе траціць грошы на бульбу, буракі, моркву, цыбулю, кабачкі, перцы... Безумоўна, калі сам рабіць не можаш і для таго, каб выкапаць бульбу ці нарыхтаваць сена карове, трэба наняць людзей — то якая тут выгада. А я што сама не зраблю, тое дзеці дапамогуць. Добра, жывуць непадалёку — у Смалявічах і ў Жодзіне. Лішкі малачка я здаю дзяржаве. Летась за сезон больш як 3 тоны здала. Вось мне і капейка да пенсіі.

— А чаму тады ва ўсёй вёсцы толькі 3 кароўкі засталося?

— У нас моладзі амаль няма. А старых сілы пакідаюць.

Паводле слоў старшыні сельсавета, у той час як колькасць кароў у хатніх гаспадарках змяншаецца, колькасць коз узрастае.

Вось і 84-гадовая **Ева Аляксееўна Сірата** з вёскі Курганне, якая жыве разам з дачкой і зяцем, вось ужо больш як два гады таму перайшла з каровінага малака на казінае.

— Прадалі карову, бо не пад сілу стала столькі сена нарыхтоўваць. Але чалавеку, які вырас на малацэ, ужо складана адмовіцца ад яго. Вось падумалі і вырашылі завесці казу. Зараз нацешыцца з яе не можам. Казінае ж малако не толькі нам, але і ўнукам, і праўнукам даспадобы.

* * *

Паводле слоў **старшыні Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Генадзія МЕРКУЛЯ**, з года ў год у раёне змяншаецца колькасць кароў, якія знаходзяцца ў прыватнай уласнасці. **Рынак насычаны малочнай прадукцыяй, таму кароў трымаюць толькі людзі старой загартоўкі ці тыя, хто атрымлівае ад гэтага маральнае задавальненне.** 66 % насельніцтва раёна хатняй жывёлы не трымае наогул.

— А як заахвочваеце людзей?

— Каб здавалі маладняк БРЖ (буйной рагатай жывёлы) у СВК, вызначаны надбаўкі да закупачных цэнаў на 1000 рублёў за кожны кілаграм. Толькі летась выплацілі 8 млн 736 тысяч надбавак.

Мясцовыя жыхары маюць магчымасць набыць у СВК па сабекошце корм для жывёлы. Колькасць сена, саломы, збожжа, якія яны могуць купіць па льготным кошце, будзе залежаць ад колькасці рэалізаванага дзяржаве за год малака.

Каб падтрымаць мясцовае насельніцтва, па рэкамендацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання з вясны 2008 года мясцовы малочны завод прымаў малако ад насельніцтва па адной тысячы за літр. Толькі восень апошнія месяцы завод працуе са статкамі. У сувязі з гэтым з 1 красавіка закупляем малако, як і па ўсёй краіне, па 665 рублёў за літр (плюс 75 рублёў надбаўкі да закупачных цэнаў за літр малака). Даводзім да ведама, што з 1 красавіка закупляем малако, як і па ўсёй краіне, па 665 рублёў за літр (плюс 75 рублёў надбаўкі да закупачных цэнаў за літр малака). Даводзім да людзей і яшчэ адну непрыемную навіну: з красавіка базісную тлустасць малака паднялі з 3,4% да 3,6%.

Намеснік начальніка Дзяржаўнай харчовай інспекцыі па якасці і стандартызацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Ганна ХАТЭНКА:

— Што датычыцца базіснай тлустасці, то такія змены былі ўнесены ў Пастанову Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі краіны № 5 ад 29 студзеня 2009 года. Рашэнне аб павелічэнні прынята з мэтай умацавання экспартных пазіцый. Так беларуская прадукцыя будзе больш адпавядаць патрабаванням да аналагічных тавараў у Еўрасаюзе.

* * *

P.S. *Трымаць ці не трымаць гаспадарку, кожны вырашае сам. Як кажуць, гаспадар — пан. Толькі вось чарговы раз, калі праязджаю праз вёску і бачу ля хаты замест агарода дыванок з кветак, а на пашы кароў, якіх можна пералічыць на пальцах, пытаюся ў сябе: няўжо мае дзеці змогуць даведацца пра сапраўднае вясковае жыццё толькі з кніжак?*

Надзея ДРЫЛА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У гаспадарцы Евы Аляксееўны СІРАТЫ папаўненне: нядаўна каза-карміцелька пацешыла казлянятамі.

«З гаспадаркай і жыць весялей», — кажа Яўгенія Мікалаеўна ДЗЯРКАЧ.

Па каментарый я звярнулася да **намесніка начальніка ўпраўлення ўдасканалення эканамічнага механізма гаспадарання Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзіміра КРАСОЎСКАГА**:

— Колькасць уласных падсобных гаспадарак у рэспубліцы з кожным годам змяншаецца. Калі летась іх было 1 млн 126 тысяч 600, то сёлета — 1 млн 107 тысяч 800. Перакананы: нельга прымусіць вяскоўца весці гаспадарку. Але тых, хто жадае гадаваць карову, свіней, трэба падтрымліваць, ствараць умовы для такой працы. З гэтай мэтай летась Урад і прыняў пастанову «Аб некаторых пытаннях развіцця і падтрымкі ўласных падсобных гаспадарак грамадзян».

Згодна з гэтым дакументам, мясцовыя органы ўлады павінны штогод выдзяляць людзям, якія вядуць гаспадаркі, надзелы лугавых зямель для нарыхтоўкі кармоў (у разліку не менш як дзве тоны на адну карову (каня). А малаказаводы — аплачваць паслугі па нарыхтоўцы малака ў насельніцтва ў памеры 20 % ад закупнай цаны малака першага гатунку.

Міністэрства эканомікі зацвердзіла гандлёвыя надбаўкі на камбікармы, якія рэалізуюцца насельніцтву: яны складаюць не больш за 15 % да адпускных цэнаў арганізацый-вытворцаў. Акрамя таго, пастановай зацверджана Палажэнне аб парадку выплаты ў 2009 годзе сродкаў рэспубліканскага бюджэту на стымуляванне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, якая закупляецца ў вяскоўцаў. Гэта надбаўкі да закупачных цэнаў на маладняк БРЖ у памеры 1000 рублёў за кілаграм і на бульбу, якая ідзе на крухмальныя заводы, у памеры 150 рублёў за кілаграм. На малако, якое закупляецца ў насельніцтва, вызначана надбаўка ў памеры 75 рублёў за кілаграм базіснай тлустасці.

Разглядаецца пытанне, каб у 2009-2010 гадах людзі, са згоды кансультацыйнага савета, які маецца ў кожным раённым цэнтры, маглі браць у «Белаграпрамбанку» льготныя крэдыты на мэты, звязаныя з фінансаваннем вытворчасці ва ўласных гаспадарках.

Вучоныя НАН распрацоўваюць палажэнне аб парадку стварэння і дзейнасці кааператываў па развіцці і падтрымцы асабістых гаспадарак і палажэнне аб таварыствах узаемнага крэдытавання грамадзян, якія вядуць уласную гаспадарку.

УГНАЕННІ ВЯРНУЛІ

У індывідуальнага прадпрымальніка з в. Воля Івацэвіцкага раёна нехта выкраў больш за тону мінеральных угнаенняў, якія знаходзіліся ў адрыне пры нежылым доме. Дзверы не былі зачыненыя, ды і прадпрымальнік з тыдзень туды не зазіраў. Так што красці было лёгка.

Падчас следства зладзеяў далёка шукаць не давялося: імі былі двое жыхароў гэтай жа вёскі.

БУДУЕШСЯ? ВАРТУЙ!

Па вул. Дзмітрава ў Баранавічах будуецца крама, з якой і былі ўкрадзены: радыятары, трубы, уцяпляльнікі... І хаця прайшло даволі шмат часу і заяўнік не мог сказаць, калі ў будынку пабывалі зладзеі, аператыўнікі ўсё ж здолелі выйсці на двух жыхароў в. Вольна, якіх і арыштавалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

«ЗАЛАТЫЯ» ЗЛАДЗЕІ

Апошнім часам на Гомельшчыне пачасціліся выпадкі крадзяжу залатых упрыгажэнняў з кватэр іх уладальнікаў. Так, у Мазыры, узламаўшы дзвярны замок, невядомы ўкраў у адной з кватэр залатыя рэчы ды яшчэ і 150 тысяч рублёў прыхапіў з сабой. Такім жа чынам зніклі залатыя і сярэбраныя ўпрыгажэнні з кватэры яшчэ адной мазыранкі, якая адсутнічала днём дома ўсяго каля чатырох гадзін.

Тры выпадкі пагоні зладзеяў за золатам былі зафіксаваныя і ў Гомелі. У адным з іх залатога пярсцёнка пазбавілася 22-гадовая дзяўчына, калі дома піла з малазнаёмай. У другім — нехта падабраў ключ да кватэры 47-гадовай жанчыны і «падскроб» усе прыгожыя рэчы разам з золатам. А ў трэцім — невядомы выдраў дзвярны замок і... астатнее вядома. Міліцыя мяркуе: калі нехта мэтанакіравана ідзе па золата, ён ведае, куды ідзе. Толькі як знайсці зламысніка?

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

МАНЕТНЫ АГАРОД

Скарбы роднай зямлі

Вясковыя бабулі ў Міраславічах Клімавіцкага раёна лечаць галаўны боль старажытнымі пятакамі, якія знаходзіць на сваім участку Вольга Карасёва.

Не з маім шчасцем! Такая выдатная была магчымасць спраўдзіць запаветную дзіцячую мару — адшукаць скарб. Рамантыка і фантастыка разам! Але не здарылася нават сціплай знаходкі ў адну манету.

А капалі ў надзейным месцы: на «агародзе цудаў», дзе летась жыхарка Міраславічаў адшукала больш за 200 старажытных манет, якія належаць XVII-XIX стагоддзям. А сёлета Вольга Карасёва, сацыяльны педагог мясцовай школы і маці дваіх дарослых дзяцей, адкрыла другі сезон збору манетаў, які абяцае быць не менш ураджайным за леташні.

І вось раніцай на агародзе паблізу ракі Іпуць ідзе «кантрольнае капанне». Маленькая і жвавая гаспадыня ў джынсах і гумавых ботах з рыдлёўкай, а я — на недарэчных абцасах і з дыктафонам.

— Першыя манеты я знайшла леташняй вясной: растаў снег, і яны ляжалі проста на раллі, — расказвае Вольга Міхайлаўна. — Іх няцяжка ўбачыць: зямля тут добрая і рассыпістая, манеты адразу адлятаюць. Іх таксама можа выбіць з глебы дождж альбо разграбуць куры...

Між тым, цяпер зямля шчодра дзеліцца кавалкамі цэглы, каванымі пагнутымі цвікамі, керамічнымі і шкляными аскепкамі.

— Тут дакладна калісьці быў нейкі піцейны дом, карчма, — за працай тлумачыць Карасёва. — Глядзіце, у мяне тут цэлая куча керамікі. Ёсць нават чорная, якую лічаць найбольш старажытнай. Вось каляровыя кавалкі, нават перламутравыя. А дзе ж манеты? Я нервуюся.

Была спакуса прыдумаць прыгожыя падрабязнасці, але прызнаюся шчыра: мне не ўдалося ўбачыць на свае вочы, як манеты цягаюць з зямлі. Вольга Міхайлаўна высыпала на камень здабыткі цяперашняй пасяўной кампаніі са старога гарлачыка.

Два дзясяткі манетаў розных памераў, якія належаць Расійскай імперыі розных часоў. Манеты цёмна-карычневага колеру, з чорнымі наслаеннямі — слядамі карозіі і, верагодна, пажару, і яркай бірузовай пацінай, высакароднай адзнакай часу. Гавораць, што калі манеты прафесійна пачысціць, то бронза будзе прыемна зяхць.

Летась Вольга Карасёва шмат такіх манет перадала ў Клімавіцкі краязнаўчы музей.

— А знайшла яшчэ болей! — прызнаецца шчаслівая шукальніца скарбаў. — Аддавала на памяць сваякам, сябрам і знаёмым, асабліва тым, хто збірае калекцыю. Бабулі прыходзілі па старыя пятакі: гаварыць, што стары медны сплаў сапраўды дапамагае зняць галаўны боль. Я лёгка аддаю: людзі вельмі радуюцца і адной манетцы на памяць. Бярыце, я яшчэ сабе накапаю!

Агарод Вольгі Міхайлаўны, відаць, можа стаць выпрабавальным полем для выяўлення ступені ўдачлівасці, ва ўсякім разе — на грошы. Праз некалькі гадзін пасля развітання гаспадыня патэлефанавала і расказала: капала зноў на тым жа месцы, але глыбей на рыдлёўку, і знайшла аж 43 манеты! Адна са знаходак — срэбная, якая датуецца XVIII стагоддзем. Астатнія ў асноўным XIX стагоддзя, але негарэлыя. Гэты скарб пажар не закрануў. Самая старая манета са знойдзеных — грошык 1710 года.

Што ж, Вольга Карасёва паўжартам прызнаецца, што сапраўды заўсёды лёгка знаходзіла грошы. Праўда, усміхаецца жанчына, на агульны матэрыяльны стан гэтыя выпадковыя здабыткі ўплыву не мелі.

У дзяцінстве каля крамы яна рэгулярна падбірала манеткі, потым знайшла на сметніку скрутак грашовых купюр, а аднойчы пайшла па грыбы і ў прылеску заўважыла («быў моцны дождж, ішлі вочы ў зямлю») нямецкую манету з белага металу — 1 пфенінг 1942 года.

А сёння Вольга Міхайлаўна — гаспадыня ўрадлівага на старажытныя манеты ўчастка ў цэнтры старажытнай вёскі Міраславічы. Дом з кавалкам зямлі выдзеліла Карасёвым мясцовая сельская гаспадарка, дзе энергетыкам працуе муж Вячаслаў. Яго жонцы проста спадабалася гэтае месца, нават нягледзячы на тое, што ўчастак быў занядбаным. Яна, заўзятая рыбачка ў поўнай адпаведнасці са сваім «рыбным» прозвішчам, хацела быць бліжэй да ракі.

Выявілася, што месца гэта незвычайнае. Гаспадыні расказалі, што на старажытнай карце каля рэчкі пазначана драўляная царква. Можа, ёсць яшчэ шанец знайсці ў глыбіні царкоўны скарб?

Паводле іншай версіі, тут былі гандлёвыя рады, якія цягнуліся ад Міраславіцкай царквы. Праўда, наўрад ці пакупнікі раскідалі б столькі манет.

Самае праўдападобнае: на гэтым месцы стаяла яўрэйская крама, дзе гандлявалі газай. У такім разе можна растлумачыць і пажар, які папсаваў манеты. Падчас другой сусветнай вайны фашысты палілі дамы міраславіцкіх яўрэяў і знішчалі без літасці іх гаспадароў — у аграгарадку летась прывялі ў парадак брацкую магілу.

— У гэтым скарбе грошы трох пакаленняў, бо даты ахопліваюць тры стагоддзі, — тлумачыць Вольга Міхайлаўна. — Верагодна, што яны збіраліся на «чорны дзень». Мне падаецца, што схованка была недзе пад хатай, і яе выкапаў трактар, калі капалі падмурак новага дома. Потым грунт разгарнулі, і манеты нібыта размазалі па ўсім агародзе. Але будаўнікі і ранейшыя гаспадары дома нічога не заўважылі.

Мяркуецца, што ў скарбе сярод медных манетаў былі залатыя і срэбныя, але ад агню яны расплавіліся: на некаторых манетах ёсць толькі сляды срэбра і золата. Можа, і нездарма гаварыць, што золата — цяжкі метал, і гэта каштоўнасць апускаецца ў глыб зямлі.

Знайсці па-сапраўднаму каштоўную манету, цікавую і дарагую, — мара Вольгі Карасёвай. Гэта можа стаць сямейным талісманам, а можа, і магчымасцю зрабіць у доме добры сучасны рамонт. Хаця, можа, яна мае здольнасць прыцягваць не толькі старыя грошы і варта дзеля рамонту згуляць у латарэю?..

Пакуль мы корпаемся на агародзе, па дарозе побач праходзяць вяскоўцы. Паказальнаму капанню на агародзе Карасёвай яны не здзіўляюцца — прызвычаіліся да новай міраславіцкай славутасці.

— У мяне толькі ўсе пытаюцца, колькі мне мільёнаў далі за скарб, — смяецца Вольга Міхайлаўна. — Якія мільёны? Манеты музею я падарыла. Ды яны, кажуць, і не каштуюць нічога. Гэта не матэрыяльная, а гістарычная каштоўнасць. Калекцыянерам, якія займаюцца набыццём і продажам такіх рэчаў, яны не патрэбныя. Мне прапаноўвалі за манету па 3-5 тысяч рублёў, але мне яны даражэйшыя як памяць.

Наконт цаны — гэта праўда. Я пацікавілася ў інтэрнэце, колькі, напрыклад, каштуе пятак 1862 года, які я трымала ў руках. Высветлілася, што ад ста расійскіх рублёў. На адным аўкцыёне для нумізматаў такую медную манету Расійскай імперыі прадалі за 1000 расійскіх рублёў.

Цяпер Вольга Міхайлаўна збірае манеты для краязнаўчага музея ў Міраславіцкай школе, дзе працуе сацыяльным педагогам. Веснавое выраўноўванне і ворыва агарода ідзе на карысць і хатняй гаспадарцы, і музейнай калекцыі.

Нават у свой 51 дзень нараджэння Вольга Міхайлаўна выйшла з рыдлёўкай і атрымала ў падарунак ад роднай зямлі 4 манеты.

— Я радуюся як дзіця, калі знаходжу іх, — прызнаецца жанчына. — І калі не выпадае адкапаць манету, то лічу дзень за няўдалы. Такая вось у мяне прыкмета!

Да свайго агарода і знаходак Карасёва ставіцца, так бы мовіць, без лішняга пафасу. У раённы музей манеты трапілі ў газетным скрутку, дакументы гаспадыня аформіла па тэлефоне. Аднойчы нехта ўначы стаў капаць каля дома: яна выйшла на падворак і запрасіла прыйсці, калі будзе светлы дзень. Маўляў, яна не супраць, а працаваць будзе зручней.

— Аднойчы да мяне прыйшлі дзяўчаткі са школы і мы разам дакапаліся да нейкіх костак, падобных на чалавечыя, — узгадвае Вольга Міхайлаўна. — Яны ляжалі глыбока, а на ўчастку было шмат валуноў, праўда — без аніякіх надпісаў. Мы іх адкацілі да агароджы. Я мяркую, ці не было тут у старажытнасці могілак? Ва ўсякім разе, мы вырашылі больш у тым месцы не капаць, бо не хочацца патрывожыць спакой памерлых.

Муж Вячаслаў, дарэчы, ніякіх скарбаў не шукае: ён лічыць за багацце ўрадлівую зямлю, якая дае добры ўраджай бульбы і гародніны. Аднак захапленне сваёй жонкі цуда-агародам лічыць добрым хобі ў дадатак да іншых.

Захапленне старажытнасцю ў Карасёвай не абмяжоўваецца толькі манетамі. Яна разам з калегамі ездзіць па новыя экспанаты для школьнага музея ў аддаленыя вёскі. З дазволу старастаў краязнаўцы шукаюць у кінутых хатах старыя побытавыя рэчы. І знаходзяць: гарлачы, калаўроты, драўляныя рыдлёўкі, глякі, знайшлі дзіцячую люльку і гэтак далей. Трапляюцца таксама дакументы і фотаздымкі. Напрыклад, старая выява мужчыны ў будзёнаўцы з шырокай барадой цяпер захоўваецца ў музеі: праўда, невядома, хто ён такі.

— А хто пакінуў скарб? Я таксама не ведаю, — гаворыць Вольга Міхайлаўна. — На нашай зямлі шмат адбіткаў гісторыі. Мы не ведаем, па чым ходзім. Не ўсё яшчэ знойдзена, і шанец знайсці скраб ёсць у кожнага з нас. А я веру, што яшчэ знайду нешта надзвычай цікавае, і гэта будзе вялікая радасць!

Ілона ІВАНОВА.

Клімавіцкі раён.

АЎТАРЫТЭТНАЕ МЕРКАВАННЕ:

Загадчык кафедры археалогіі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук Ігар МАРЗАЛЮК:

— Скарбы і цяпер знаходзяць вельмі часта. Па чутках, нядаўна ў Буйнічах пад Магілёвам знайшлі 20 тысяч срэбных манет, а летась у Мсціславе адкапалі каштоўны скарб. Але ніхто гэтых багаццяў не бачыў, таму што яны былі распрададзеныя ў прыватныя рукі. Такія пагалоскі прыходзяць з розных куткоў Беларусі.

Пошук скарбаў стаў бізнэсам. Сотні маладых людзей з металашукальнікамі ходзяць па зямлі і знаходзяць скарбы, якія не даходзяць да дзяржавы. Таму я асабіста лічу, што цяпер наспеў час стварыць адмысловую службу па ахове гісторыка-культурных, археалагічных каштоўнасцяў. Падобна на службу па ахове прыроды. Інакш беларускія скарбы мы не ўбачым.

ДАВЕДКА:

Манетны скарб — грашовыя каштоўнасці, захаваныя ў тайніку (часцей за ўсё — у зямлі). У Магілёўскай вобласці з антычных часоў і па XIX стагоддзе адкрыта больш за 200 манетных скарбаў.

Паводле інфармацыі энцыклапедычнага даведніка, два манетныя скарбы, знойдзеныя ў Магілёве ў сярэдзіне XX стагоддзя, захоўваюцца цяпер у абласным краязнаўчым музеі. У 1955 годзе ў Лупалаве адкапалі гліняную скарбонку, дзе былі тры срэбныя пярсцёнкі і больш за 500 манет, у тым ліку і срэбныя.

У наступным, 1956 годзе, пры пракладцы траншэі для водаправода ў абласным цэнтры знайшлі металічную шкатулку. Там захавалася 3350 расійскіх срэбных манет. Абодва скарбы былі схаваныя ў XVII стагоддзі.

Знаходзілі манетныя скарбы і ў Клімавіцкім раёне. Напрыклад, у 1804 годзе ў саміх Клімавічах знайшлі амаль 2 тысячы медных і срэбных манет Рымскай імперыі. А ў вёсцы Стары Дзедзін у 1926 годзе адшукалі скарб, у якім было каля 200 дырхемаў Арабскага халіфата.

Скарбы надараюцца не толькі манетныя. Напрыклад, «Звязда» ўвосень 2006 года распавядала пра скарб, знойдзены на агародзе ў вёсцы Расна Дрыбінскага раёна. Пасля пераворвання сяляне знайшлі ў зямлі чыгунок з посудам. Выявілася, што гэта знакаміты дулеўскі фарфор, зроблены ў 1920-я гады.

Дзіця нарадзілася на прыпынку

17 красавіка а 11-й гадзіне магіляўчанка нарадзіла сына прама на прыпынку грамадскага транспарту.

Жанчына патэлефанавала ў «хуткую дапамогу», але роды імкліва пачаліся. Яна папрасіла дапамогі ў прадаўшчыцы шапіка. Смелая дзяўчына не разгубілася: яна паспела падхапіць дзіця, загарнула яго ў сваю куртку, перарэзала пупавіну. Праз хвіліну пад'ехалі медыкі, якія аказалі немаўляці, якое ў скрутку ляжала на лаве, і яго маці першую дапамогу.

Цяпер 33-х гадовая жанчына і яе сын знаходзяцца ў радзільным аддзяленні Магілёўскай бальніцы № 1. З хлопчыкам, які нарадзіўся вагой каля 3-х кілаграмаў, усё ў поўным парадку, паведаміў намеснік галоўнага ўрача па акушэрстве і гінекалогіі Сяргей Корнеў. Затое ёсць пытанні да маці, якая ў час другой цяжарнасці не звярталася да медыкаў і не стаяла на ўліку, як гэта належыць.

Па словах урачоў, у хатніх альбо дарожных родах няма ніякай навіны. Жанчыны часам нараджаюць у экстрэмальных умовах, з розных прычынаў. У Магілёве памятаюць жанчыну, якая нарадзіла дзіця дома, прама на рукі мужу: «хуткую дапамогу» выклікалі, але чацвёртыя роды былі надта імклівыя.

Ёсць і выпадкі іншага кшталту: жанчына нарадзіла не патрэбнае ёй дзіця і схавала немаўля ў канапу. Але сама яна вымушана была звярнуцца да медыкаў з-за крывацёку, і гэта здарэнне падарыла жыццё дзіцяці, якое своечасова знайшлі і выратавалі.

Алена КАЗЛОВА.

Пажар на льнозаводзе

19 красавіка на Чавускім льнозаводзе агнём знішчаны 75 тон льнотрасты на суму каля 34 мільёнаў рублёў.

Пажар пачаўся а 17-й гадзіне: супрацоўнікам МНС удалося за паўтары гадзіны ліквідаваць адкрыты агонь, але давялося да раніцы паліваць вадой ільнотрасту. Дзеянні пажарных дазволілі выратаваць яшчэ 75 тон льнотрасты, якая захоўвалася пад суседнім навесам. Тэхнічныя памяшканні, цэхі і абсталяванне завода не пацярпелі.

З прычынай пажару цяпер разбіраецца аператыўная група Чавускага РАУС. У сувязі з тым, што ў месцах для складзіравання льнотрасты няма электрычнасці, то размова можа ісці толькі пра чалавечы фактар: альбо падпал, альбо неасцярожнае абыходжанне з агнём. Крымінальная справа ўжо распачата.

Дарэчы, за мінулы тыдзень гэта не першае здарэнне на Чавускім льнозаводзе. 16 красавіка раніцай на тэрыторыі быў знойдз

ПАРТЫЗАНСКАЯ ЗНАХОДЛІВАСЦЬ

Радавыя Перамогі

Адна са спецаперацый партызанскага атрада ўраджэнца Міншчыны Васіля Каржа ўвайшла ў ваенны летапіс як прыклад партызанскай хітрасці і знаходлівасці.

Быў лістапад 1941 года... Камандзір атрада Васіль Корж сказаў сваім байцам: «Варта абмеркаваць адну аперацыю. У нас назапасілася паліцэйскіх павязак ды форменнага нямецкага абмундзіравання з падбітай штабной машыны...». Далей Корж павёў размову аб необходнасці разгрому адразу некалькіх варожых гарнізонаў у вёсках Забродзе, Чырвонае Возера і Осава, дзе паліцаі разам з гітлераўцамі ўчыняюць жорсткія расправы над мясцовымі жыхарамі. На ноч ахова там толькі ўзмацняецца, паколькі фашысты больш за ўсё апасаюцца нападаў у гэты час. Значыць... нападаць варта днём! Час прыспешваў: усё ж такі хутка павінен быў выпасці снег, і гэта паспрыяла б хуткаму адлову партызанаў па свежых слядах.

Корж прапанаваў падабраць найбольш смелага байца, апрануць яго ў форму нямецкага афіцэра, некалькі чалавек — у салдацкую форму з паліцэйскімі павязкамі на руках. Патрабавалася інсцэніраваць паліцэйскі карны атрад і накіравацца па гарнізонах. «Пазбавімся патрулёў, блакіруем усе дамы паліцэйскіх, — разважаў Васіль Захаравіч. — Ніводнага паліцэйскага не выпусцім, пакуль не разгромім усе гарнізоны. Аперацыю пачынаем 11 лістапада ў 6 гадзін раніцы».

Партызаны рыхтаваліся да аперацыі два дні. Сфарміравалі групы па 2-5 чалавек, абмеркавалі дэталі, умоўныя сігналы і жэсты, падагналі абмундзіраванне. Вырашылі, што ролю нямецкага афіцэра сыграе Эдзік Нордман, які ведаў крыху нямецкіх слоў, а ролю перакладчыка і, бясспрэчна, кіраўніка ўсёй аперацыі, усклалі на самога Каржа. Як толькі для Эдзіка падабралі афіцэрскія мундзір і боты, «нямецкі камендант», «доктар Нордман», як яго тут жа празвалі партызаны, пачаў прывыкаць да формы і ўжывацца ў ролю. Корж яшчэ раз падрабязна праінструктаваў усіх удзельнікаў аперацыі аб неабходнасці выключнай вытрымкі і дысцыплінаванасці.

У прызначаны дзень і час партызаны падышлі да вёскі Забродзе. Патрулёў на вуліцы не аказалася, — магчыма, пайшлі пагрэцца. За гадзіну байцы разабраліся, дзе хто жыве, размеркаваліся па зручных пазіцыях. Без адзінага стрэлу былі захоплены мясцовыя паліцэйскія... Атрад накіраваўся ў вёску Чырвонае Возера.

У 11 гадзін «камендант» з «перакладчыкам» і некалькі «нямецкіх салдатаў» увайшлі ў дом старасты. «Камендант» пачаў выкрыкваць рэзкім голасам «загад», які тлумачыў «перакладчык»:

— Прыбыў нямецкі атрад па барацьбе з партызанамі. Ён знаходзіцца на ўскрайку вашай вёскі і вакол яе. Пан афіцэр загадвае вам на працягу 10 хвілін сабраць усіх паліцэйскіх у школе...

Староста выцягнуўся ў струнку, выслухаў загад, узяў вінтоўку, патроны і выйшаў з дому. Астатнія — за ім. Той, не заходзячы ў дамы, грукаў у акно кожнаму паліцэйскаму, называў яго па імені і крычаў: «На збор! Хутка! Пан камендант патрабуе».

«Камендант» праз «перакладчыка» спачатку аблаяў дрэнную барацьбу з партызанамі, дрэннае ўзбраенне, пасля чаго загадаў усім пайсці атрымаць новую зброю, якая ляжыць на калёсах ля хлява. А там ужо другая частка партызанаў абязбройвала паліцаяў і звязвала. Дваіх, якія кінуліся наўцёкі, «дагналі» стрэламі.

Стрэлы, праўда, пачулі паліцаі суседняй вёскі Осава і ланцугом рушылі да Чырвонага Возера. За кіламетр ад вёскі спыніліся: убачылі, што ля хлявоў топчуцца людзі, стаяць падводы. Нордман і Корж рашуча накіраваліся насустрач ворагу.

Калі падышлі бліжэй, Эдзік зноў пачаў «крычаць», а Васіль — «перакладаць»: «Пан камендант загадвае хутка ісці сюды... Пойдзем на партызанаў». Паліцэйскія выслалі аднаго са сваіх, каб той пераканаўся, што перад імі — нямецкі афіцэр. Калі той падышоў бліжэй, Нордман зноў пачаў гаварыць «на нямецку», маўляў, я тут чалавек новы, нікога не ведаю, загадваю пакласці вінтоўку і падысці бліжэй. Той так і зрабіў, пасля чаго падышоў і пераканаўся, што гэта сапраўды «свае». Крыкнуў астатнім, каб падыходзілі. Паступіла тая ж каманда: пакласці зброю на зямлю. Паліцэйскія яе выканалі, паколькі бачылі, што іх таварыш захоўвае спакой... Так адбыўся захоп, які хутка і амаль без шуму ажыццявілі народныя мсціўцы. Так былі ліквідаваныя паліцэйскія гарнізоны адразу ў трох вёсках. Чуткі пра гэта разышліся далёка, і яшчэ доўга ніхто з мясцовых не хацеў ісці ў паліцыю.

Васіль Корж і Эдуард Нордман (1945 г.)

P. S. Пасля вайны Васіль Корж працаваў у Міністэрстве сельскай гаспадаркі БССР, узначальваў калгас «Партызанскі край» у родным Салігорскім раёне, а Эдуард Нордман служыў на розных пасадах у сістэме КДБ СССР, у тым ліку начальнікам управлення КДБ пры Савеце Міністраў БССР па Мінскай вобласці (сёння гэта — управленне КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці).

Святлана БАРЫСЕНКА.

Байцы партызанскага атрада. Васіль Корж — чацвёрты справа (сярод тых, што стаяць), Эдуард Нордман — пяты справа (сярод тых, што сядзяць).

Партызанскі сход.

Сталічнай раённай службе чэкістаў — 30 гадоў

Трыццаць гадоў таму, у красавіку, у сістэме ўпраўлення КДБ пры Савеце Міністраў БССР па Мінскай вобласці былі ўтвораны раённыя аддзелы сталіцы. Сёння гэта Заводскі, Ленінскі, Маскоўскі, Кастрычніцкі, Савецкі, Першамайскі, Партызанскі, Фрунзенскі і Цэнтральны райаддзелы ўпраўлення КДБ Рэспублікі Беларусь па г. Мінску і Мінскай вобласці.

У 1970-я гады, калі Мінск пачаў станавіцца буйным прамысловым горадам, дзе адзін за адным узводзіліся заводы і камбінаты саюзнага прызначэння, ствараліся прамысловыя прадпрыемствы і навукова-даследчыя арганізацыі, узнікла і аб'ектыўная неабходнасць у падраздзяленнях, якія змогуць забяспечыць эканамічную і сацыяльна-палітычную стабільнасць горада. Раённыя падраздзяленні і сёння забяспечваюць кантроль над аператыўным становішчам на тэрыторыі 9 раёнаў сталіцы, здабываюць інфармацыю аб пагрозах нацыянальнай бяспекі, садзейнічаюць рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі па нейтралізацыі знешніх і ўнутраных пагроз, вырашаюць задачы па барацьбе з тэрарыстычнымі і экстрэмісцкімі праявамі, арганізаванай і эканамічнай злачыннасцю, карупцыяй, наркабізнэсам.

Летась мінскімі райаддзеламі УКДБ папярэджана нанесенне эканамічнай страты дзяржаве на суму каля 828 млрд рублёў, накіравана ў даход дзяржавы 546 млн рублёў. Падчас рэалізацыі аператыўных матэрыялаў праведзена 86 агульных і індывідуальных прафілактычных мерапрыемстваў, у тым ліку адно — з вынясеннем афіцыйнага папярэджвання ад імя органаў дзяржбяспекі. З незаконнага абароту канфіскавана 155 адзінак агнястрэльнай зброі і боепрыпасаў. Раённыя аддзелы УКДБ выступаюць і ў якасці шэфаў сталічных школ і дзіцячых дамоў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Фестываль смешнага відэа запрашае ўдзельнікаў

Гэта мерапрыемства пад назвай «КВеНцін 2009» пройдзе ў Мінску ўжо ў другі раз. Паспрабаваць свае сілы ў ім змогуць як аўтарскія калектывы (каманды КВЗ, напрыклад), так і асобныя творчыя людзі, а таксама вытворцы відэапрадукцыі — тэлекампаніі, студыі, тэлеканалы.

Удзельнікам неабходна да 30 красавіка гэтага года даслаць на конкурс свае работы, створаныя ў адной з намінацый: «Агучка» (вядомы відэафрагмент з арыгінальным аўтарскім гукавым суправаджэннем), «Ігравы ролік» (уласны пастановачны ролік), «Відэакліп» (вядомы музычны твор з арыгінальным аўтарскім відэа), «Відэа-калаж» (сабраныя ў адно цэлае кароткія фрагменты з розных намінацый), «Home-video» (кадры з сямейных архіваў са смешным і цікавым зместам). Важная ўмова — каб працягласць конкурсных работ не перавышала 5 хвілін (для апошняй намінацыі — 10). Заяўкі і работы прымаюцца на адрас: 220030, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск, вул. Карла Маркса, 40, пак. 47, альбо на e-mail: kventin2009@mail.ru.

Лепшыя з дасланых ролікаў па рашэнні журы будуць паказаныя ў фінале конкурсу і разыграюць паміж сабой прызавы фонд фестывалю «КВеНцін 2009». Дарэчы, колькасць намінацый і прызоў арганізатары — Беларускі клуб вясёлых і знаходлівых — могуць і павялічыць, у залежнасці ад колькасці і якасці атрыманых ролікаў.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

МАСАВЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 9.



Белыя: Крh8, Са5, Кс7, Кf6, пп. d6, g3 (6). **Чорныя:** Крf8, Фh3, Ка1, Ка2, пп. b4, f7, h7 (7). Мат за 4 хады (3 ачкі).

Заданне № 10.



Белыя: Крc8, Фb8, Сd7, Кh3, пп. b6, b7, c6, g2 (8). **Чорныя:** Крh4, Кg4, пп. h5, h7 (4). Мат за 4 хады (3 ачкі).

На рашэнне заданняў даецца два тыдні.

Увага! Удзел у конкурсе рашэнняў можна пачаць з любога чарговага задання. Чакаем вашых адказаў і водгукаў.

ПРАВЕРЦЕ СВАЕ РАШЭННІ

Змяшчаем рашэнні заданняў масавага конкурсу рашэнняў, змешчаных 11 сакавіка г.г.

Заданне № 1. С. Лойд. 1. Лf3! цугцванг.

Заданне № 2. Іонг. 1. Сf5! Пагроза 2. Фfa4x.

Правільныя адказы даслалі нашы актыўныя рашальнікі Алег Бадзюкоў (Круглянскі раён), Юрый Бандарэнка (Магілёў), Віктар Быкаў (Мінск), Сяргей Гурыновіч (Мінск), Анатоль Дарашэнка (Мінск), Валерый Лук'янчук (Талачынскі раён), Мікалай Маляўка (Бабруйск), Анатоль Прынеслік (Віцебск), Сяргей Пунько (Мінск), Іван Цітовіч (Пастаўскі раён), Пётр Шчамялёў (Бялыніцкі раён), М. Балянкоў (Рагачоўскі раён).

НОВЫ КОНКУРС — ТЭМАТЫЧНЫ

Рэдакцыя газеты «Звязда» аб'яўляе новы тэматычны конкурс складання трохходовых задач. Суддзя конкурсу Уладзімір Сычоў прапануе наступную тэму: «Ператвораная чорная пешка (адна або больш) у любую фігуру абараняецца ад пагрозы белых і стварае слабасці ў сваёй пазіцыі , якімі карыстаюцца белыя пры матаванні».

Прыклад. У. Сычоў (1995 г.).



(10+9).

Рашэнне. 1. Крe7! ~~ 2. Крe6 і 3Ch7x, 1. ...d1Ф 2. Фf2 Ф:d5 (блакіраванне) 3. Ch7x, 1. ... d1К 2. Фh2 К:e3 (блакіраванне) 3. Kf6x, (1. ... bc2 2. Ch7+, 1. ... К:c3 2. Ф:d2).

Задачы на дыяграмах з поўным рашэннем трэба дасылаць да 1 верасня г.г. на адрас рэдакцыі газеты «Звязда». Запрашаем усіх аматараў прыняць удзел у конкурсе складання.

Кірмаш

штотыднёвы рэкламны выпуск № 7 (607)

аддзел рэкламы 287-17-79

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Дом 76 м кв. г/п, сад, гараж, лазня, калодзеж, паравое ацяпленне ў Браслаўскім раёне.
Тэл. 599 61 14.

❒ Кватэра 4-пакаёвая з выгодамі, тэлефонам, побач возера, рака, лес (Глыбоцкі раён).
Тэл. 8 02156 32 953, 8 0293 23 20.

❒ Кватэра 3-пакаёвая, капаратыўная, маецца гараж, агарод, у г. Гарадок Віцебскай вобл., нядорага, крэдыт.
Тэл. 8 0212 48 08 09, 8 029 216 17 09.

❒ Дача ў в. Дзягільна, уч. 5 сотак, домік 14,2 м кв. каля г. Дзяржынска, 12 тыс. у.а.
Тэл. МТС 708 94 92.

❒ Кватэра 2-пакаёвая ў г. Баранавічы.
Тэл. 8 0163 44 75 48.

❒ Кватэра 2-пакаёвая ў г. Кобрыне.
Тэл. 8 029 824 98 24.

❒ «VW-Пасат» 2000 г.в. 1,9ТД, седан, ц/з, сігналізацыя, кандыцыянер, 7,7 тыс. у.а.
Тэл. 8 029 507 88 19.

❒ «Аўдзі А6» 2,5 ТДі універсал, добры стан, 7,25 тыс. у.а.
Тэл. 8 029 114 50 29.

❒ Шыны летнія «Кантыненталь» 205/55/R16 — 4 шт., 200 у.а., стол більярдны б/к у добрым стане — 300 у.а.
Тэл. 8 029 689 05 45.

❒ «Масквіч 2140» на з/ч, дзверы м/пакаёвыя б/у, мяккі вугал у добрым стане, стол пісьмовы цёмны.
Звяртацца: 211875, г. Паставы, вул. Ленінская, 194А/12.

❒ TV «Гарызонт» 51 см, тумба пад TV, машына пральная «Фея», мыйка чугунная.
Тэл. 8 029 159 10 19.

❒ «Аўдзі-80» 1988 г.в., седан, серабрысты металік, 3100 у.а.
Тэл. 8 029 507 88 19.

❒ А/шыны «Матадор» летнія R14 175/65 — 2 шт.
Тэл. 8 029 873 47 07.

❒ «Пежо 806» мінівэн, 1,9 ТДі, добры стан, 5950 у.а.
Тэл. 8 033 634 86 60.

❒ «ВАЗ-2101» 1978 г.в. чырвоны, 250 у.а., торг.
Тэл. 8 02157 3 29 63.

❒ Каляска інвалідная.
Тэл. 8 01777 4 59 23, 8 044 754 06 065.

❒ «Опель-астра» 1994—1995 г.в. 1,6 б, мона, седан, фаркоп, імабілайзер, антыкаразійная аборона.
Тэл. 8 01719 5 72 57, 8 029 934 38 97.

❒ «VW-Гольф» 1997 г.в., 1,6б, добры стан, 4400 у.а., торг.
Тэл. 8 029 343 93 83.

❒ «ВАЗ-2106» 1989 г.в., 500 у.а., бэжавы.
Тэл. 8 01714 5 33 85, пасля 19 гадзін.

❒ «Нісан-Сані» 1990 г.в., 1,7 Д, седан N13.
Тэл. МТС 872 31 37, Velkom 792 68 83.

❒ «Пежо-806» мінівэн, 1,9 ТДі, добры стан, 5950 у.а.
Тэл. 8 029 114 50 29.

❒ Мотаблок МТЗ.
Тэл. 8 029 400 43 16.

❒ Вясельная сукенка, 50—52 памер, бела-ружовая, расшытая стразамі, фата і інш.; упрыгожванне на вясельную машыну.
Тэл. 8 029 558 23 15.

❒ Рэно «Лагуна» 2000 г.в., 1,6 б, зялёны перламутравы, выдатны стан.
Тэл. 8 02155 41 863.

❒ Газавая, эл. пліта шклокерамічная «Гефест», новыя.
Тэл. 8 029 115 56 99, 8 017 295 96 84.

КУПЛЮ

❒ Шыны, камеры задніх колаў Т-25, можна б/к.
Тэл. 8 029 872 67 01.

❒ Мотаблок МТЗ.
Тэл. 8 029 114 50 29.

❒ Дом у любым стане да 60 км ад Мінска ў Магілёўскім напрамку.
Тэл. 8 029 357 64 51.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі: 220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт серыя_____ № _____ Выданы_____

Подпіс_____ Дата_____

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

Полн. наименование:

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 1, г. ВИТЕБСК»

Адрес: г. Витебск, ул. Суворова, 16, 210026, Т/ф. 8 0212 37 21 15
Полное ф.и. о руководителя: Колков Александр Петрович
Полное ф.и.о. гл. бухгалтера: Адеменко Валентина Алексеевна

УНН 300000398

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2009 года

млн. руб.

АКТИВ	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства первоначальная стоимость	101	86 235	103 178
амортизация	102	58 433	63 859
остаточная стоимость	110	27 802	39 319
Нематериальные активы первоначальная стоимость	111	39	54
амортизация	112	20	32
остаточная стоимость	120	19	22
Доходные вложения в материальные ценности первоначальная стоимость	121	856	680
амортизация	122	327	178
остаточная стоимость	130	529	502
Вложения во внеоборотные активы	140	1 935	3 884
в том числе: незавершенное строительство	141	883	2 878
Прочие внеоборотные активы	150		
ИТОГО по разделу I	190	30 285	43 727
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты:	210	7 713	10 248
в том числе: сырье, материалы и другие активы	211	5 428	7 778
животные на выращивании и откорме	212	485	312
незавершенное производство и полуфабрикаты	213	974	1475
расходы на реализацию	214		
готовая продукция и товары для реализации	215		
товары отгруженные	216	357	
выполненные этапы по незавершенным работам	217		
расходы будущих периодов	218	469	683
прочие запасы и затраты	219		
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	960	1 199
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	5 895	4 969
в том числе: покупателей и заказчиков	241	1 352	2 122
поставщиков и подрядчиков	242	3 219	1 199
по налогам и сборам	243	610	1 025
по расчетам с персоналом	244	342	488
разных дебиторов	245	368	132
прочая дебиторская задолженность	249	4	3
Расчеты с учредителями	250		
в том числе: по вкладам в уставный фонд	251		
прочие	252		
Денежные средства	260	1 498	5 268
в том числе на депозитных счетах	261		
Финансовые вложения	270	4	5
Прочие оборотные активы	280		
ИТОГО по разделу II	290	16 070	21 689
БАЛАНС	**300**	**46 355**	**65 416**
ПАССИВ			
III КАПИТАЛ и РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	7 410	9 680
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411		
Резервный фонд	420	657	1 008
в том числе: резервы, созданные в соответствии с законодательством	421	657	1 008
резервы, созданные в соответствии с учредительными документами	422		
Добавочный фонд	430	23 368	32 433
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	440	x	
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	450	2 512	7 743
Целевое финансирование	460	473	530
Доходы будущих периодов	470		
ИТОГО по разделу III	490	34 420	51 394
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	2 214	2 793
Прочие долгосрочные обязательства	520	1 616	1 358
ИТОГО по разделу IV	590	3 830	4 151
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	608	
Кредиторская задолженность	620	7 243	9 374
в том числе: перед поставщиками и подрядчиками	621	2 243	5 712
перед покупателями и заказчиками	622	3 317	1 149
по расчетам с персоналом по оплате труда	623	553	765
по прочим расчетам с персоналом	624	5	5
по налогам и сборам	625	359	655
по социальному страхованию и обеспечению	626	241	313
по лизинговым платежам	627		
перед прочими кредиторами	628	525	775
Задолженность перед учредителями (участниками)	630	247	497
в том числе: по выплате доходов, дивидендов	631	13	19
прочая задолженность	632	234	478
Резервы предстоящих расходов	640	7	
Прочие краткосрочные обязательства	650		
ИТОГО по разделу IV	690	8105	9 871
БАЛАНС	**700**	**46 355**	**65 416**
Долгосрочная кредиторская задолженность	701	434	545
Краткосрочная кредиторская задолженность	702	6 809	8 829

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателя	Код стр.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	181 445	117 756
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	28 415	18 571
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей)	020	153 030	99 185
Из строки 010 сумма государственной помощи на покрытие разницы в ценах и тарифах	021		64
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	141 123	92 758
Валовая прибыль (020-021-030)	040	11 907	6 363
Управленческие расходы	050		
Расходы на реализацию	060		
Прибыль (убыток) от реализации (020-030-040-050)	070	11 907	6 427
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	591	313
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	081	30	56
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	090	561	257
В том числе: проценты к поручению	091	282	
доходы от участия в создании других организаций	092		
доходы от операций с активами	093	279	257
прочие операционные доходы	099		
Операционные расходы	100	109	120
В том числе: проценты к уплате	101		
расходы от операций с активами	102	109	120
прочие операционные расходы	109	3	
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)	120	452	137
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализанионные доходы	130	1 930	849
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	184	98
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131)	140	1 746	751
Внереализационные расходы	150	2 680	537
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	-934	214
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (070+/-120+/-160)	200	11 425	6 778
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	2 329	677
Доходы, не учитываемые при налогообложении	220	1	
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (+/200+210-220)	240	13 753	7 455
Налог на прибыль	250	3 092	1 554
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	758	485
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	67	218
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	300	7 508	4 521

Данные отчетности подтверждены (наименование и номер лицензии аудиторской организации или наименование контролирующего органа, проводившего проверку)

РУП «Служба ведомственного контроля при Министерстве архитектуры и строительства Республики Беларусь» Лицензия № 02200/0416679 от 17.05.2004 г. выдана МФ РБ, срок действия до 16.05.2009 года.

К-во акционеров | Всего | 976 | в том числе | Юридических лиц | 1 | Физических лиц | 975

Информация о дивидендах и акциях

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	Миллионов рублей	497	247
Дивиденды, приходящиеся ни одну акцию (включая налоги)	Рублей	221,76	143,72
Обеспеченность акции имуществом Общества	Тысяч рублей	22,88	19,59
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	Штук	0	0
Информации о задолженности			
Просроченная дебиторская задолженность	Миллионов рублей	0	0
Просроченная кредиторская задолженность	Миллионов рублей	1903	0
Среднесписочная численность работающих (человек)			1052
Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг		Строительство и ремонт автомобильных дорог	

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ Республиканского унитарного предприятия

«Служба ведомственного контроля при Министерстве архитектуры и строительства Республики Беларусь» по бухгалтерской (финансовой) отчетности Открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск» за период с 1 января по 31 декабря 2008 года:

...Бухгалтерская (финансовая) отчетность Открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение на 1 января 2009 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2008 год.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 1, г. ВИТЕБСК»

с 10 мая по 30 июня 2009 года будет производиться выплата дивидендов за 2008 год. Порядок выплаты дивидендов:

- физическим лицам:

а) выплата по отдельным ведомостям одновременно с выплатой заработной платы;

б) почтовым переводом (перечислением на вкладные счета);

- юридическим лицам – путем перечисления на расчетный счет.

Бухгалтерский баланс Закрытого акционерного страхового общества «Бенир» за 2008 год

220004, г. Минск, ул. Раковская, 26-9, тел/факс 306 22 91. УНП 100336711 *Тыс. руб.*

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	**94 810,4**	**Источник собственных средств, всего**	**712 533,0**
Нематериальные активы	**5 774,7**	В том числе: Уставный фонд	**584 257,0**
Финансовые вложения, всего	**157 751,8**	Резервный фонд	**10 182,4**
В том числе:		Добавочный фонд	**64 675,9**
Инвестиции в дочерние общества	–	Фонд накопления	–
Инвестиции в другие организации	–	Фонд потребления	–
Облигации и другие долговые обязательства	**9 971,8**	Целевое финансирование	–
Прочие финансовые вложения	**147 780,0**	Нераспределенная прибыль прошлых лет	**0,5**
Доля перестраховщиков в страховых резервах	–	Нераспределенная прибыль отчетного года	**53 417,2**
		Страховые резервы и фонды, всего	**12 142,4**
Дебиторы, всего	**801,1**	В том числе: Страховые резервы	**8 991,9**
В том числе: Дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	–	Фонд (резерв) предупредительных мероприятий	**3 150,5**
		Гарантийные фонды	–
		Кредиторы, всего	**5 691,6**
Депо премий по рискам, принятым в перестрахование	–	В том числе: Кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	–
Дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	**801,1**	Кредиторская задолженность по операциям перестрахования	–
Прочие активы, всего	**476 056,1**		
В том числе:		Депо премии по рискам переданным в перестрахование	–
Материальные ценности и затраты	**7 764,1**		
Денежные средства	**468 292,0**	Заемные средства	–
Собственные акции (доли)	–	Кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	**5 691,6**
Прочие активы	–		
Непокрытые убытки прошлых лет	–		
Непокрытые убытки отчетного года	–	Прочие пассивы	**4 827,1**
БАЛАНС	**735 194,1**	**БАЛАНС**	**735 194,1**

Отчет о финансовых результатах ЗАСО «Бенир» за 2008 год

Тыс. руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
I. Страхование жизни		
Страховые взносы (премии)	10	–
Страховые выплаты	20	–
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или-)	30	–
Отчисления в гарантийный фонд	40	–
Расходы на ведение дела	41	–
Результат от операций по страхованию жизни (+или-)	50	–
II. Страхование иное, чем страхование жизни:		
Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование	64	**81 973,0**
Изменение резерва незаработанной премии — нетто перестрахование (+или-)	67	**132 696,2**
Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто перестрахование	82	**122 987,7**
Изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+ или -)	92	**14 205,9**
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	–
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	–
Отчисления в фонд предупредительных мероприятий и гарантийные фонды	110	**819,7**
Расходы на ведение дела	120	**41 309,1**
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	–
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	–
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	**63 758,6**
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II		
Операционные доходы	140	**73 387,0**
Операционные расходы	145	**55 442,2**
Внереализационные доходы	150	**5 332,3**
Внереализационные расходы	155	**4 116,0**
Финансовый результат	156	**82 919,7**
Использовано прибыли	157	**29 502,5**
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	**53 417,2**

Директор ЗАСО «Бенир» **Драгун Е.Г.**
Главный бухгалтер **Пальцева М.П.**

Достоверность баланса и отчета о финансовых результатах ЗАСО «Бенир» подтверждена аудитором индивидуальным предпринимателем Волчковой А.К, свидетельство № 0067877 выдано Администрацией Заводского р-на г. Минска от 04.03.2002 г.

Суд Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці просіць грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі аб фактычным месцы знаходжання **ПАДДУБСКАЙ Таццяны Міхайлаўны**, 16.07.1972 года нараджэння, ураджэнкі в. Якуты Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці, якая раней пражывала па адрасе: в. Скірмантава, вул. Мінская, д. 3, кв. 4 Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці, на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы паведаміць іх суду па адрасе: 211200, Віцебская вобласць, г.п. Лёзна, вул. Леніна, дом 100-а.

У суд Брагінскага раёна Гомельскай вобласці паступіла заява аб прызнанні без звестак адсутнай **ПАХМЕСТЭР Надзеі Станіславаўны**, 1966 года нараджэння, ураджэнкі вёскі Белае Балота Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства якой в. Мікулічы Брагінскага раёна Гомельскай вобласці. Усім грамадзянам і юрыдычным асобам, якія маюць звесткі пра Пахместэр Надзею Станіславаўну, просьба паведаміць іх суду Брагінскага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы на адрас: г.п. Брагін, вул. Савецкая, д. 92.

У суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці паступіла заява аб аб'яўленні памерлай **ДУБРОЎСКАЙ Жанны Уладзіміраўны**, 30.08.1971 года нараджэння, ураджэнкі г. Гомель, апошняе вядомае месца жыхарства якой — вул. Савецкая, д. 125а, г. Гомель. Усім грамадзянам і юрыдычным асобам, якія маюць звесткі пра Дуброўскую Жанну Уладзіміраўну, просьба паведаміць іх

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (14 красавіка). Па гарызанталі: Саласпілс. «Анахайм». Аўрал. Клавір. Латвія. Арарат. Анафара. Апока. Калій. Руда. Прыкуп. Цытата. Аправа. Тук. Мак. Самум. «Аўрора». Рак. Лат. Штык. Пано. Скат. Амбра. Рыса. Аган. Дэка. Інтрыга. **Па вертыкалі:** Штамп. Паўлс. Краты. Крамола. Азу. Варатар. Сталявар. Плакат. Ірак. Брак. Ізабара. Рыга. Рол. Траса. Стаер. Ані. Алтай. Сок. Юрмала. Сыта. Твор. Кубатура. Ірад. Туман. Абак. Колюшка.

Архітэктура. Будаўніцтва. Рамонт

Крызіс інвестыцыям не перашкода

Адразу восем аўстрыйскіх фірмаў возьмуць удзел у 10-й міжнароднай спецыялізаванай выставе «Беларускі будаўнічы тыдзень-2009», што адкрываецца сёння ў Мінску.

У іх ліку і кампанія Cincinnati Extrusion з Вены, якая выпускае экструзіцыйныя лініі для вырабу пластыкавых і драўняна-пластыкавых вырабаў. Гэта фірма цікавая тым, што нягледзячы на сусветны эканамічны крызіс інвестуе амаль тры мільёны еўра ў мадэрнізацыю і расшырэнне сваёй вытворчасці, спадзеючыся, што ажыўленне рынку адбудзецца ўжо ў 2010 годзе.

Барыс ЗАЛЕСКІ.

POLSKA/ПОЛЬША Warszawa
Vario Term Sp. z o.o.
www.varioterm.pl
e-mail: biuro@varioterm.pl
Тел.: 8 10 48 22 872 42 14.

Ищем в Беларуси дистрибьюторов и фирмы, готовые к сотрудничеству.

Ілья Міцько дарос да лірыкі, а доктар Сайкоў — да дзеда-Барадзеда

Тусоўка

Беларускія артысты пацвердзілі: песні пра каханне непадуладныя крызісу

Прэзентацыю новага сольнага праекта Ілы Міцько, сумешчаную са святкаваннем 28-годдзя артыста, можна было б па сённяшнім часе назваць «днём нараджэння буржуя», калі б не атмасфера — цёплая, сяброўская, зусім без пафасу, затое з гумарам і жартамі (у тым ліку з сябе саміх). У выніку госці — пераважна папулярныя беларускія артысты — не захапляліся ўласнай «зорнасцю», а на адзін вечар сталі проста добрымі знаёмымі і сябрамі.

Першае, што бачылі ўдзельнікі падзеі — у сталічным клубе «Next» — як віноўнік урачыстасці дае невялічкія інтэрв'ю пра свой новы праект — гурт «Love&Doors», што па-руску сімвалічна гучыць як «Лавандос»:

— Гэта больш дарослая і больш сур'ёзная, а галоўнае — аўтабіяграфічная музыка. Усе песні, запісаныя ў праекце, звязаныя з маімі асабістымі перажываннямі і з канкрэтнымі людзьмі — але, я думаю, падобныя перажыванні блізкія абсалютна ўсім. Калі гэтыя песні знойдуць сваіх слухачоў, будзе вельмі прыемна.

Тое, што «Лавандос» адрозніваецца ад «Лепрыконсаў», было зразумела ўжо звонку. Калі раней мы ўспрымалі Ілью Міцько як разбітнога хлопца ў джынсах «мэйд ін Ждановічы» і ведалі гурт па хітах «Дзяўчаты пакахалі не мяне», «Халі-галі», «Салдаты», то цяпер артыст прадэманстраваў уменне насіць строгі касцюм з гальштукам, а песні прысвячаць не толькі чароўным дзяўчатам, але, напрыклад — маме. Маці Ілы, дарэчы, прысутнічала ў зале і падтрымлівала сына, а той менавіта да яе століка прыносіў усе атрыманыя ахапкі кветак.

Доўга гадаць, калі ўсё нарэшце пачнецца, не выпадала — на танцпляцоўку час ад часу выходзілі дзяўчаты з групы падтрымкі і ўздымалі шыльдачкі з лічбамі — колькасць хвілін да старту: 20, 15, 10...

Тым часам госці ўсё прыбывалі — артысты, тэлевядучыя, бізнэсмены, сябры і калегі — мінскі «Камедзі Клаб», здаецца, ледзьве не ў поўным складзе. Адзін з рэзідэнтаў «Камедзі», Мікалай Драчынскі, рашуча накіраваўся да імянінніка з нейкім доўгім цёмным прадметам, падобным да бервяна з леташняга суботніка. «Драчынскі хоча падарыць Міцько нейкую драбязу, набытую ў аэрапорце Тайланда за тры долары!» — з'едліва каментаваў вядучы. Мікалай у адказ паказаў на пальцах — не тры, а два долары. Насамрэч «бервяно» аказалася футлярам, у якім на шаўковай падкладцы ляжаў... самурайскі меч. Дакладней, два.

— Лічыцца, што сапраўдны воін абавязкова павінен мець такія мячы, — патлумачыў выбар падарунка рэзідэнт «Камедзі Клаб». — А Ілья ў нас сапраўдны воін беларускага шоу-бізу, так што яму спатрэбяцца.

— А як жа забарона на захоўванне халоднай зброі? — не вытрымалі мы.

— Яму — можна, яму ўсё можна, — адмахнуўся Драчынскі.

Ларыса Грыбалёва, наадварот, зрабіла сябру цалкам мірны, нават хатні падарунак — нейкую забаўную хатнюю расліну. Аляксандр Саладуха вылучыўся асабліва — падарыў свой новы дыск. А вось Яўген Чалышаў з гурта «Харлі» знайшоў іншы падыход. Напачатку нагадаем — менавіта яго голас чутны на бэк-вакале самай першай песні праекта «Лавандос» — кампазіцыі «Маё каханне». Вырашыўшы, што працяг павінен быць не менш удалы, чым старт, Яўген прынёс падарунак з намёкам. «Пакуль у гурта «Лавандос» яшчэ няма музычных узнагарод, прэмій...

Трэба з чагосьці пачынаць!» — з гэтымі словамі ён уручыў Ілы Міцько мініяцюрны грамафон, здалёк вельмі падобны да сімвала вядомай прэміі.

Аднак і сам Ілья знайшоў, чым здзівіць публіку. Найперш тым, што павітаўся па-беларуску: «Шаноўнае спадарства, вельмі прыемна вас тут вітаць!». Потым — тым, што адыграў няхай і невялікі, але паўнацэнны жывы канцэрт з новым праектам, паралельна пазнаёміўшы слухачоў з музыкантамі і саліскам «Лавандос» Крысцінай. Сярод удзельнікаў праекта, па рашэнні яго стваральніка, няма нікога з «Лепрыконсаў». Але музыканты ў гэты вечар усё ж выйшлі на сцэну і гралі ўсімі любімыя хіты — толькі выконваў іх не Міцько, а яго сябры-артысты. Прычым, калі некаторыя, як Дзмітрый Врангель, выходзілі з паперкай і падглядвалі ў тэкст, то абсалютная большасць, пэўна, ведала песні «Лепрыконсаў» на памяць. Атрымалася забаўна і досыць нечакана. «Хто я, Дзед-Барадзед», — цягнуў прыемным барытонам доктар Сайкоў, якому пасля ўдзелу ў тэлепраекце «Дзве зоркі», відаць, канчаткова наканавана стаць свецкім персанажам. (Дарэчы, былая тэлевядучая Элеанора Язерская не хавае, што з часу шоу «Дзве зоркі» таксама не супраць яшчэ раз што-небудзь выканаць у дуэце з Міцько — але на гэты раз ёй давялося абмежавацца роляй удзячнай слухачкі). Аляксандр Саладуха са спецыяльна запрошаным гарманістам спяваў пра тое, што «дзяўчаты пакахалі не яго». Гурт «Тяни-Толкай» падрыхтаваўся да выступлення яшчэ больш адказна — на песню «Салдаты» выканаўцы выскачылі на сцэну ў камуфляжы, і хоць насамрэч ніхто з хлопцаў не служыў, салдацкая форма на іх сядзела як родная.

Безумоўна, самым дарагім падарункам, які атрымаў у гэты вечар Ілья Міцько, стала ўласна вечарынка — яе арганізацыю ўзялі на сябе прадзюсар гурта «Топлес» Максім Алейнікаў і дырэктар гурта Вераніка Каляга. «Але гэта яшчэ не ўсё, — з выглядам змоўшчыка шапнуў мне на вуха Максім. — Дзяўчаты таксама будуць спяваць песню «Лепрыконсаў», «Халі-галі». Праўда, там крыху не іхняя танальнасць, але мы прыдумалі, як выкруціцца». У выніку песню выконвалі супольна: куплеты спяваў саліст гурта «Дразды» Віталь Карпнаў, а прыпевы — дзяўчаты з «Топлес»... Свае музычныя падарункі зрабілі імянінніку таксама Дзядзя Ваня, Аляксей Хлястоў і Ларыса Грыбалёва. Іншыя выканаўцы, каму песень не хапіла, з радасцю падтрымлівалі калег — на танцпляцоўцы.

— Ці любіце вы «Лавандос»? — у нейкі момант спытаўся вядучы ў публікі.

— Хто ж яго не любіць, — заўсміхаліся навокал. І было ўжо незразумела, маюцца на ўвазе банальна грашовыя знакі ці ўсё ж новы музычны праект. Сышліся ўсе ў адным — гэты настрой, гэта музыка і гэта свята былі як ніколі да месца.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота аўтара.



СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.55	20.22	14.27
Віцебск —	5.42	20.16	14.34
Магілёў —	5.45	20.13	14.28
Гомель —	5.46	20.05	14.19
Брэст —	6.11	20.37	14.26
Гродна —	6.15	20.33	14.18

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Радзівона.*
К. *Анзельма, Конрада, Фелікса, Яраслава.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

21 красавіка

1441 год — горад Слуцк атрымаў грамату на магдэбургскае права. У канцы XV стагоддзя з'яўляўся адным з найбуйнейшых гарадоў Беларусі, тут была шырока развіта суконная мануфактура, а таксама Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў. Слуцкія купцы гандлявалі ў гарадах Беларусі, Украіны, Польшчы, прадавалі свае тавары ў Маскве і Смаленску.

1917 год — Петраградскі камітэт РСДРП (б) адхіліў так званыя Красавіцкія тэзісы Леніна — асноўныя палажэнні тактыкі бальшавіцкай партыі ва ўмовах буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі — антываенная барацьба, адмова ад падтрымкі Часовага ўрада і перадача ўлады Саветам, перарастанне буржуазнай рэвалюцыі ў пралетарскую і інш.

Цытата дня:

«У перамозе тысяча бацькоў, а паражэнне заўсёды сірата».

Джон Ф. Кенэдзі (1917—1963), амерыканскі дзяржаўны дзеяч.

ВЕЛІКОДНЫ ТЫДЗЕНЬ

Працягваецца вялікае свята. Увесь тыдзень у нашых продкаў велікодны стол заставаўся поўным, накрытым, гаспадары часталі ўсіх, хто прыходзіў у хату. Асабліва павагай карысталіся хворыя, немачныя і бяздольныя.

● Кожную раніцу велікоднага тыдня трэба было есці толькі свянцонае, «пасля снедання ці абеду свянцонай ежы нельга каштаваць — грэх».

● Асабліва забаранялася любая фізічная работа на гэтым тыдні: нельга было ткаць, вязаць, кранаць зямлю, працаваць з гноем і г.д.

● Каб не пакутаваць у спякотнае надвор'е, на гэтым тыдні нельга піць шмат вады.

● Паводле меркаванняў старых людзей, агарод ці пасевы, якія капалі ці засявалі ў велікодны тыдзень, ніколі не бываюць «добрымі», таму лепш нічога і не рабіць у гэты час.

Серада на велікодным тыдні названа Сухой, ці Градавой серадой: «няможна парушаць зямлю ў сераду пасля Вялікадня і пасля Сёмухі, бо град збожжа выб'е». Такія серады называюць «градовымі».

● З гэтага часу ў вёсках пачынаюцца першыя веснавыя карагоды і гульні, якія заканчваюцца на Фамін тыдзень, а затым наступае так званая «красная горка» — час вяселляў і першага веснавога гуляння на адкрытым паветры.

● У гэты дзень не працавалі. Абыходзілі пасевы з грамнічнай свечкай. Лічылася, што такія дзеянні будуць ахоўваць палі і агароды ашчадных гаспадароў ад граду ў летні час.

● Таксама лічылася, што ў таго, «хто будзе пасціцца ў сераду Святога тыдня, палі град не панішчыць».

● У сераду катэгарычна забаранялася кранаць зерне, падрыхтаванае для веснавога севу.

Чацвер на Велікодным тыдні, першы пасля Вялікадня, атрымаў назву Наўскага Вялікадня, Вялікадня мёртвых, Наўскай Пасхі, Наўскага чацвярга, Наўскага скрысення, Бабскага Вялікадня.

● Менавіта ў гэты дзень у некаторых рэгіёнах Беларусі ўшаноўвалі памерлых продкаў. Рыхтавалі рытуальную ежу, фарбавалі яйкі і ішлі на могілкі, каб прыбрацца там, навесці парадак. Каля ўваходу на могілкі абавязкова казалі велікоднае прывітанне: «Хрыстос уваскрос!», затым на магіле сваякоў маліліся, пакідалі яйкі і іншыя пачастункі, раздавалі міласціну жабракам.

● У некаторых раёнах у гэты дзень варылі столькі белых яек, колькі ў сям'і памерла дзяцей. З'есці яйкі трэба было на адкрытым месцы, «пакачаўшы па траве», каб дзеці з нябёсаў бачылі і бласлаўлялі сям'ю, якая не забыла іх.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

— Дарагая, ты выклікала сантэхніка?
— Так!
— А прыйшоў мастак!
— Ну, хай унітаз размалюе!

☺

Апошняе слова ў спрэчцы з жанчынай можа сказаць толькі рэха.

☺

У эстонскім ліфце:
— Вам на які паверх?
— На 9-ы.
— Бялізну браць будзеце?

☺

Хатні тэлефон патрэбен хоць бы для таго, каб можна было знайсці мабільны...



Бяседныя песні

Дні прыгожыя

Песні Уладзіміра Будніка, якому 28 красавіка споўнілася б 60 гадоў, шырока разляцеліся па беларускай зямлі, сягнулі за яе межы. Вакальныя ансамблі «Сябры» і «Чараўніцы», спевакі Віктар Вуячыч, Тамара Раеўская, Яраслаў Еўдакімаў, Надзея Мікуліч і многія іншыя ўключылі іх у свой рэпертуар. Пастаянна гучаць на эстрадзе, у радыё- і тэлеэфіры вакальныя творы «Пах чабаровы», «Клёны ясені», «Водар чаромхі», «Палессе», «Шумі, мой лес, шумі», «На мяжы расстанняў і сустрэч», «Я зачараваная табой» і іншыя.

І за бяседным сталом прачула спяваюцца песні Уладзіміра Будніка. А песня «Дні прыгожыя», напісаная сумесна з Уладзімірам Карызнам, яшчэ раз нагадвае, што жыццё прыгожае, стваральнае тады, калі душа напоўнена светлымі, пякельна прыемнымі пачуццямі кахання.

Верш Уладзіміра Карызны
Музыка Уладзіміра Будніка

Як цяжка нам сказаць
упершыню «люблю»,
Нібыта пакідаць збіраешся зямлю
І ветры ўздымуцца,
адкуль — і сам не знаеш,
Ты задыхаешся
і ўжо іскрынкай таеш.
І хмары паплылі,
і зорак не відаць...
І што тады рабіць,
і што тады сказаць.

Прыпеў:
А дні прыгожыя
нам зоркай яснай свецяць,
І шчаслівейшы ты
на ўсім бялюткім свеце.
У яркай вышыні
вачам прыемна сінь,
А ў сэрцы халадком
гарачая вышынь.
Як цяжка ўпершыню
парой неспадзяванай
На самай вышыні
«бывай» сказаць каханню,
Спусціцца на зямлю,
пакінуць зорны воз,
Зноў піць настой крыніц
і гаркаватых лоз.
Надзеяцца, чакаць
вясновых светлых дзён,
З усмешкай уздыхаць
пад жоўтых лісцяў звон.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

КЛЁВА!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАМЁТ — «ХАТКА» РЫБАЛОВА

Намёт, як і мноства іншых рэчаў, — не проста неабходны прадмет на рыбалцы, а, па сутнасці, замяняе нам на некалькі дзён дом, у якім мы жывём. І самае галоўнае — там мы спім, а гэта ўжо патрабуе наяўнасці некаторых якасцяў, якія дазволяць забяспечыць найбольшы камфорт пры занятку любімай справай.

У гэтым артыкуле я не буду разглядаць усе віды намётаў і патрабаванні да іх, бо для турыстаў падыходзяць адны намёты, для альпіністаў іншыя і г.д. Спынюся толькі на намётах, найбольш зручных для выезду на рыбалку.

Для намётаў існуе шэраг супярэчлівых патрабаванняў, напрыклад намёт павінен быць ветраўстойлівы, што забяспечваецца наяўнасцю вялікай колькасці алюмініевых дуг, але гэта ў сваю чаргу зробіць вашу часовую «хатку» цяжкай, што вельмі непажадана для любога віду намётаў. Зыходзячы з гэтага, я паспрабую вылучыць галоўныя параметры намёта і яго асноўныя характарыстыкі, бо тая ж ветраўстойлівасць не вельмі і патрэбная на рыбалцы — складана ўявіць чалавека, які паедзе рыбаліць у шторм.

Такім чынам, асноўныя характарыстыкі і патрабаванні да элементаў намёта:

1. Прасторны. Мінулі тыя часы, калі мы жылі ў 2-месным намёце ўпяцёх і спалі на баку, перашкаджаючы адзін аднаму. Мой намёт мае памеры 205х205х125 (3+1 месцы), гэтага цалкам дастаткова для камфортнага пражывання 3-4 чалавекам сярэдняй камплекцыі.

2. Лёгкі. Не больш за 2—2,5 кг, лодку і сябе не варта перагружаць.

3. Воданепранікальны. Не меней за 2000 мм воднага слупа, але і не больш за 4000 мм (не варта плаціць лішнія грошы). Такі намёт практычна непрамакальны і здольны вытрымаць нават зацяжны моцны дождж.

4. Каркас. Павінен быць у выглядзе трубчастых секцый дыяметрам 8,5 мм са шклапластыку. Ён не самы ветраўстойлівы, але ён мала важыць, а для рыбалова гэта больш актуальна.

5. Дно. Павінна быць са шматслаёвага ламінаванага поліпрапілену з борцікамі не меней за 10 сантыметраў — у выпадку, калі вы патрапіце пад моцны дождж, такое дно засцеражэ ад пранікнення вільгаці.

Ёсць яшчэ шэраг драбнейшых параметраў, але я іх аднашу да катэгорыі асабістага выбару кожнага. Да гэтых параметраў можна аднесці колер (больш арганічна ў прыродзе глядзіцца зялёны, камуфляжны колер, але яркі прасцей убачыць здалёк і ў змярканні). У мяне, напрыклад, намёт чорны. Форма намёта таксама справа густу, я абраў класічную сёння паўсферу з дзвюма шклапластыкавымі дугамі крыж-накрыж — асноўны каркас, плюс дуга для тамбура і абцягнутая воданепранікальным тэнтам. Наяўнасць мноства кішэняў таксама на ваш выбар, у мяне каля пяці.

Парады па выбары і набыцці

1. Купляйце намёт толькі ў спецыялізаваных турыстычных крамах. Там вы атрымаеце кансультацыю, зможаце падабраць патрэбны вам варыянт і атрымаеце гарантыю.

2. Правярайце швы — яны павінны быць праклееныя. У больш дарагіх мадэлях швы праварваюцца.

3. Па магчымасці, калі месца ў краме дазваляе, раскладзіце намёт, каб потым не было праблем са зборкай, ды і ў адсутнасці браку таксама пераканаецеся.

4. Чым лягчэйшы намёт, тым, натуральна, танчэйшы матэрыял, а значыць, ён хутчэй зносіцца.

Майстэрня БАМБЕТА

(Асноўныя прынцыпы лоўлі на паплавок, які пагружаецца ў ваду)

Функцыянальна паплавок, які пагружаецца ў ваду, нагадвае грузіла, але гэта не зусім так. Ён дазваляе рабіць мноства рэчаў падчас рыбнай лоўлі. Таму паплавок хутка заняў сваё месца ў скрынках рыбаловаў Еўропы.

Усе паплаўкі, якія пагружаюцца ў ваду, зробленыя абсалютна аднолькава: патоўшчаны корпус, зверху размешчаная пустацелая антэнная частка, у сярэдзіне якой слізгае лёска. Гэтыя паплаўкі выкананыя з пластмасы або з іншага сінтэтычнага матэрыялу і могуць быць уцяжараныя металічнай пласцінкай.

Самая першая роля такога паплаўка — быць грузілам. Такі паплавок дазваляе закідваць прынаду на вельмі вялікую адлегласць. Прычым прынада можа быць вельмі лёгкая, як, напрыклад, кручок з апарышам або твісцерам. І што характэрна — не трэба перагружаць лёску свінцом. Вартасць такога паплаўка адразу ж бачная, калі рыбу ловяць на шырокай акваторыі.

Але паплавок выконвае не толькі ролю грузіла. Існуе, у асноўным, тры велічыні шчыльнасці матэрыялу, з якога зробленыя паплаўкі. Шчыльнасць матэрыялу рэгулюе апусканне паплаўка ў вадзе па вертыкалі. Якой бы ні была іх вага, паплаўкі з нямалым матэрыялу застаюцца на паверхні вады, паплаўкі з больш шчыльнага матэрыялу займаюць прамежкавае становішча ў таўшчыні вады, і нарэшце, паплаўкі з самога шчыльнага матэрыялу перамяшчаюцца непасрэдна каля дна.

Паплавок, які плавае, са шчыльнасцю, меншай за шчыльнасць вады, выконвае амаль такую ж ролю, што і сістэма «Бульда» (Buldo). У горных азёрах, напрыклад, стронга без боязі харчуецца насякомымі, якія плаваюць па паверхні, на адлегласці, як правіла, 40 метраў ад берага. Такі паплавок без праблем дазваляе дасягнуць гэтай далечыні закіду. Пры гэтым на кручку можа быць як натуральная прынада, так і штучная блешня або што-небудзь іншае. Сапраўды, падоўжаная форма паплаўка вельмі добрая з пункту гледжання гідрадынамікі. Яна дазваляе падцягваць аснастку ў вадзе павольна і плаўна, не ствараючы нават найменшага завіхрэння ў вадзе, у адрозненне ад сістэмы «Бульда».

Пры лоўлі драпежнай рыбы на паверхні паплавок таксама знаходзіць сваё выкарыстанне. Вам дастаткова зрабіць павадок даўжынёй адзін метр, насадзіць маленькага жыўца або мёртвую рыбку, і поспех гарантаваны!

Гэты паплавок лёгка здымаць і хутка замяняць на іншы. Шарнірнае мацаванне ў значнай ступені прадухіляе зачэпы паплаўка за водныя расліны. Адсутнасць грузіла на лёсцы дае магчымасць прынадзе вольна плаваць у тоўшчы вады. Усталяванне грузіла ў ніжняй частцы корпуса робіць паплавок устойлівым да ўздзеяння ветру і хвалі.

УНІВЕРСАЛЬНЫ ПАПЛАВОК

Паплавок просты ў прыгатаванні — яго можна сабраць без склейвання.

Разбіраем і прамываем стрыжань ад шакавай ручкі «Віс», шарык выкідваем. Робім кантрольны паплавок з пенапласту, у якім пратыкаем шылам і цвіком адтуліну па дыяметры стрыжня, апрацоўваем і фарбуем яго. Выразаем з дрэва два коркі і закрываем імі адтуліны стрыжня.

Дрот з нержавеючай сталі дыяметрам 0,2—0,3 міліметра накручваем на цыліндр дыяметр 1—1,2 міліметра і атрымліваем кольца з двух віткоў дроту з вусікамі даўжынёй 30—35 міліметраў. З пенапласту выразаем тры асноўныя паплаўкі. Шылам і цвіком пратыкаем у іх скразныя адтуліны, фарбуем у чорны колер, які зліваецца з вадой і не перашкаджае сачыць за працай снасці.

Збіраем паплавок наступным чынам. Злучаем дэталі 4 і 5, пропускаем праз адтуліны ў гэтых дэталях вусікі драцянога кольца, адгінаем іх на бок. Устаўляем стрыжань (ён павінен уваходзіць шчыльна), вусікі абразаем, рэшткі іх прыгінаем да дэталі 2. Апранаем асноўныя і кантрольныя паплаўкі.

Стопарныя вузлы на лёсцы для фіксацыі робім вышэй і ніжэй за паплавок. Можна выкарыстоўваць паплавок і без тых дэталяў, якія называюцца асноўнымі паплаўкамі.



1 — кантрольны пенапластавы паплавок, 2 — драўляныя коркі, 3 — стрыжань шарыкавай ручкі, 4, 5 — дэталі стрыжня, 6 — кольца з вусікамі, 7 — асноўныя паплаўкі.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.444 Індэкс 63850. Зак. № 2126. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12